WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ЖНІЎНЯ 2011 г.
АЎТОРАК
№ 159
(27023)

Кошт 750 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

СУСТРЭЧА АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ І ДЗМІТРЫЯ МЯДЗВЕДЗЕВА ПРАХОДЗІЦЬ У СОЧЫ

Фота БЕЛТА.

У горадзе Сочы праходзіць сустрэча Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Мядзведзева.

Кіраўнікі дзяржаў маюць намер абмеркаваць увесь комплекс двухбаковых беларуска-расійскіх адносін, актуальныя пытанні міжнароднага парадку дня, тэму інтэграцыйнага будаўніцтва на постсавецкай прасторы, у прыватнасці, развіцця супрацоўніцтва ў рамках Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ТЫДЗЕНЬ АКТЫЎНАГА СОНЦА, А Ў СУБОТУ ПРЫПЯЧЭ ДА 32

На гэтым тыдні холад адпусціць і ў Беларусь вернецца цяпло, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.

Аднак яшчэ ў аўторак атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы прынясе ў паўночна-ўсходнія рэгіёны Беларусі кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — навальніцы. Тэмпература ўдзень 19—25 градусаў.

Пачынаючы з серады да нас завітае сур'ёзны антыцыклон, які будзе рухацца з боку Латвіі далей на цэнтральныя раёны еўрапейскай Расіі. Ціск павялічыцца, і ўсталюецца малавоблачнае без ападкаў надвор'е. Толькі ў сераду ў паўночна-ўсходніх раёнах прагназуюцца невялікія кароткачасовыя дажджы. Уначы на сераду чакаецца 9—15, удзень 20—26, у Брэсцкай вобласці — да плюс 28 градусаў. У чацвер яшчэ пацяплее. Уначы — 9—16, удзень 21—27, у Брэсцкай вобласці да 30 цяпла. У пятніцу і суботу захаваецца сонечнае надвор'е. Больш за тое, з боку Міжземнамор'я да нас прыйдзе чарговая порцыя цяпла, будзе без ападкаў. У гэтыя дні раніцай месцамі туман. Тэмпература ўначы ў пятніцу 9—16, удзень 22—28 градусаў, на захадзе краіны стане 29—31 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў, самым цёплым днём тыдня стане субота. Нават уначы чакаецца плюс 12—19, а ўдзень прыпячэ да 25—32 градусаў. Вольга Фядотава адзначыла, што такі тэмпературны фон прыкладна на 2—5 градусаў вышэй за кліматычную норму.

Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі, толькі ў нядзелю да нас зноў завітае чарговы атмасферны фронт, які прынясе навальнічныя дажджы ў паўночны захад Беларусі. Тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад 23 цяпла на паўночным захадзе да 31 градуса на поўдні краіны. Мабыць, гэта і будзе апошні акорд цёплага лета...

Сяргей КУРКАЧ.

УБОРКА КАЛАСАВЫХ У БЕЛАРУСІ ВЫЙШЛА НА ФІНІШНУЮ ПРАМУЮ

Збожжавыя і зернебабовыя культуры на раніцу 22 жніўня ўбраны на плошчы 2 млн 130,1 тыс.га, што складае 94 працэнты засеяных плошчаў, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання.

Свае карэктывы ў тэмпы ўборкі ўнеслі дажджы, якія прайшлі ў выхадныя дні. Калі б не ападкі, то ў многіх раёнах уборка каласавых была б ужо завершана. У Брэсцкай вобласці ўбрана 98,5 працэнта каласавых, у Гродзенскай — 96,9 працэнта, у Магілёўскай — 96 працэнтаў, у Мінскай — 94 працэнты, Гомельскай — 93 працэнты, у Віцебскай — 87,7 працэнта. Валавы збор збожжа ў цэлым па рэспубліцы склаў 7 млн 393,5 тыс.т. Самы важкі ўклад унеслі гаспадаркі Мінскай вобласці, на рахунку якіх 1 млн 900,6 тыс.т збожжа. Сельгасарганізацыі Гродзенскай вобласці сабралі 1 млн 375,6 тыс.т збожжа, гаспадаркі Віцебскай вобласці — 1 млн 179,7 тыс.т, Магілёўскай — 1 млн 72,2 тыс.т. Брэсцкая вобласць таксама стала мільянерам, на рахунку яе арганізацый 1 млн 28,7 тыс.т збожжа. У Гомельскай вобласці сабрана 836,7 тыс.т. Усе вобласці, за выключэннем Брэсцкай, перасягнулі мінулагодні аб'ём вытворчасці збожжа. Сярэдняя ўраджайнасць па рэспубліцы склала 34,7 ц/га, што на 5 ц/га вышэй, чым у 2010 годзе.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ПАЎСТАНЦЫ ЗАХАПІЛІ ТРЫПАЛІ

Лівійскія паўстанцы з учарашняга дня кантралююць амаль усю сталіцу краіны, Трыпалі, за выключэннем урадавага квартала Баб аль-Азізія. Учора пасля абеду сутыкненні ў горадзе ўжо спыніліся, бо большасць абаронцаў лівійскай сталіцы склала сваю зброю.

Камандуючы падраздзяленнямі па абароне Трыпалі сам адкрыў паўстанцам усе дарогі і загадаў не аказваць супраціўлення. Вядома пра 100 затрыманых байцоў «батальёнаў Кадафі». Кіраўнік Нацыянальнай пераходнай рады Мустафа Абдэль Джаліль абвясціў пра захоп сына Кадафі Сейф аль-Ісламa. Пазней паўстанцы паведамілі, што ў палон здаўся другі сын Муамара Кадафі — Махамед. Афіцыйны прадстаўнік урада Лівіі Муса Ібрагім паведаміў, што ў выніку баёў за Трыпалі за апошнія 12 гадзін загінула больш за 1,3 тысячы чалавек. Паводле яго слоў, вялікая частка людзей загінула ад бамбардзіроўкі самалётаў НАТА, якія прыкрывалі наступленне паўстанцаў на Трыпалі. Ібрагім заявіў, што Кадафі гатовы ўступіць у прамыя перамовы з кіраўніком створанай паўстанцамі Пераходнай нацыянальнай рады Лівіі Джалілем. Джаліль, са свайго боку, заявіў, што апазіцыя спыніць наступленне, калі Кадафі абвесціць пра сваю адстаўку.

У ГЕРМАНІІ СВЯТА ПЕРАРАСЛО Ў БЕСПАРАДКІ

У Германіі штогадовае вулічнае свята Schanzenfest, якое праходзіла ў Гамбургу, скончылася масавымі беспарадкамі. У ноч на 21 жніўня радыкальна настроеная моладзь учыніла пагромы і падпалы пасля закрыцця фэсту.

Паводле звестак паліцыі, пагромшчыкі разбілі вокны ў будынку банка, размешчанага побач з клубам Rote Flora ў цэнтры Гамбурга, дзе збіраюцца радыкалы. Таксама яны запускалі на вуліцах феерверкі і палілі смецце. Пагромшчыкі пашкодзілі чатыры паліцэйскія машыны і лёгка параніліся двух паліцэйскіх. Было затрымана 40 чалавек, 10 з іх арыштаваныя.

КАРАЛЯ НЕ ПУСЦІЛІ Ў РЭСТАРАН

Караля Швецыі Карла XVI Густава з жонкай Сільвіяй не пусцілі ў нямецкі рэстаран у мястэчку Ладэнбург, бо гаспадыня ўстановы не прызнала ў пары прадстаўнікоў «блакітнай крыві».

Уладальніца ўстановы «Залатая зорка» Надзін Шэленберг растлумачыла газетчыкам, што ў той дзень у рэстаране святкавалі вяселле і вольных месцаў не было. «Я не пазнала іх. Я маю на ўвазе без кароны і скіпетра», — сказала Шэленберг, якая таксама растлумачыла сваю некампетэнтнасць празмернай занятасцю. У выніку манарху з жонкай, якая, дарэчы, з'яўляецца грамадзянкай Германіі, давялося есці піцу на плошчы.

ПАЦЕЮЧЫ ПАДЧАС ТРЭНІРОЎКІ, НЕ ЎДАСЦА АТРЫМАЦЬ ІДЭАЛЬНУЮ ПОСТАЦЬ

Нярэдка можна пачуць: каб схуднець, неабходна пацець. Паводле слоў спецыялістаў, гэта не так. Пот — частка сістэмы астуджэння арганізма. Ён выдзяляецца, каб прадухіліць перагрэў цела. Таму, чым больш вы пацееце, тым больш губляеце вадкасці, але тлушч не сыходзіць.

Трэніроўкі не могуць гарантаваць вам, у якім менавіта месцы сыдзе тлушч. Паводле слоў эксперта Саймана Руза, на ўсім целе ёсць праслойка тлушчу. Можна натрэніраваць мышцы пад тлушчавай тканкай. Аднак розніца стане прыкметная, калі чалавека страціць значную частку ўсяго пласта тлушчу.

«ПУЗ-ПАРАД»: цяжарнасць у радасць!

Галоўнымі гераінямі гэтага сямейнага свята, што адбылося 21 жніўня ў Сілічах, сталі больш за сорак будучых мам.

СТАР. 8

ХАБАР ЗА... СПІСАНЫЯ ХАЛАДЗІЛЬНІКІ

Кіраўнік расійскай камерцыйнай фірмы прапаноўваў адказнай асобе ААТ «Нафтан» хабар, каб можна было купіць без тэндара па заніжанай цане спісанае халадзільнае абсталяванне, у начынцы якога ёсць медныя сплавы.

Бізнэсмен з горада Шахты Растоўскай вобласці шукаў каляровы метал, каб потым яго перапрадаць. У пошуках жаданага прыехаў у Беларусь. Чуў, што ёсць у Наваполацку такое вядомае прадпрыемства — «Нафтан», дзе ў ліку іншага шмат спісанага абсталявання. Прадпрымальнік, так бы мовіць, паспрабаваў «вырашыць арганізацыйнае пытанне», калі прыйшоў на прыём у кабінет да начальніка аднаго з упраўленняў згаданага прадпрыемства. І адкрыта стаў прапаноўваць хабар расійскімі рублямі — у эквіваленце 10 тысяч долараў — за кожнае спісанае халадзільнае абсталяванне. А ўсяго, як яму стала вядома, было на прадпрыемстве чатыры адзінкі абсталявання.

Беларускі начальнік праінфармаваў супрацоўнікаў Камітэта дзяржаўнай бяспекі пра нечаканую прапанову абагаціцца. І потым сітуацыю кантралявалі «чэкісты». Пад іх кантролем расіянін і перадаў расійскія рублі — у эквіваленце ўжо 20 тысяч долараў за, на яго погляд, удалую здзелку. І нават не спужаўся, калі начальнік упраўлення прадпрыемства «Нафтан» папярэдзіў, што ў Беларусі за такое могуць і пасадзіць. Прыезджы адрэагаваў на гэта, дарэчы, «нестандартна». Маўляў, у нас, у Расіі, гэта, наадварот, лічыцца нармальным, усе так робяць.

Як паведаміў «Звяздзе» **Уладзімір БЕЛАВУС, старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці**, судом горада Наваполацка расійскі бізнэсмен быў прыгавораны да двух гадоў пазбаўлення волі. Але пасля касацыі, улічваючы прызнанне асуджаным сваёй віны, стан яго здароўя і іншыя акалічнасці, пазбаўленне волі замянілі на даволі буйны штраф — 35 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«ХАРЛАМАЎ У БАБРУЙСКУ!»

Кінастудыя Мікіты Міхалкова будзе здымаць у «Бабруйск-Арэне»

Студыя «Трыта» арандавала Бабруйскі лядовы палац. Некалькі дзён там будуць здымацца сцэны для фільма пра легендарнага расійскага хакеіста Валерыя Харламава.

Чакаецца, што на лядовай пляцоўцы адновяць матч СССР—Швецыя зімовай Алімпіяды 1972 года ў Японіі. Месца выбрана невыпадкова: гаворыць, што «Бабруйск-Арэна» падобная на лядовыя стадыёны японскага ўзору тых часоў. У Бабруйск, такім чынам, павінны прыехаць выканаўцы галоўных роляў: самога Харламава іграе Даніла Казлоўскі, а трэнера савецкай зборнай Анатоля Тарасава — Алег Меншыкаў. Усе шанцы трапіць у масоўку маюць удзельнікі бабруйскага аматарскага хакейнага клуба.

Ілона ІВАНОВА.

У Мінску натуральны прырост насельніцтва за першае паўгоддзе 2011 года склаў 558 чалавек

Колькасць жыхароў Мінска цяпер складае 1 млн 868 тыс. чалавек, у параўнанні з пачаткам года яна павялічылася на 3,9 тыс. чалавек. У сталіцы нарадзіліся 9732 дзіцяці. Памерлі 9174 чалавекі. За студзень—чэрвень зарэгістравана 6338 шлюбаў, скасавана 3760. Колькасць шлюбаў выраслa на 1,4%, а колькасць разводаў зменшылася на 0,5%.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, *«Мінск—Навіны».*

СТАЛІЧНЫЯ ЎЛАДЫ СФАРМІРУЮЦЬ ГРАФІК ПАСТАВАК МЯСА Ў ГАНДАЛЬ ДА КАНЦА ГОДА

Адпаведнае даручэнне зрабіў старшыня гарадскога выканаўчага камітэта Мікалай Ладуцька.

Паводле слоў начальніка ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Андрэя Новікава, у мінулую пятніцу ў гарадскім выканаўчым камітэце прайшла пашыраная нарада наконт арганізацыі паставак мяса ў сталіцу. Вызначаны аб'ёмы і кірункі паставак. Мяса будзе пастаўляцца на халадакамбінаты, спецспажыўцам (гэта камбінаты грамадскага харчавання, якія абслугоўваюць школы, дзіцячыя сады, бальніцы і іншыя сацыяльна значныя аб'екты), у стабілізацыйныя фонды для забеспячэння насельніцтва ў міжсезонны перыяд, а таксама буйным гандлёвым сеткам — па прамых дагаворах. Прапарцыянальныя аб'ёмы паставак будуць замацаваныя за кожнай вобласцю адпаведнымі графікамі, якія зацвердзіць Мінгарвыканкам сумесна з Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчавання.

Святлана ФРАЛЯНКОВА, *«Мінск—Навіны».*

«БЕЛНАФТАХІМ» ПАВЫСІЎ ЦЭНЫ НА НАФТАПРАДУКТЫ

Канцэрн «Белнафтахім» зацвердзіў новыя адпускныя і рознічныя цэны на асобныя віды нафтапрадуктаў, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе канцэрна.

Рознічныя цэны на нафтапрадукты, што рэалізуюцца праз АЗС, павялічыліся на 3 працэнты і з 20 жніўня складаюць за 1 літр: бензін Нармаль-80 — Br4240, бензін AI-92 — Br4460, бензін AI-95 — Br4800, дызельнае паліва — Br4720. У канцэрне растлумачылі, што перагляд цэн на нафтапрадукты праведзены ў мэтах паэтапнага выраўноўвання цэн на тавары ў краінах Мытнага саюза. Дзеючыя рознічныя цэны (з улікам павелічэння) на аўтабензіны AI-92 і AI-95 застаюцца ніжэйшыя за ўзровень аналагічных цэн у Расіі на 3 працэнты.

БЕЛАРУСЫ КУПЛЯЮЦЬ ЗОЛАТА

За 7 месяцаў 2011 года насельніцтвам і прадпрыемствамі набыты 1 тона 33 кілаграмы золата ў мерных злітках, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Нацыянальнага банка.

Гэта прыкладна ў 2 разы больш за аналагічны перыяд мінулага года, калі куплена было 510 кілаграмаў. Усяго прадалі 26211 зліткаў. Самыя папулярныя — дзесяціграмовыя (5496), пасля — пяціграмовыя (5234) і дваццаціграмовыя (4900). А таксама прадалі 65 кілаграмовых зліткаў і 261 паўкілаграмовы. За апошнія 10 гадоў (з 20 жніўня 2001 года) Нацбанк прадаў 8 тон 555 кілаграмаў 365 грамаў золата. Кошт зліткаў на 19 жніўня: аднаграмовы — 71 долар ЗША, аднакілаграмовы — 64626 долараў ЗША. Для параўнання: на пачатку студзеня гэтага года аднаграмовы злітак каштаваў 55 долараў ЗША, аднакілаграмовы — 47673 долара ЗША. Дарэчы, часова зліткі прадаюцца толькі за замежную валюту.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

СНАРАДЫ ЗНАЙШЛІ Ў ГОРАДЗЕ

У Бабруйску знайшлі 76 артылерыйскіх снарадаў 100-міліметровага калібру часоў Вялікай Айчыннай вайны і 650 дыхальных патронаў для процівагазаў. Яны знаходзіліся на складзе на тэрыторыі былой вайсковай часці (гэта цяпер лесапаласа паблізу вуліцы Навумава). Снарады знайшоў 12-гадовы хлопчык. Іх абясшкодзілі спецыялісты групы размінавання.

Алена КАЗЛОВА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению СПК «Щомыслица» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **одним лотом:** здания коровника (инв. № 600/С-130724), об. пл. **1768,5 кв.м**; здания телятника (инв. № 600/С-130722), об. пл. **722,4 кв.м**; здания телятника (инв. № 600/С-130723), об. пл. **722,8 кв.м**, расположенных по адресу: Минская обл., **Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район агр. гор. Щомыслица (9; 9/1; 9/2)**.

Начальная цена с НДС (снижена) – 2 500 000 000 бел. руб.

Площадь земельного участка – 1,3898 га.

Задаток в сумме 150 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 02.08.2011.

Аукцион состоится **01.09.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **31.08.2011** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.

ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

В соответствии с условиями договоров срочного банковского вклада (депозита) ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении с 23 августа 2011 года до 30% годовых размера **основной** процентной ставки по договорам срочного банковского вклада (депозита) «Двадцатка», заключенным в период с 21.03.2011 по 22.08.2011 года.

Телефон Контакт-центра Банка – 136
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, MTC) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

В соответствии с условиями договоров банковского вклада (депозита) до востребования «Пенсионный», заключенных на условиях, утвержденных протоколом Кредитного комитета ОАО «Белагропромбанк» от 04.04.2006 № 36, ОАО «Белагропромбанк» сообщает об установлении процентной ставки с 23 августа 2011 года в размере 23% годовых.

Телефон Контакт-центра Банка – 136
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, MTC) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Небяспека

РАБОТНІК ЛАГЕРА ЗАГІНУЎ НА ПАЖАРЫ

У 21.41 па тэлефоне 101 паведамілі, што ў пасёлку Ільіч Улукоўскага сельскага Савета Гомельскага раёна гарыць электраправодка ў будынку, размешчаным на тэрыторыі дзіцячага аздараўленчага лагера «Прамень».

Праз 15 хвілін на месцы пажарныя ўбачылі, што гарыць ужо дах будынка, які не эксплуатаваўся, і дашчатая прыбудова. На момант узнікнення пажару на тэрыторыі лагера ў суседніх жылых карпусах знаходзілася 99 дзяцей ва ўзросце ад 2 да 17 гадоў, а таксама 13 чалавек абслуговага персаналу. Ніхто з іх не пацярпеў. У выніку пажару знішчана прыбудова, дах на плошчы 300 квадратных метраў закінутага будынка, пашкоджана маёмасць унутры. Падчас разбору будаўнічых канструкцый знойдзены труп мужчыны, работніка лагера. Прычыны пажару высвятляюцца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.08.2011 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	5 035,00	1 чэшская крона	296,31
▲ 1 еўра	7 245,87	1 польскі злоты	1 739,27
1 латвійскі лат	10 224,39	▲ 1 расійскі рубель	172,10
1 літоўскі літ	2 100,37	1 украінская грыўня	629,49

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрбанка РФ

USD	29,2555
10 UAH	36,5831
10000 BYR	58,1505
EUR	42,0226

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»
с 23 августа 2011 г.

Сумма депозита, ед. валюты	Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых: Срок, дни 100	200	300	500	1 000	2 000	3 000	Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых: Срок, дни 100	200	300	500	1 000	2 000
Белорусские рубли													
1 – 1 000 000	24,00	25,00	26,00	30,00	30,15	30,25	30,35	15,50	16,00	16,50	17,00	17,50	18,00
1 000 001 – 10 000 000	24,50	25,50	26,50	30,10	30,20	30,30	30,40	15,75	16,25	16,75	17,25	17,75	18,25
10 000 001 и более	25,00	26,00	27,00	30,15	30,25	30,35	30,50	16,00	16,50	17,00	17,50	18,00	18,50
Доллары США													
1 – 500	7,60	8,20	8,80	9,40	9,60	9,80	9,90	5,00	5,80	6,40	6,80	7,20	7,60
501 – 5 000	7,80	8,40	9,00	9,50	9,70	9,85	9,95	5,30	6,00	6,60	7,00	7,40	7,80
5 001 и более	8,00	8,60	9,20	9,60	9,80	9,90	10,00	5,60	6,20	6,80	7,20	7,60	8,00
Евро													
1 – 500	7,60	8,20	8,80	9,40	9,60	9,80	9,90	5,00	5,80	6,40	6,80	7,20	7,60
501 – 5 000	7,80	8,40	9,00	9,50	9,70	9,85	9,95	5,30	6,00	6,60	7,00	7,40	7,80
5 001 и более	8,00	8,60	9,20	9,60	9,80	9,90	10,00	5,60	6,20	6,80	7,20	7,60	8,00
Российские рубли													
1 – 15 000	8,60	9,20	9,80	10,40	10,60	10,80	10,90	6,00	6,80	7,40	7,80	8,20	8,60
15 001 – 150 000	8,80	9,40	10,00	10,50	10,70	10,85	10,95	6,30	7,00	7,60	8,00	8,40	8,80
150 001 и более	9,00	9,60	10,20	10,60	10,80	10,90	11,00	6,60	7,20	7,80	8,20	8,60	9,00

Подробные условия вклада «Линия роста» в газетах: «Советская Белоруссия» № 49 от 16.03.2006, «Звязда» № 50 от 04.03.2006, на сайте банка в сети Интернет – www.belapb.by и в офисах ОАО «Белагропромбанк».
Информация о размере процентов, выплаченных по привлеченным средствам физических лиц в течение последнего финансового года, – в офисах и на сайте банка.
Полная сохранность и возврат денежных средств физических лиц, размещенных в ОАО «Белагропромбанк», гарантируются государством и осуществляются в соответствии с законодательством РБ.
Сведения о выплаченных процентах по привлеченным средствам физических лиц в 2010 году в эквиваленте, тыс. бел. руб.:

	Январь	Февраль	Март	Апрель	Май	Июнь	Июль	Август	Сентябрь	Октябрь	Ноябрь	Декабрь	Итого
Срочные вклады (депозиты)	22 150 017	22 217 382	26 283 012	23 570 773	24 305 769	23 429 778	24 105 505	25 734 923	23 504 004	21 902 005	22 376 779	20 939 428	280 519 376
До востребования	109 717	112 167	154 527	147 164	130 440	153 009	175 320	208 613	207 977	209 476	234 959	253 869	2 097 239

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
Время работы Контакт-Центра Банка: 8.00 - 20.00 - рабочие дни; 8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, MTC) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ПРАЦА Ў БЕЛАРУСІ — ФАНТАСТЫЧНЫ ДОСВЕД ДЛЯ ЗАМЕЖНЫХ СТУДЭНТАЎ

Знаёмцеся: Патрык Эндрю Цімані. Студэнт Oriel College Оксфардскага ўніверсітэта. Прэзідэнт Клуба па альпінізме Оксфардскага ўніверсітэта. Інтарэсы — тэарэтычная фізіка (касмалогія і астрафізіка). Вельмі любіць вандраваць па свеце. Да апошняга часу ніколі не быў ва Усходняй Еўропе. Сёння ён у Мінску, дзе праходзіць практыку на кафедры тэарэтычнай фізікі БДУ. Патрык спадзяецца атрымаць вялікае задавальненне ад знаходжання ў нашай краіне і мяркуе, што праца ў Беларусі будзе для яго фантастычным досведам.

Карл Хаўбенвальнер. Студэнт Тэхнічнага ўніверсітэта горада Грац (Аўстрыя). Навучаецца па спецыяльнасці «інфарматыка». Карл мае ўжо больш як 6 гадоў практычнага досведу работы праграмістам у міжнароднай лагістычнай кампаніі, у тым ліку на выязных праектах у Швейцарыі, Венгрыі, Іспаніі і Тэнерыфе. Зараз праходзіць практыку ў кампаніі EPAM Systems у Мінску. Жаданне пазнаёміцца з культурай і традыцыямі беларусаў было адным з вядучых матываў, па якіх ён абраў месцам праходжання практыкі менавіта нашу краіну. Вядучым, але не адзіным. Не менш важнае значэнне мае для маладога чалавека і магчымасць асобаснага і прафесійнага росту, а практыка ў EPAM Systems, як ён упэўнены, дае яму магчымасць прымяніць свае навыкі і веды ў праграмаванні не толькі ў сферы лагістыкі, але і ў іншых сферах і праектах на міжнародным узроўні.

Практыку ў EPAM Systems, якую арганізоўвае Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, праходзяць таксама Чагры Эрдаган Сафа з Турцыі і Марцін Марласка Фернанда з Іспаніі. Усе чатыры хлопцы, а таксама яшчэ двое студэнтаў-замежнікаў —Вероніка Рубія Сарыяна з Іспаніі і Гокан Дэмірхан з Турцыі — былі запрошаны днямі на сустрэчу з міністрам адукацыі нашай краіны Сяргеем Маскевічам. Міністр цікавіўся ўражаннямі маладых людзей ад знаходжання ў Беларусі, умовамі іх пражывання і арганізацыі вытворчай практыкі.

Усе яны апынуліся ў Беларусі дзякуючы праграме Міжнароднай асацыяцыі па абмене студэнтамі для праходжання вытворчай практыкі (IAESTE). Пра тое, што азначае для нашай краіны супрацоўніцтва з IAESTE, і хто з беларускіх студэнтаў можа прэтэндаваць на набыццё практычнага досведу за межамі Беларусі, расказаў **старшыня нацыянальнага камітэта IAESTE-Беларусь Віктар ДАРАНКЕВІЧ**:

— IAESTE была ўтворана ў 1948 годзе ў Імперскім каледжы Кембрыджскага ўніверсітэта. Ідэя была такая — павысіць якасць прафесійных навыкаў будучых спецыялістаў праз інтэграцыю іх тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкі. IAESTE дае студэнтам, навучанне якіх звязана з тэхнічнымі навукамі, фізікай, хіміяй, інфарматыкай, а таксама біялогіяй, экалогіяй, фармацэўтыкай, сельскай гаспадаркай і іншымі спецыяльнасцямі, магчымасць прайсці аплачаную стажыроўку за мяжой. Менавіта так: праца студэнта-практыканта аплачваецца той фірмай ці кампаніяй, якая запрасіла яго на работу. Адна з абавязковых умоў — гэта валоданне замежнай мовай на дастатковым узроўні, які дазволіць маладым людзям выконваць вытворчыя задачы (як правіла, англійскай). Мінімальная працягласць практыкі складае 8 тыдняў. Праграма абмену працуе на прынцыпах узаемнасці. Напрыклад, калі да нас прыязджае англійскі студэнт, то беларускі студэнт едзе працаваць у Вялікабрытанію. Фактычна IAESTE з'яўляецца пасрэднікам у арганізацыі замежных прафесійных практык. За больш чым 60 гадоў сваёй дзейнасці IAESTE арганізавала вытворчую практыку за мяжой больш чым для 300 тысяч студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. У гэтай праграме ўдзельнічае каля 90 краін свету. Беларусь далучылася да яе дзесяць гадоў таму, а ў 2005 годзе стала асацыяваным членам IAESTE. У найбліжэйшых планах — стаць паўнавартасным членам, што пашырыць паўнамоцтвы краіны ў асацыяцыі і дазволіць інтэнсіфікаваць абмены.

Віктар Антонавіч расказаў, што першапраходцамі ў праграме міжнароднага абмену студэнтаў тэхнічных спецыяльнасцяў сталі Белдзяржуніверсітэт, БНТУ і Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы. Пазней да іх далучыліся БДУІР, Міжнародны экалагічны ўніверсітэт імя Сахарава, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту. Геаграфія краін, дзе набывалі практычныя навыкі студэнты беларускіх ВНУ, надзвычай шырокая: гэта Германія, Іспанія, Італія, Іспанія, Польшча, Чэхія, Турцыя, Швейцарыя, Вялікабрытанія, Нарвегія, Сербія, Фінляндыя, Грэцыя, Венгрыя, Сірыя і гэтак далей.

— Кожны год у снежні, у рамках генеральнай канферэнцыі IAESTE, праходзяць абменныя сесіі, — тлумачыць Віктар Даранкевіч. — У вялізным холе збіраюцца прадстаўнікі ўсіх краін са сваім пакетам прапаноў ад наймальнікаў. Кожная такая прапанова абавязкова змяшчае характарыстыкі працоўнага месца, патрабаванні да кандыдатаў, інфармацыю аб умовах пражывання, аплаты працы і іншыя важныя нюансы. Працоўнае месца абавязкова павінна адпавядаць узроўню падрыхтоўкі студэнта. І калі студэнта прымусяць выконваць працу не па яго спецыяльнасці, гэта абавязкова знойдзе адлюстраванне ў рэкламацыі. Пасля праходжання практыкі ўсе студэнты пішуць своеасаблівы рэпартаж, дзе даюць ацэнку свайму знаходжанню ў той ці іншай краіне, ацэньваюць, наколькі карыснай была для іх арганізаваная практыка. У кожнай краіны ёсць свае месца ў рэйтынгу па колькасці і якасці здзейсненых студэнцкіх абменаў. Натуральна, што беларусы пакуль што гэты рэйтынг не ўзначальваюць, бо па колькасці абменаў нам вельмі далёка да такіх краін, як, напрыклад, Германія, дзе штогод здзяйсняецца ад 1,5 да 2 тысяч абменаў, ці нават да Турцыі, дзе набываць практычны досвед за мяжой накіроўваюцца штогод ад 300 да 350 чалавек. Сёлета ў Беларусі запланавана здзейсніць каля 40 абменаў. Аднак паколькі рэкламацый на якасць арганізаванай практыкі ў Беларусі не было і практычна ўсе студэнты пакідаюць вельмі добрыя водгукі пра нашу краіну, то Беларусь мае ўсе шанцы стаць паўнавартасным членам Міжнароднай асацыяцыі па абмене студэнтамі.

Ці варта тлумачыць, што значаць для нас такія абмены? У першую чаргу, гэта рэкламаванне беларускай вышэйшай школы за мяжой і стварэнне пазітыўнага іміджу Беларусі, набыццё надзейных сяброў і наладжванне эканамічных сувязяў. Магчыма, пакуль што гэта выглядае крыху наіўна, тым не менш Вероніка Рубія Сарыяна з Іспаніі паведаміла міністру адукацыі, што ў перспектыве магла б адкрыць у Беларусі бізнэс, звязаны з выкладаннем іспанскай мовы. Карл Хаўбенвальнер заўважыў, што «Беларусь мала чым адрозніваецца ад Аўстрыі, і гэта стала для яго прыемным сюрпрызам». На жаль, Беларусь яшчэ для многіх іншаземцаў застаецца крыху экзатычнай краінай. Таму, калі бар'еры і стэрэатыпы рушацца, гэта ўсім ідзе толькі на карысць...

Надзея НІКАЛАЕВА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ КАТАЛІКОСА ЎСІХ АРМЯН ГАРЭГІНА ДРУГОГА З 60-ГОДДЗЯМ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Каталікоса ўсіх армян Вярхоўнага Патрыярха Гарэгіна Другога з нагоды 60-гадовага юбілею.

У віншаванні гаворыцца: «Ваша нястомная пастарская дзейнасць накіравана на аб'яднанне людзей вакол хрысціянскай веры, зацвярджэнне ідэалаў міласэрнасці і справядлівасці, умацаванне адзінства армян усяго свету».

«Перакананы, што сваёй мудрасцю, аўтарытэтам і стваральнай працай Вы і ў далейшым будзеце садзейнічаць развіццю плённага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі на карысць народаў Беларусі і Арменіі», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ ПРЭЗІДЭНТА ВЕНГРЫІ З ДНЁМ СВЯТОГА ІШТВАНА

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта Венгерскай Рэспублікі Пала Шміта і народ гэтай краіны з нацыянальным святам — Днём святога Іштвана.

Прэзідэнт Беларусі выказаў надзею на далейшае пашырэнне паміж краінамі палітычнага дыялогу, заснаванага на прынцыпах узаемнай павагі і супрацоўніцтва. Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў упэўненасць у паспяховым развіцці дружалюбных беларуска-венгерскіх адносін на карысць нашых народаў, умацаванні бяспекі на еўрапейскім кантыненце.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД Бусько Віталію Леанідавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Калектыў РУП «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю вядучага навуковага рэдактара ДУБОВІК Алены Аляксандраўны і выказвае шчырыя спачуванні яе родным і блізкім.

Калектыў РУП «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю СКАЛАБАНА Віталія Уладзіміравіча — беларускага гісторыка, літаратуразнаўцы, архівіста, кандыдата гістарычных навук і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Каму месца ў інтэрнаце?

Сёлета працэс засялення ў інтэрнаты БДУ будзе істотна мадэрнізаваны. Работу ўсяго механізма прадастаўлення жылля — ад пастаноўкі на чаргу, заключэння дагавора да аплаты за інтэрнат — будзе забяспечваць аўтаматызаваны праграмны модуль «Студгарадок». Гэтая камп'ютарная праграма дазволіць спрасціць і паскорыць этапы засялення.

Усяго ў гэтым годзе свае дзверы перад студэнтамі БДУ адчыняюць сем інтэрнатаў, дзе будзе выдзелена каля 5,5 тысячы месцаў, пераважную большасць з іх прадастаўляць першакурснікам. Адзін са студэнцкіх інтэрнатаў адкрыецца пасля капітальнага рамонту. Акрамя таго, па ініцыятыве студэнцкага гарадка БДУ працягвае функцыянаваць электронны банк звестак аб кватэрах і пакоях, якія здаюцца ў арэнду ў сталіцы. Гэтая інфармацыя размешчана на сайце БДУ і даступная ўсім студэнтам у рэжыме on-line.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У **суд Астравецкага раёна Гродзенскай вобл.** паступіла заява аб прызнанні адсутнай без вестак **Сліваковай Святланы Іосіфаўны**, 18.08.1972 года нараджэння, ураджэнкі в. Вараняны Астравецкага раёна, апошняе вядомае месца жыхарства: в. Вараняны Астравецкага раёна Гродзенскай вобл. Просім грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Слівакову Святлану Іосіфаўну, паведаміць іх суду Астравецкага раёна Гродзенскай вобл. (г.п. Астравец, вул. Кастрычніцкая, 6) на працягу двух месяцаў з моманту публікацыі.

Абзац

◢ ААТ «Мінскі камбінат хлебапрадуктаў» атрымаў сертыфікат кашэрнасці. Адна з галоўных мэтаў кашруту — рацыянальнае, прадуманае, здаровае харчаванне. У ежу дапускаецца толькі экалагічна карысны прадукт, які гарманіруе з арганізмам чалавека.

◢ ДТЗ адбылося паблізу вёскі Вялікія Бярэзаўцы на дарозе Астрына — Ваўкавыск. За рулём мікрааўтобуса Mercedes Sprinter сядзеў мужчына 1979 года нараджэння. Праехаўшы закругленне дарогі, вадзіцель не справіўся з кіраваннем. Мікрааўтобус занесла, і ён з'ехаў у кювет, а потым перакуліўся. У выніку пацярпела шэсць пасажыраў. Гэты вадзіцель 22 разы прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнні ПДР, у тым ліку хуткаснага рэжыму.

◢ РУП «Мінск Крышталь» першым у Беларусі пачынае ліцэнзійны выпуск рому па дагаворах кампаній-вытворцаў. Гэта дазволіць у некалькі разоў знізіць кошт і арганізаваць у далейшым экспарт у краіны Еўропы і Расію. Чакаецца, што кубінскі ром айчыннага разліву з'явіцца на прылаўках крам пасля 1 верасня.

◢ Легкавы аўтамабіль «Сеат», які ехаў па другараднай дарозе, не саступіў дарогу мікрааўтобусу «Фіят», што і стала прычынай ДТЗ. Аварыя адбылася 21 жніўня ў 22.40 у Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці. У выніку інцыдэнту 3 чалавекі загінулі, гэтулькі ж атрымалі раненні.

◢ Восьмы адкрыты чэмпіянат па спартыўнай арніталогіі пройдзе ў Беларусі 3 верасня. Сёлета спаборніцтвы паміж камандамі-ўдзельніцамі будуць на 3 гадзіны даўжэйшымі — з 6.00 да 18.00. Каманды самі вызначаць маршрут свайго руху, на якім будуць улічваць птушак як па вонкавым выглядзе, так і па голасе. Задача кожнай каманды — улічыць як мага больш відаў птушак.

◢ У пятніцу, 19 жніўня, на чыгуначным прыпыначным пункце «Сталічны» 47-гадовы непрацуючы жыхар Мінска спрабаваў пакончыць жыццё самагубствам. Ён кінуўся пад цягнік Саратаў—Берлін. У выніку мужчына пазбаviўся абедзвюх ног і атрымаў розныя траўмы, з якімі быў шпіталізаваны.

◢ У Сіньцзян-Уйгурскім аўтаномным рэгіёне Кітая 11 чалавек (з іх шасцёра дзяцей) памерлі, атруціўшыся воцатам пасля вячэрняй трапезы падчас святога для мусульман месяца Рамадан. На працягу гэтага месяца мусульмане посцяць на працягу дня і ядуць толькі з наступленнем цемры. Усяго воцатам атруцілася 120 чалавек, не ўлічваючы загінулых. Воцат захоўваўся ў дзвюх каністрах, у якіх раней знаходзіўся антыфрыз. Якім чынам воцат трапіў у ёмістасці з-пад атрутнага рэчыва, невядома.

Поўны абзац

◢ Жыхар Мінусінска Юрый Бабаеў атрымаў «жыгулі» сёмай мадэлі за выгадаваны ім рэкордны для Сібіры памідор. Плод вагой 2,146 кілаграма прынёс Бабаеву перамогу ў конкурсе на свяце «Дзень мінусінскага памідора», які штогод праводзіцца ў гэтым горадзе. Папярэдні рэкорд вагі складаў 1,7 кілаграма.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Минский районный исполнительный комитет 22 сентября 2011 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Ждановичский с/с, д. Каменная Горка, участок № 101	623681704601000136	0,2306 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	2 500 000	153 000 000	15 300 000
2	Ждановичский с/с, п. Ратомка, район ул. Баньковщина, квартал № 1, участок № 61	623681708601002765	0,1320 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	2 500 000	38 000 000	3 800 000
3	Ждановичский с/с, п. Ратомка, район ул. Баньковщина, квартал № 2, участок № 6	623681708601002769	0,1360 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	2 500 000	39 000 000	3 900 000
4	Ждановичский с/с, п. Ратомка, район ул. Баньковщина, квартал № 2, участок № 16	623681708601002767	0,1480 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	2 500 000	42 000 000	4 200 000
5	Ждановичский с/с, п. Ратомка, район ул. Баньковщина, квартал № 2, участок № 17	623681708601002773	0,1480 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	2 500 000	42 000 000	4 200 000
6	Ждановичский с/с, п. Ратомка, район ул. Баньковщина, квартал № 2, участок № 18	623681708601002768	0,1480 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	2 500 000	42 000 000	4 200 000
7	Ждановичский с/с, п. Ратомка, район ул. Баньковщина, квартал № 2, участок № 20	623681708601002772	0,1330 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	2 500 000	38 000 000	3 800 000
8	Ждановичский с/с, п. Ратомка, район ул. Баньковщина, квартал № 2, участок № 21	623681708601002771	0,1330 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	2 500 000	38 000 000	3 800 000
9	Ждановичский с/с, п. Ратомка, район ул. Баньковщина, квартал № 2, участок № 34	623681708601002770	0,1520 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	2 500 000	43 000 000	4 300 000
10	Крупицкий с/с, а/г Крупица	623683906601000513	0,1434 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 070 750	18 000 000	1 800 000
11	Крупицкий с/с, а/г Крупица	623683906601000512	0,1978 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 070 750	25 000 000	2 500 000
12	Лошанский с/с, а/г Лошаны, участок № 1	623684005601000238	0,1499 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	894 471	23 000 000	2 300 000
13	Лошанский с/с, д. Куты	623684004101000035	0,1609 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	894 471	20 000 000	2 000 000
14	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 1	623684202601000261	0,1404 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	36 000 000	3 600 000
15	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 2	623684202601000264	0,1400 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	36 000 000	3 600 000
16	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 3	623684202601000257	0,1396 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	36 000 000	3 600 000
17	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 4	623684202601000258	0,1392 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	36 000 000	3 600 000
18	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 5	623684202601000259	0,1388 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	36 000 000	3 600 000
19	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 6	623684202601000260	0,1384 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	36 000 000	3 600 000
20	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 7	623684202601000265	0,1380 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	36 000 000	3 600 000
21	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 8	623684202601000262	0,1376 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	36 000 000	3 600 000
22	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 9	623684202601000263	0,1372 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	36 000 000	3 600 000
23	Михановичский с/с, а/г Чуриловичи	623684206601000299	0,1189 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	40 000 000	4 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **22.09.2011 г. в 9.30.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **16.09.2011 г.** в 17.00. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–9 перечисляется на расчетный счет № 3600621030059 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052317, код платежа – 04901.

На Лоты 10–11 перечисляется на расчетный счет № 3641900000091 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На Лоты 12–13 перечисляется на расчетный счет № 3641900000046 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600228670, код платежа – 04901.

На Лоты 14–23 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 23 сентября 2011 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни **с 08.00 до 17.00**. Последний день приема заявлений – **19.09.2011** года до **15.00**.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Условия проведения аукциона – **наличие не менее двух участников**.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон, желающие принять участие в аукционе представляют в сроки, указанные в извещении:

а) квитанцию о **внесении задатка** на расчетный счет **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 **(разовый платеж)**;

б) документ, удостоверяющий личность **(паспорт и его копию)** покупателя, а в случае участия в аукционе его представителя – **паспорт, копию паспорта и нотариально заверенную доверенность**.

Порядок осмотра на местности земельного участка: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: строительство инженерных коммуникаций будет осуществлено в соответствии с проектно-сметной документацией за счет бюджета города. Продажа земельных участков производится без изменения целевого назначения. Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят **задатки** в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Победитель аукциона обязан: в течение десяти рабочих дней после принятия решения о предоставлении земельного участка в частную собственность внести плату за земельный участок (задаток засчитывается при внесении платы); возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 11 миллионов рублей.

№ лота	Адрес земельного участка, по ПДП «Детальный план индивидуальной жилой застройки в районе деревни Городщина Могилевского района»	Площадь, га	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 16	участок № 117	0,1046	740100000001005930	908 777	30 780 000	2 770 000
№ 17	участок № 118	0,1050	740100000001005931	964 326	30 898 000	2 781 000
№ 18	участок № 119	0,1050	740100000001005932	964 326	30 898 000	2 781 000
№ 19	участок № 120	0,1099	740100000001005933	990 200	32 340 000	2 911 000
№ 20	участок № 121	0,1035	740100000001005934	964 326	30 457 000	2 741 000
№ 21	участок № 122	0,1056	740100000001005935	990 200	31 075 000	2 797 000
№ 22	участок № 123	0,1184	740100000001005936	953 042	34 841 000	3 136 000
№ 23	участок № 124	0,1050	740100000001005937	938 508	30 898 000	2 781 000
№ 24	участок № 125	0,1050	740100000001005938	915 619	30 898 000	2 781 000
№ 25	участок № 126	0,1045	740100000001005940	940 522	30 751 000	2 768 000

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

Дзеля памяці

ЧАЛАВЕК-АРХІЎ

Віталь Скалабан упісаў сваё імя ў гісторыю Беларусі.

Сёння яго праводзяць у апошні шлях, аддаючы даніну павагі. Ён быў адным з тых людзей, для якіх гісторыя была не проста падставай для вывучэння, а часткай жыцця. Калі ён вывучаў гістарычныя дакументы, то нібыта ўяўляў усё ў карцінах, як гэта магло быць, і тады лепей разумеў — чаму. Архівіст, даследчык, літаратар і проста апантаны Беларуссю чалавек Віталь Скалабан прыйшоў у свет у жніўні 1947-га, а пайшоў у жніўні 2011.

Усяго 64 — для гісторыка зусім мала: яны ж умяшчаюць у сябе стагоддзі, тысячагоддзі, эпохі. Скалабан, папрацаваўшы ў Нацыянальным архіве, адчуваў, што нават жыцці вядомых асоб і даўно апісаныя факты могуць быць да канца не разгаданымі. У беларускай гісторыі для яго такіх асоб было шмат, асабліва на пачатку XX стагоддзя, калі нараджалася і замацоўвалася ідэя беларускай дзяржаўнасці. Дзеля яе гатовыя былі ахвяраваць сабой у тым ліку і такія вядомыя асобы, як Каліноўскі, Купала, Тарашкевіч... Цікавай для вывучэння В. Скалабан лічыў і гісторыю беларускага друку XX стагоддзя, адзначаючы ўнёсак нашай газеты ў захаванне беларускай мовы.

Для яго гісторыя была не столькі таямніцай, колькі крыніцай адказаў на пытанні: як жыць цяпер, якіх памылак нельга зрабіць. Усё таму, што, як архівіст, ён разумеў: хоць людзі здольныя хаваць нешта, яно ўсё роўна запісана, пазначана ў словах ці паміж радкамі, ці ў шматкроп'ях. Нават у маленькім, на першы погляд не важным дакументе ён умеў убачыць сенсацыйныя адкрыцці, а звычайную справаздачу аб допыце Купалы зрабіць п'есай, якую напісала жыццё.

Скончыўшы Ленінградскі ўніверсітэт, ён разумеў важнасць культурных традыцый для народа. Можа, таму менавіта іх захаванню аддаваў больш увагі, чым сваім навуковым дасягненням — кандыдацкую дысертацыю В. Скалабан абараніў у 1987-м. Сціплы чалавек. Не пра сябе думаў...

Звяздоўцы.

Здарэнні

САМІ З МАШЫНЫ ВЫБРАЦЦА НЕ МАГЛІ...

А палове сёмай раніцы выратавальнікам патэлефанаваў дзяжурны па Нараўлянскім РАУС: на аб'язной дарозе каля горада з'ехаў у кювет і сутыкнуўся з дрэвам легкавы аўтамабіль, патрэбна дапамога ў даставанні пацярпелых.

У аўтамабілі «Таёта-Салара» знаходзіліся пяць чалавек, тры з якіх сапраўды самастойна выбрацца з машыны не маглі. Работнікам МНС давялося вызваляць іх з дапамогай аварыйна-выратавальных інструментаў. У дваіх былі траўмы пазваночнікаў, у трэцяга — пералом сцягна. Пацярпелі і кіроўца з трэцім пасажырам, праўда, яны змаглі выбрацца з аўтамабіля пасля здарэння самастойна. Пацярпелыя былі дастаўлены ў Нараўлянскую раённую бальніцу. Усе яны — жыхары Мінска.

Сяргей РАСОЛЬКА.

О результате процедуры запроса ценовых предложений

РУПП «Экзон-Глюкоза» в результате процедуры запроса ценовых предложений на закупку легкового автомобиля «Шкода Супер Б Комфорт» признало поставщиком ООО «ФелОкт-сервис».

УНП 290215113

Спорт

Весляры заваявалі 8 медалёў і 6 ліцэнзій

У нядзелю ў венгерскім Сегедзе завяршыўся чэмпіянат свету па веславанні на байдарках і каноэ. Нашы алімпійскія надзеі вяртаюцца з 8 медалямі (1 залаты, 3 сярэбраныя і 4 бронзавыя) і з 6 пуцёўкамі ў Лондан-2012.

«Золата» належыць нашаму экіпажу каноэ-чацвёркі на дыстанцыі 1000 метраў (Дзмітрый Рабчанка, Дзмітрый Вайцішкін, Дзяніс Гаража, Аляксандр Валчэцкі). Калегі па байдарцы-чацвёрцы, алімпійскія чэмпіёны-2008 Раман Петрушэнка, Аляксей Абалмасаў, Артур Літвінчук і Вадзім Махнеў медальныя традыцыі на гэты раз не падтрымалі: яны не трапілі ў галоўны фінал, і на старт у фінале В вырашылі не выходзіць. У выніку спартсмены засталіся без ліцэнзій на Алімпіяду на гэтай дыстанцыі. Праўда, атрымаць яе можна ў дадатковым адборы вясной 2012 года. Затое на дыстанцыі 200 м Раман Петрушэнка і Вадзім Махнеў разам з пуцёўкай у Лондан заваявалі бронзавы медаль. Дуэт алімпійцаў братоў Багдановічаў таксама застаўся без медалёў: яны сталі толькі шостымі ў спаборніцтвах каноэ-двоек на 1000 м, але алімпійскую ліцэнзію заваявалі. Сярэбраны медаль на гэтай дыстанцыі ўзяў і экіпаж мужчынскай каноэ-двойкі ў складзе Дзмітрыя Рабчанкі і Аляксандра Валчэцкага. За крок ад п'едэстала спынілася жаночая каноэ-адзіночка на дыстанцыі 200 м: Кацярына Герасіменка заняла чацвёртае месца.

Пяціразовы чэмпіён свету Дзяніс Гаража ў спаборніцтвах каноэ-адзіночак на 500 м прапусціў наперад расіяніна Уладзіміра Федасенку і не змог у шосты раз пацвердзіць свой тытул, задаволіўшыся «серабром». Сярэбраным прызёрам на 500 м стаў і байдарачнік Павел Мядзведзеў. Мінулагодні чэмпіён Еўропы Алег Юрэня стаў другім на дыстанцыі 5000 м у спаборніцтве байдарак-адзіночак, а віцэ-чэмпіёнка свету-2010 Марына Палтаран у спаборніцтвах на гэтай дыстанцыі жаночых байдарак-адзіночак заваявала бронзавы медаль.

Ліцэнзіі таксама заваявалі Аляксандр Жукоўскі і Алег Юрэня.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў каманду беларускіх спартсменаў-весляроў у складзе Аляксандра Валчэцкага, Дзмітрыя Вайцішкіна, Дзмітрыя Рабчанкі, Дзяніса Гаражы з перамогай на чэмпіянаце свету па веславанні на байдарках і каноэ ў Венгрыі. Кіраўнік дзяржавы пажадаў ім новых яркіх спартыўных дасягненняў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

На ўніверсіядзе ў Кітаі беларусы заваявалі 11 медалёў

На XXVI летняй універсіядзе беларускія спартсмены заваявалі 11 медалёў. Сярод іх 3 залатыя, 4 сярэбраныя і 4 бронзавыя.

Чэмпіёнкай універсіяды стала наша плыўчыха Аляксандра Герасіменя, якая выйграла 50 м вольным стылем. На яе рахунку яшчэ два медалі: серабро на дыстанцыі 50 м на спіне і бронза на стометроўцы на спіне. Яшчэ два залатыя медалі атрымалі беларускія стралкі. Юрый Шчарбацэвіч **(на фота)** перамог падчас стральбы з малакалібернай вінтоўкі з дыстанцыі 50 м. У той жа дысцыпліне заваявалі залаты медаль нашы стралкі ў камандных спаборніцтвах.

Фота БЕЛТА.

Адразу пяць медалёў на рахунку тэнісістаў. Сяргей Бетаў і Аляксандр Буры атрымалі серабро ў пары, а пасля па бронзавай узнагародзе ў індывідуальных выступленнях. У міксце са Святланай Піражэнкай Аляксандр Буры зноў заваяваў серабро. Яшчэ адно серабро дасталася беларускім тэнісістам у камандным заліку. Бронзу заваявала і гімнастка Любоў Чаркашына ў шматбор'і. З 11 медалямі наша зборная займае 18-е месца. Сёння ўніверсіяда ў Кітаі завершыцца.

Алена КРАВЕЦ.

Футбол. Чэмпіянат Беларусі

ДЫНАМАЎЦЫ РАСКАЗАЛІ, ХТО Ў ЧЭМПІЯНАЦЕ «НЕДАТЫКАЛЬНАЯ КАМАНДА»

У выхадныя завяршыўся 22 тур чэмпіянату Беларусі па футболе, які ўмясціў шэраг нічыіх і не абышоўся без скандалаў.

Завяршаў тур матч «Дынама» (Брэст) — «Шахцёр». Здавалася б, усё проста: перадапошнія ў турнірнай табліцы брастаўчане і другія зверху салігарчане — ніякіх сенсацый. У выніку ж «бела-блакітныя» разгромілі «Шахцёр» з лікам, які прэтэндэнту на сёлетняе віцэ-чэмпіёнства лепш хутчэй забыць, — 4:0.

А вось сталічнае «Дынама», якое апошнім часам нярэдка прыцягвае ўвагу калі не якасцю футбола, то хаця б скандальчыкам, вызначылася і на гэты раз. Як паведамляе Football.by, у пратаколе гульні галоўны арбітр сустрэчы Генадзь Ляўчук зрабіў такі запіс: «Пасля заканчэння матча трэнеры каманды «Дынама» (Мінск) выйшлі на поле і выказалі сваё незадавальненне: «Каманда «Дынама» недатыкальная, і не трэба яе чапаць і інш. (трэнеры Аўчыннікаў і Скалін)». Вядома ж, пасля хатняй нічыёй (2:2) з адным з аўтсайдараў чэмпіянату «Віцебскам», раззлаваўшыся, можна яшчэ і не тое сказаць. Тым больш, што зарад спартыўнай злосці дынамаўцам не пашкодзіць: у наступным туры ім сустракацца з БАТЭ.

Лідар чэмпіянату высвятляў у туры адносіны з «Гомелем», які пакуль ідзе трэцім. У выніку — папулярная нічыя (1:1). І яшчэ тры нічыі: «Днепр» — «Белшына» — 2:2, «Нёман» — «Тарпеда» — 2:2, «Нафтан» — «Мінск» — 0:0.

Становішча камандаў: 1. БАТЭ — 48 ачкоў, 2. «Шахцёр» — 39,3. «Гомель» — 32 (пасля 21 гульні), 4. «Дынама» Мн — 31,5. «Нафтан» — 30,6. «Тарпеда-БелАЗ» — 30,7. «Белшына» — 26,8. «Мінск» — 25,9. «Віцебск» — 23,10. «Дынама» Бр — 23,11. «Нёман» — 23,12. «Днепр» — 19.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

СЛУЖБА ЯШЧЭ НАПЕРАДЗЕ

Калі паўтары тысячы ваеннаслужачых унутраных войскаў МУС 20 жніўня па ўсёй краіне прынялі прысягу на вернасць беларускаму народу. Да гэтага ў першы месяц службы навабранцы асвойвалі курс пачатковай ваеннай падрыхтоўкі на вучэбных зборах.

У воінскую часць 5448 павіншаваць навабранцаў, а таксама бацькоў, родных і сяброў прыехалі намеснік міністра ўнутраных спраў, камандуючы ўнутранымі войскамі генерал-маёр Валерый Гайдукевіч і старшыня Мінскага гарадскога савета дэпутатаў Міхаіл Савановіч.

Пасля прыняцця ваеннай прысягі камандзіры воінскіх часцей сустрэліся з бацькамі маладых салдат, каб адказаць на хвалюючыя пытанні, расказаць пра ўмовы праходжання службы ва ўнутраных войсках. Галоўным жа падарункам для навабранцаў стала першае ў іх службе трохсутачнае звальненне дадому.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.
Мінскі раён.

ЗЯМЛЯ БЯСЦЭННАЯ

ДЛЯ чалавека зямля заўсёды была надзейнай апорай і мела вялікую каштоўнасць. Але з калектывізацыяй усё змянілася.

У Беларусі адбылася кадастравая пераацэнка кошту зямельных участкаў у населеных пунктах. Ці змянілася ў сувязі з гэтым адносіны людзей да зямлі? Ці набыла яна рэальную цану?

Калі ў дзевяностыя гады я выкупіў свае 20 сотак, то цана на іх была сімвалічная, а пасля кадастравай пераацэнкі яна вырасла, хоць і не вельмі.

Кадастравая пераацэнка зямлі паўплывала на зямельныя падаткі, кошт прыватызацыі ўчасткаў і стаўку арэнды зямлі.

Кошт зямлі на прысядзібных участках у некаторых рэгіёнах вырас у разы. Усё залежыць ад таго, дзе зямля знаходзіцца, якія камунікацыі да ўчастка падведзены і г. д. Калі ўчасткі знаходзяцца ў зоне буйных гарадоў, то і цана на зямлю там вельмі высокая.

У Брэсце за ўчастак (25 сотак) з падмуркам для дома просяць 50 тысяч долараў. А ў прыгарадзе Брэста 6,3 соткі, таксама з падмуркам, прадаюцца за 8 тыс. долараў.

Калі зямля знаходзіцца побач з зонай адпачынку ці запаведнікам, то кошт яе ўзрастае. Напрыклад, за ўчастак у 25 сотак каля возера Нарач (в. Лагавіны) спадзяюцца атрымаць 18 500 долараў. Але гэта рынкавая цана.

Раней чалавек мог купіць толькі хату, а цяпер можа ўжо набыць і соткі па цане, якая ўказана ў рэестры.

Кадастравая пераацэнка адбылася, але яна прынцыпова нічога не змяніла, бо сельскагаспадарчыя ўгоддзі па нашых законах не могуць прадавацца. Ды не толькі яны. У прыватную ўласнасць не могуць перадавацца землі прыродаахоўнага, аздараўленчага прызначэння...

З аднаго боку — зямлю ў прыватнай уласнасці можна мець (вось у мяне 20 сотак), а з іншага — свабоднага абароту зямлі няма.

Юрыдычная асоба можа атрымаць зямлю на 99 гадоў у арэнду і толькі. Напрыклад, фермер, які зямлю прывёў да ладу, як кажуць, уклаў у яе душу, на старасці можа яе толькі перадаць дзецям. А калі дзяцей няма ці яны аддзяліліся ад бацькоў?

Фермер з в. Балота (Кобрынскі раён) прадае гаспадарчыя пабудовы (жывёлагадоўчую ферму, цэх з піларамай, камунікацыі) за 600 млн рублёў, а вось зямлю пакупніку неабходна будзе браць у арэнду.

Акрамя гэтага, даводзілася чуць, як кіраўніцтва аднаго райвыканкама пагражала фермерам. Маўляў, калі ўраджай у вас не будзе сярэднім па раёне, то зямлю забяром. Але ж у суседнім СВК ураджай той меншы, чым у фермера.

Такі выбарчы падыход сведчыць, што ў аграпрамысловым комплексе прыватнік усё яшчэ пасынак. І нягледзячы на тое, што ў некаторых раёнах многія хацелі б узяць зямлю, яны не маюць такой магчымасці.

У гэтым плане вылучаецца Столінскі раён. Дарэчы, на 1 га ворыва тут прыпадае больш за 50 чалавек — гэта самы высокі паказчык не толькі на Брэстчыне. Людзі хочуць зямлі, а свабоднай няма. Практычна ўся зямля знаходзіцца ва ўласнасці СВК, а яны зямлю не аддаюць. Ад іншага сельгаскааператыва і карысці мала, але там працуюць людзі. У раёне адна трэцяя частка гаспадарак не можа пахвалiцца ўраджаямі, ды і ў большасці з іх не б'юць рэкорды. Распусціць занепалы сельгаскааператыў і перадаць (прадаць) зямлю людзям можна было б, але ў райвыканкаме кажуць: «Не мы іх стваралі — не нам іх распускаць».

Хто стварае калгасы гвалтам — тых даўно няма, але ж яшчэ не стаіць і час прымусіць паставіць усё на сваё месца.

У такіх вёсках, як Альшаны ці Рубель, са свабоднай зямлёй праблема, але яна ёсць на тэрыторыі іншых гаспадарак. Толькі вось пераязджаць людзі не хочуць.

На Століншчыне даводзілася бываць неаднаразова, і кожны раз людзі скардзіліся на адсутнасць зямлі. Калі так, то чаму б не пераехаць на тэрыторыю суседняга раёна? Але ў чалавека «жалезны» аргумент: «Мае бацькі тут жылі і дзяды, то чаму я павінен кінуць хату і ўсё пачынаць нанова?»

Я толькі хачу спытаць, а дзе зямлю ўзялі былыя калгасы (сённяшнія СВК)? Яе забралі ў бацькоў і дзядоў, чыя нашчадкі просяць сёння зямлю — сваю зямлю. Яны на яе маюць поўнае маральнае права. Але людзі не патрабуюць, а просяць. Можа, многія нават і купілі б гектар-другі, толькі вось бяда: зямля ў нас яшчэ не мае цаны.

Трэба адзначыць, што не ва ўсіх рэгіёнах такія ж адносіны да зямлі, як на Століншчыне. На Радзівілаўскай градзе пад Нясвіжам раскінуліся землі агракамбіната «Сноў», і тут няма такой прагі да зямлі. Людзі працуюць на агракамбінаце, атрымліваюць прыстойную па нашых мерках зарплату, і ў іх няма жадання «рваць жылы» на сваім надзеле.

Аналагічная сітуацыя на тэрыторыі іншых трывалых гаспадарак — там у фермеры не вельмі імкнуцца.

На мой погляд, патрэбен дыферэнцыяльны падыход. Калі ў нейкім раёне, дзе ў людзей няма заробку, а ёсць жаданне працаваць на сваёй зямлі, то трэба яе даць з зямель сельгаскааператываў, а дзе такой праблемы няма, то і пытанне адпадае.

Сусветная практыка паказвае, што хоць сельская гаспадарка і адыгрывае важную ролю ў эканоміцы, але яна не можа быць яе лакаматывам.

Наша сельская гаспадарка выглядае на фоне расійскай больш эфектыўна, але гэта дзякуючы, найперш, дзяржаўнай датацыі. Фінансавыя ўліванні ў аграпрамысловы комплекс у нас вялікія. Але ці такая ж вялікая аддача? Колькі нам прынесла сельская гаспадарка валюты, мы ведаем, а вось колькі грошай было ўкладзена у яе, колькі трыльёнаў спісалі, адтэрмінавалі... то тут з арыфметыкай узнікаюць цяжкасці. А жыццё нас прымусіць лічыць.

У нашых суседзяў палі ператварыліся ў сенажаці. У Літве каля 30-40% былога ворыва не апрацоўваецца, закінуты многія палі і ў Расіі. Гэтая зямля не апрацоўваецца з-за нізкай бальнасці. Які сэнс яе засяваць, калі ў зямлю ўкладваецца больш, чым яна можа вярнуць.

У былым Саюзе ўсё заворвалі, цаліну падымалі, а збожжа закуплялі за мяжой. Расія сёння яго экспартуе, хоць Смаленшчына, Пскоўшчына... зараслі хмызняком. Калі на Кубані можна з гектара ўзяць 70 ц, то гэтым усё сказана.

Спрэс датаваць сельскую гаспадарку ў нас ужо не атрымліваецца. Магчыма, зямлю некаторых стратных гаспадарак давядзецца перадаць (ці прадаць) прыватніку. І на гэты працэс трэба глядзець спакойна. Калі ў палескай зоне дрэнна расце збожжа, то няхай людзі закладваюць плантацыі журавін, чарніц, буякоў... і цана гэтай зямлі рэзка вырасце — яна будзе даваць прыбытак.

Спасылкі на тое, што ў нас няма гаспадара, што не кожны можа быць фермерам, не выдуманая, але так не можа быць вечна. Калі чалавек жадае стаць гаспадаром, то трэба яго падтрымаць. Фінансава-эканамічны крызіс прымусіць гэта зрабіць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота аўтара.

Зваротная сувязь

І... ЗАГАВАРЫЛА РАДЫЁ!

«Просценькі дынамік з рэгулятарам гучнасці — любімец і сапраўдны спадарожнік нашых пенсіянераў. Нездарма ён нязменна вісіць на кухнях ці над ложкамі ў вясковых хатах і гарадскіх кватэрах. Калі раптам радыёкропка перастае працаваць, жыхары адчуваюць сябе не зусім камфортна. Асабліва старыя і самотныя людзі, у якіх зносіны з іншымі вельмі абмежаванымі...».

Гэта — радкі з невялічкага фотарэпартажу («І змоўкла радыё...», «Звязда», 23 ліпеня г.г.), прадыктаванага вялікай крыўдай. Яшчэ ў сакавіку на вуліцы Полацкай, што ў Бешанковічах, мянялі апоры электралініі і абрэзалі правады для радыёкропак. У выніку больш за сорак дамоў засталіся без прывычных навін і перадач. Больш за тое — без надзей, што страчанае калі-небудзь вернецца, бо звярталіся пенсіянеры ў мясцовы выканкам, але марна: ім адказалі, што на аднаўленне радыёсувязі не хапае сродкаў...

Па просьбе рэдакцыі ўзнятае ў рэпартажы пытанне было разгледжана яшчэ раз і...

Як паведаміў н**амеснік старшыні Бешанковіцкага райвыканкама спадар АЎЧЫННІКАЎ**, спецыяліст раённага вузла электрасувязі аднавіў-такі радыёкропкі на вуліцы Полацкай!

А трохі раней у рэдакцыю прыйшоў кароткі ліст ад радыёслухачоў. Даслоўна: «Дарагая рэдакцыя, паведамляем, што 5 жніўня нам зноў падключылі радыёкропкі. Усе жыхары вуліцы Полацкай шчыра дзякуюць вам за дапамогу...»

Значыць, загаварыла радыё!

Дваццаць пяць гадоў вадзіцель Рыгор Макаранка працуе на жніве ў СПК «Шчомысліца» Мінскага раёна. Прызнаецца, што работа хоць і цяжкая, але заўсёды прыносіць задавальненне.

— Жыта золатам сыплецца! Як не працаваць? — усміхаецца ён.

Сёлета і сямнаццацігадовы сын таксама выйшаў у поле ў час жніва папрацаваць памочнікам камбайнера.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Пабач з намі

ПА ЖЫЦЦІ — СА СКРЫПКАЙ!

Не толькі фабрычнай, але і зробленай уласнымі рукамі

УЖО шмат гадоў 91-гадовы смаргонец Уладзіслаў Будзько кожную раніцу распачынае з... ігры на скрыпцы. І гэтак жа ён звычайна дзень і завяршае. Прычым інструмент у яго не фабрычны, а ўласнай вытворчасці. Такіх, розных па гучанні, але зробленых ім самім скрыпак ва Уладзіслава Іванавіча ажно чатыры.

Фота з сямейнага архіва.

Уладзіслаў БУДЗЬКО (скрыпка) і муж унучкі (гітара).

Калі карэспандэнт «Звязды» падышоў да хаты Уладзіслава Будзько па вуліцы Кірава ў Смаргоні, скрыпічны майстар быў на падворку, нешта рабіў па гаспадарцы. Ужо потым даведваюся, што, нягледзячы на паважаны ўзрост, гаспадар сёлета не толькі сам прапалоў бульбу, але і атрымаў ад скошанага бульбавення чатыры вядры попелу для падкормкі ўчастка. Во дае! Але наша размова — пра музыку, скрыпкі. Уладзіслаў Іванавіч запрашае ў хату і апавядае, адкуль у яго, чалавека, які ўсё жыццё працаваў на зямлі і ніколі не вывучаў нотнай граматы, не мае ніякага музычнай адукацыі, такое захапленне.

«Вінаватыя» ў гэтым, аказваецца, калядоўшчыкі, якія ў гады ягонага дзяцінства на суседняй Ашмяншчыне хадзілі па вёсцы ў прыгожым святочным адзенні. Адзін з трох калядоўшчыкаў іграў на скрыпцы. 12-гадовы Уладзік быў так уражаны чароўнымі гукамі дагэтуль невядомага яму інструмента, што хадзіў за музыкам па ўсёй вёсцы, не думаючы пра калядныя прысмакі, а толькі пра скрыпку: «Вось бы і мне такую». Але дзе там ... Фабрычная скрыпка тады, «за польскім часам» каштавала проста шалёных грошай, параўнальных ледзь не з цаной каровы. А фондаў падтрымкі творчых здольнасцяў моладзі ў тыя часы не было.

Вось тады Уладзік Будзько і паспрабаваў сам ажыццявіць сваю мару. І ён зрабіў скрыпку. Зразумела, такой, як у калядоўшчыкаў, яна атрымацца не магла — па сутнасці, гэта была дошчачка з нацягнутымі струнамі і насечкамі для пальцаў. З гэтым інструментам Уладзік стаяў і слухаў, як іграюць музыкі на вяселлях, запамінаў мелодыі, а затым спрабаваў іграць і сам. Слухачоў не запрашаў, хіба што суседскага хлопца, з якім разам пасвілі кароў. Праўда, аднойчы ля стога саломы яго заспеў за гэтым заняткам бацька. Пастаяў, паківаў галавой, не даў прачуханкі, што не тое робіць, але і не пахваліў. А потым...

Той дзень для Уладзіслава Іванавіча — адзін з самых шчаслівых у яго жыцці. Бацька вярнуўся з кірмашу і кажа сыну: «Ты еў сёння? Не? Дык ідзі да стала». Хлопец падыходзіць, а там — нешта накрытае рушніком. Думае, хлеб і сала. Адкрывае: скрыпка! А бацька ўсміхаецца. Аказваецца, яму на кірмашы пашанцавала не надта і дорага купіць у адной жанчыны гэты не самаробны, а сапраўдны фабрычны інструмент, які застаўся ёй пасля памерлага мужа.

Тады, узгадвае Уладзіславаў Будзько, і пачаліся ягоныя «канцэрты» — на вясковых вяселлях, танцах. Спачатку — удваіх, разам з гарманістам. А пасля вайны ўжо нават у складзе сапраўднага ансамбля, дзе, акрамя скрыпкі і гармоніка, былі таксама кларнет, бубен і труба. Гэту, кажучы па-сучаснаму, фальклорную групу (усё ж народнае, ад прадзедаў!) шанавалі не толькі ў роднай, але і ў навакольных вёсках, нават у суседнюю Літву на вяселлі запрашалі. Такой была музычная «кар'ера» скрыпача-самавучкі, калгаснага палявода Уладзіслава Будзько.

У Смаргонь, бліжэй да дзяцей, яны з жонкай пераехалі ўжо пенсіянерамі. Скрыпка, якую падараваў бацька, на жаль, не захавалася, але Уладзіслаў Іванавіч не стаў збіраць грошы на новую, вырашыў зрабіць сам. Бо попыт у яго ўжо быў, ды і рукі не роўныя дзіцячым. Праўда, доўга шукаў патрэбны матэрыял, нават на дрэваапрацоўчых прадпрыемствах быў, пакуль нарэшце не пачуў жаданыя гукі ад бервяна падчас... колкі яго сякерай. Вось яно, тое, што трэба! А потым падабраў іншую драўніну і — за працу. Умовы, зразумела, не як на фабрыцы музычных інструментаў, яго абсталяванне — гэта нож, рубанак, свярдзёлак... А асноўная сыравіна — елка, клён і ляшчына.

Зрабіў адну скрыпку — узяўся да другую, потым яшчэ... Адну з мадэляў, якая па форме нагадвае мандаліну, Уладзіслаў Іванавіч убачыў у сне. Такой, кажа, і вырабіў. Дазваляе ён сабе і пэўныя, так бы мовіць, навацыі ў скрыпічнай справе. Аднойчы, калі іграў у мясцовай музычнай школе, у яго пацікавіліся, чаму ў скрыпкі не чатыры, а пяць струн. Аказваецца, дзве струны аднолькавыя спецыяльна — каб было больш гуку.

...Уладзіслаў Будзько бярэ сваю любімую скрыпку, і гучыць марш, які ён калісьці граў на вясковых вяселлях. А потым — мелодыя, пачутая ім, можа, у дзяцінстве ад таго музыкі — калядоўшчыка ў прыгожым строі.

— Скрыпка для мяне — як сяброўка, я з ёй быццам размаўляю і ўсё жыццё пытаюся, што ж у яе гуках, — кажа на развітанне Уладзіслаў Іванавіч. — А яна мне адказвае: «Усё ёсць, толькі не лянуйся шукаць».

Барыс ПРАКОПЧЫК.
г. Смаргонь.

Бяспека на дарозе

РАСІЯНЕ СУТЫКНУЛІСЯ

У выніку ўдару двух аўтамабіляў з расійскімі нумарамі два чалавекі загінулі.

21 жніўня, у нядзелю, паблізу вёскі Вараніно Быхаўскага раёна ўдзень сутыкнуліся іншамаркі. На гэтым участку дарогі, якая звязвае беларуска-расійскае і беларуска-ўкраінскае памежжы, часта здараюцца аварыі. Жыхарка Санкт-Пецярбурга, якой 34 гады, кіравала аўтамабілем «Дэу Нэксія» і выехала на палосу сустрэчнага руху для абгону. Гэтым часам насустрач ехаў «Нісан Х-Трайл». У адно імгненне аўтамабілі сутыкнуліся і апынуліся ў кюветы.

Фота Магілёўскай ДАІ.

«Нісан» перакуліўся некалькі разоў. Адзін з пасажыраў гэтага аўтамабіля, 34-гадовы жыхар Санкт-Пецярбурга, загінуў на месцы. Вадзіцель і трое пасажыраў (27, 24 і 11 гадоў) атрымалі сур'ёзныя траўмы і былі шпіталізаваны ў раённую бальніцу. Не прайшло і сутак з моманту аварыі, як адзін з пасажыраў, 24-гадовы мужчына, так і не апрытомнеўшы, памёр. Вадзіцель і пасажыры «Дэу» не пацярпелі, толькі сам аўтамабіль атрымаў механічныя пашкоджанні.

Ілона ІВАНОВА.

ШЭСЦЬ ЧАЛАВЕК АТРЫМАЛІ РАНЕННІ ПРЫ ПЕРАКУЛЬВАННІ МІКРААЎТОБУСА

Шэсць чалавек атрымалі раненні пры перакульванні мікрааўтобуса ў Шчучынскім раёне Гродзенскай вобласці, паведамілі БЕЛТА ва УДАІ МУС Беларусі.

ДТЗ адбылося паблізу вёскі Вялікія Бярэзаўцы на дарозе Астрына — Ваўкавыск. За рулём мікрааўтобуса Mercedes Sprinter сядзеў мужчына 1979 года нараджэння. Праехаўшы закругленне дарогі, вадзіцель не справіўся з кіраваннем. Мікрааўтобус занесла, і ён з'ехаў у кювет, а потым перакуліўся. У выніку пацярпелі шэсць пасажыраў: 1979, 1978, 1982,1983, 1986 і 1989 гадоў нараджэння. Усе яны былі дастаўлены ў бальніцу.

Аварыя адбылася ў светлы час сутак, асфальтавае пакрыццё было мокрае. Магчыма, прычынай ДТЗ стала перавышэнне скорасці. У ДАІ адзначылі, што гэты вадзіцель 22 разы прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнні ПДР, у тым ліку хуткаснага рэжыму.

Сталічная «Зорка» адправіцца ў Мадрыд, каб пазмагацца за Кубак Зідана

У выхадныя ў Мінску вызначылася каманда, якая паедзе ад Беларусі ў Іспанію і згуляе на «Санцьяга Бернабеў» у межах футбольнага турніру «Кубак нацый» Данон». Ёй стала «Зорка» сталічнага РЦАП-БДУ, якая ў кастрычніку адправіцца ў Мадрыд на фінал.

Турнір у 12-ты раз праводзіцца сярод 10-12-гадовых футбалістаў, і некаторыя з першых яго ўдзельнікаў ужо падпісалі свае дарослыя шматмільённыя кантракты са славутымі клубамі. Беларусь сёлета ўдзельнічае ў кубку ўпершыню, і за паездку ў Мадрыд змагалася пакуль 8 камандаў, якія прадстаўлялі ўсе рэгіёны.

Фота БЕЛТА.

— Штогод каля 2 мільёнаў дзяцей удзельнічае ў гэтым турніры, і толькі 40 камандаў едуць у Мадрыд. Мяркую, што 9 кастрычніка, калі беларускія хлопцы вернуцца з фіналу, іх будзе з чым павіншаваць, — падзяліўся дырэктар кампаніі «ДанонБел» Эрэн Эйгі. Нагадаем, што пераможца атрымае кубак з рук самога Зінэдзіна Зідана.

— Гэта выдатны дзіцячы турнір, і я бачу, што футбол жывы ў Беларусі. Я бачыў матуль і тат, якія плакалі, бачыў, як плакалі дзеці, якія прапусцілі гол і страцілі шанц паехаць у Іспанію... Я запісаў некалькі імёнаў, і, мяркую, праз 10 гадоў гэтыя футбалісты змогуць гуляць за нацыянальную зборную, — расказаў пасол турніру ў Беларусі, галоўны трэнер зборнай Бернд Штанге.

Арганізатары турніру, а гэта кампанія «ДанонБел» і федэрацыя футбола, абяцаюць больш прадстаўнічы маштаб спаборніцтваў у наступным сезоне, і на свой удзел можа разлічваць любая дваровая дзіцячая каманда.

Алена КРАВЕЦ.

ЦІ СТАНЕ «СПРАВЯДЛІВАСЦЬ» ПАНЯЦЦЕМ АДНОСНЫМ?

З першага верасня пачне дзейнічаць Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. У ім упершыню заканадаўча прапісана пытанне аб дысцыплінарнай адказнасці навучэнцаў. Цяпер ва ўсіх навучальных установах, напрыклад, за спазненні ці няяўку без уважлівых прычын на навучальныя заняткі, парушэнні дысцыпліны падчас урокаў, невыкананне падчас практыкі рэжыму працоўнага часу, невыкананне без прычыны патрабаванняў педагога, а таксама за абразу ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу, псаванне будынкаў або абсталявання ўстановы адукацыі і вядома ж, распіванне алкагольных напояў, курэнне, да навучэнца могуць быць ужытыя заўвага, вымова або адлічэнне. Згодна з Кодэксам, да адказнасці прыцягваецца вучань, які ў момант здзяйснення дысцыплінарнай правіны дасягнуў 14 гадоў. А адлічваць са школы могуць ужо з 16. Што датычыцца вучняў, якія яшчэ не дасягнулі чатырнаццаці гадоў, то з імі за такія правіннасці будуць праводзіць гутаркі, абмяркоўваць на педагагічнай радзе, а таксама праводзіць іншыя меры педагагічнага ўздзеяння, якія не супярэчаць заканадаўству.

Свае думкі пра гэтае новаўвядзенне выказалі настаўнікі, вучні і іх бацькі.

БЯСОНАВА Таццяна Іванаўна, настаўнік пачатковай школы:

— На мой погляд, увогуле амаль усё залежыць ад настаўніка. Справа ў тым, што праблем з вучнямі амаль не ўзнікае, пакуль яны ў пачатковай школе. Калі дзеці пераходзяць у старшыя класы, то ў іх з'яўляецца адразу шмат настаўнікаў. І ў кожнага педагога свой характар, свой светапогляд. Тут дарасламу было б няпроста, а дзецям яшчэ складаней. У аднаго педагога можна сябе так паводзіць на ўроку, іншы прад'яўляе зусім іншыя патрабаванні. Дзецям не заўсёды лёгка падстроіцца да кожнага настаўніка. Усё ж, што ні кажы, улады ў педагога заўсёды было больш, чым у дзіцяці. Выкладчык і адзнаку можа панізіць, і тонка абразіць, а дзіця разбіраецца, як умее, як яго навучылі бацькі і, вядома ж, мы, педагогі.

Вядома, ёсць і «адпетыя хуліганы», але нават у такіх выпадках неабходна сумесная праца і педкалектыву, і бацькоў, а калі ўзнікае неабходнасць — псіхолагаў. У прынцыпе, я стаўлюся станоўча да новаўвядзення, але... калі канфлікты і сапраўды будуць вырашацца па справядлівасці.

Валерыя, вучаніца 11 «А» класа:

— У нас ёсць хлопчык, які ўвесь час спазняецца. Больш за тое, ён вельмі разняволена сябе паводзіць і непаспяховы па некаторых прадметах... Наша класны кіраўнік, калі ён адсутнічае, просіць нас не гаварыць з ім і наогул ігнараваць. Атрымліваецца, што яго могуць адлічыць? Шкада. Мне ён не здаецца зусім нягоднікам. Бывае, што ён нават стараецца, але пры гэтым робіць выгляд, што яму гэта не занадта трэба. Але ніхто з настаўнікаў гэтага не заўважае, яны ў прынцыпе і не чакаюць ад яго нічога падобнага...

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, маці траіх дзяцей:

— Я нават не ведаю, як да гэтага ставіцца. Справа ў тым, што мяне гэта мала тычыцца. Мае дзеці не п'юць, не паляць, не выражаюцца нецэнзурнымі словамі. Акрамя таго, яны не толькі не псуюць абсталяванне, але нават паперкі не кідаюць. А агрызкі калі і кінуць, то так, каб іх відаць не было.

У той жа час і ў маіх дзяцей бываюць канфлікты з настаўнікамі. А калі адміністрацыя школы будзе злоўжываць сваім правам і распраўляцца з непажаданымі ім дзецьмі такім спосабам, то гэта будзе вельмі дрэнна...

Марыя КАВАЛЕЎСКАЯ, дырэктар школы:

— Гэта добра, што такія дысцыплінарныя спагнанні з вучняў зараз прапісаны ў дакументе. На самай справе такая неабходнасць — карыстання спагнаннямі — сустракаецца вельмі рэдка. Хацелася б, каб наогул не было... Я шмат гадоў працую ў школе і ведаю, што ў працэсе працы выпадкі, калі неабходны радыкальныя меры, — адзінкавыя.

Ды і ў іншых школах, мне здаецца, не часта ўзнікаюць падобныя моманты. А калі ўзнікаюць, то, вядома, іх будуць разглядаць у адпаведнасці з Кодэксам. Такі дакумент павінен быць і зараз ёсць, да чаго я асабіста стаўлюся вельмі станоўча.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

ЦЯЖКІ ЧАС — НЕ ПЕРАШКОДА

Пасля нядоўгага перапынку ў Гомелі адкрылася адноўленае аддзяленне паштовай сувязі № 50. Гамяльчане яго добра ведаюць як цэнтральны паштамт і справядліва лічаць, што менавіта тут, у самым сэрцы горада ўсе паслугі аказваюцца на самым высокім узроўні.

Тры месяцы на рамонт — вядома, не той тэрмін, каб занадта хвалявацца, але ж кліенты, якія гэты час абслугоўваліся ў некалькі сціснутых умовах суседняга памяшкання, з самай раніцы першымі прыйшлі ацаніць, наколькі зручна ім будзе тут. І пераканаліся: сапраўды, зручна. Дарэчы, і вельмі прыгожа. Бела-блакітная карпаратыўная колеравая гама не толькі радуе вока, але і супакойвае тых, хто занадта спяшаецца ці хвалюецца. Тым больш што ветлівых усмешак аператараў паштовай сувязі ўсё роўна хопіць усім.

Дзяўчыны ў гэтым аддзяленні апрануты ў форму, спецыяльна пашытую індывідуальна для кожнай — таксама ў бела-блакітным колеры. І справу сваю ведаюць, і добра разумеюць, што прадстаўляюць самае важнае аддзяленне абласнога цэнтра. Дарэчы, яно адно прыносіць прыкладна такі ж прыбытак, як вузел паштовай сувязі ў сярэднім райцэнтры Гомельскай вобласці. Людміла Ткач гэтае аддзяленне ўзначальвае на працягу 15 гадоў. І прызвычаілася да таго, што патрабаванні да яе і супрацоўнікаў — самыя строгія. Але ў гэты дзень усё ж хвалявалася:

— Вельмі прыемна, што мы зноў на сваім месцы. І я вельмі ўдзячная кіраўніцтву, якое знайшло сродкі і паклапацілася, каб мы працавалі ў такім прыгожым і адноўленым памяшканні. Вядома, складана бывае. Пераўзбраенне ідзе інтэнсіўна, праграмы мяняюцца пастаянна, але ж мы імкнёмся ісці ў нагу з часам.

У адноўленым памяшканні асобна знаходзіцца паштовы кіёск, дзе можна набыць і паштовую прадукцыю ў асартыменце, і тавары спажывецкага попыту, і перыядычныя выданні. Тут можна набыць і новае захапленне. Гаварыць, калекцыянаванне марак захапляе адзін раз, але на ўсё жыццё — менавіта маркі ў гэтым кіёску ў вялікай разнастайнасці. Побач знаходзяцца і два плацежна-даведачныя тэрміналы. Па сутнасці, лічаць супрацоўнікі, гэта дадатковыя працоўныя месцы. Бо і прыём плацяжоў, і аплату мабільных тэлефонаў, і нават падпіску можна аформіць праз разумныя машыны.

Дарэчы, на аднаўленне не толькі гэтага аддзялення сувязі сёлета змаглі знайсці сродкі паштавікі Гомельшчыны. **Дырэктар Гомельскага філіяла Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства паштовай сувязі «Белпошта» Галіна ЦЯРЭШЧАНКА** гаворыць, што цяжкі час — не перашкода:

— На гэтае аддзяленне разам з мэбляй і рамонтам выдаткавана каля 300 мільёнаў рублёў. Час цяпер для ўсіх цяжкі, аднак аддзяленне знаходзіцца ў цэнтры горада, побач са знакамітым палацава-паркавым ансамблем, таму яно павінна быць самым прыгожым у горадзе. Мы пастаянна імкнёмся праводзіць рамонты і ў раённых аддзяленнях.

Сапраўды, сёлета ў Гомелі адкрыта аддзяленне сувязі № 46 — у МЖК «Сонечны», праводзяцца рамонты аддзяленняў сувязі па раёнах: у Рэчыцкім, Мазырскім, Светлагорскім, Кармянскім будынкі вузлоў ці аддзяленняў сувязі набылі больш прывабныя фасады. Увогуле ж сёлета ў мадэрнізацыю і пераабсталяванне ўкладзена больш за 1 млрд рублёў сродкаў Гомельскага філіяла Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства паштовай сувязі «Белпошта».

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Начальнік аддзялення сувязі № 50 Людміла Аляксандраўна ТКАЧ.

ТАКІ РОЗНЫ ГОРАД

Фота Пятра ФАМІНА.

Якія ў вас ўражанні, калі вы ўпершыню трапляеце ў незнаёмы дом? Вы заўважаеце пахі дома, фіранкі ў пад'ездзе, драпіны на сценах, «графіці» ў ліфце, кактус на падаконніку. Параўноўваеце гэты дом, з тым, у якім жывяце. Пэўныя дэталі складваюцца ў агульную карціну, вы ўлоўліваеце атмасферу дома. Але розняцца не толькі дамы — свой настрой у розных мясцін аднаго і таго ж горада. У мітусні мы не звяртаем увагі на дэталі, якія распавядаюць пра атмасферу. Атмасферу дворыкаў, раёнаў. Гайда з намі ў пагулянкі! А пачнём мы з самага маладога Мінска.

ЛАСТАЎЧЫНЫ ГНЁЗДЫ

Маладога не толькі таму, што гэты раён зараз актыўна будуецца. Калі пагуляць па Каменнай Горцы, вы заўважыце, што большасць жыхароў — гэта менавіта маладыя сем'і. У час масавых засялення Каменная Горка нагадвае бясконцыя ластаўчыныя гнёзды, у якіх віруе жыццё. Але калі ўжо ў мінулым засталіся разборкі з будаўнікамі (з-за крывых сцен, іржавых люкаў, плям на шпалерах і іншага будбраку), калі паўціхла мітусня, звязаная з абсталяваннем тых самых «гнёздаў», у мікрараёне пачынаецца сваё размеранае жыццё, можа, нават і больш шчаслівае, чым у іншых куточках Мінска. Ці з-за таго, што ўсе жыхары нарэшце абзавяліся ўласным жыллём, а мо таму, што тут пераважна атабарыліся маладыя энергічныя людзі. У навасёлаў нават ёсць свае тусоўкі ў інтэрнэце, дзе яны знаёмяцца, абменьваюцца навінамі, раяцца. Нехта нават вывешвае ў пад'ездзе вершы, дзе віншуе суседзяў з іх агульным святам — датай, калі яны атрымалі ключы ад новых кватэр.

Паступова мясціны, якія яшчэ пару гадоў таму нагадвалі месіва з пяску і камянёў, пакрываюцца травой. Тут нават выраслі дрэвы ў чалавечы рост і вышэй. Прычым выраслі зімой — у маразы мужыкі з дрылямі свідравалі зямлю якую немагчыма было ўзяць нават ломам), каб пасадзіць клёны, каштаны, рабіны і елкі. Маўляў, так расліны лепш прыжываюцца.

Сёння лавачкі ў дварах запоўнены маладымі бацькамі, побач з якімі капошыцца малеча.

Пра дзятву асобная размова. На кожны метр квадратны дворыка тут прыпадае па некалькі хлопчыкаў і дзяўчынак. Асноўныя насельнікі двара — калясачнага, садкоўскага і ўзросту пачатковай школы. Летась у верасні па просьбе жыхароў, якім трэба было кудысьці ўладкаваць сваіх дзяцей, адкрылася школа, якая на той час яшчэ будавалася ў Каменнай Горцы-1. І нават у недабудаванай школе расчынілі свае дзверы 6 першых класаў. А дамы працягваюць засяляцца новымі жыхарамі.

Асноўныя праблемы навасёлаў — уладкаваць малых у садок і патрапіць на прыём да ўрача.

—Да педыятра чэргі круглы год, прыём дзяцей — хутчэй, фармальнасць, для таго, каб выдалі ці працягнулі бальнічны лісток, бо, калі нарэшце трапляеш у кабінет да доктара, разам з табой там знаходзіцца яшчэ 3-4 чалавекі. Як тут можна паслухаць дзіця? А калі мы выклікаем доктара на дом, яна на нас лаецца, чаму мы яе патурбавалі: маўляў, збівайце тэмпературу і ідзіце на прыём у паліклініку, — скардзіцца Алена Ваўчкова.

— Вясной пайшлі падаваць дакументы ў адзін з бліжэйшых садкоў, там зірнулі ў пашпарт на нашу прапіску і проста прагналі, таму што мы з мікрараёна Каменная Горка. Так і сказалі: «Ды хто вы такія, каб вам месца ў садку выдзялялі — тут людзі гадамі ў чарзе стаяць!» — пачула я ад Настассі Вашкевіч.

Уявіце ўнутраны дворык, вакол якога чатыры шматпавярховыя дамы. З аднаго боку, такая планіроўка зручная: бацькі могуць назіраць за сваімі дзецьмі, не выходзячы з дома, проста праз акно. Ды і малым — заўсёды кампанія. Але гасцьці масавае збіранне дзяцей і раздражняе.

— Акустыка такая, што ў кватэрах заўсёды чутны гэты піск, не магу пакласці спаць немаўля, — заўважыла адна з новаспечаных мам. Яна ж лічыць, што пры планіроўцы дзіцячых пляцовак павінны ўсё ж рабіць асобныя зоны выключна для тых малых, што толькі пачынаюць хадзіць і размаўляць, бо гульні ў агульнай пясочніцы небяспечныя для самых маленькіх: старэйшыя дзеці ідуць на вуліцу і з кашлем, і з насмаркам.

Некаторыя жыхары новага Мінска ўжо спрабуюць рабіць прагнозы, што будзе тут, калі ўся гэтая дзіцячая «армія» падрасце. І калі ў раёне не будзе створана належнай інфраструктуры, калі чымсьці заняць дзяцей і падлеткаў, невядома ўва што ператворацца гэтыя пакуль спакойныя, напоўненыя дзіцячым піскам вуліцы.

Яшчэ адна з праблем, на якую скардзяцца навасёлы, — недахоп магазінаў. А ў тых, што ёсць, вялікія чэргі і не такі выбар тавараў, як хацелася б. Прычым некаторыя жыхары заўважаюць, што на асобныя тавары тут цэны могуць быць вышэйшымі, чым на такія ж у цэнтры Мінска.

Нягледзячы на тое, што тут ходзіць шмат транспарту, людзі апасаюцца, што праз некаторы час адсюль «выбірацца ў горад» будзе праблемай.

— Ужо зараз з другой веткі метро вагоны ідуць запоўненымі на працягу ўсяго часу — ці то ў 6 раніцы, ці то ў 23 гадзіны на прыпынку «Каменная Горка» людзей не менш, чым на «Кастрычніцкай» ці «Купалаўскай», а будоўля працягваецца. Шчыльная штампоўка высотак — не лепшае рашэнне для забудовы горада. Гэта прысуд людзей на пажыццёвыя чэргі ў крамах і паліклініках, недахоп садкоў і перапоўненыя школы, — упэўнены Міхаіл Лосеў. — І зусім не вырашаецца праблема з уласным транспартам — паркоўкі ля дамоў не разлічаны на тую колькасць жыхароў, што пасяліліся ў высокіх дамах. І нават на стаянкі, што вынесены за межы двароў, часам не ўшчамілца. Як вынік — машыны стаяць на пешаходных сцежках і на газонах.

«Нашэсце» машын — гэта тое, на што скардзяцца і многія маладыя мамы. Тыя, якім узімку давялося пабегаць з каляскай (ды яшчэ пад суправаджэнне — «бібіканне» аўто) па праезнай частцы, таму што пешаходныя сцежкі былі застаўленыя аўтамабілямі (а навокал — вялікія гурбы снегу), прапануюць экстрэмальныя меры барацьбы. Напрыклад, выклікаць эвакуатары на машыны, прыпаркаваныя там, дзе не трэба; уводзіць правілы, каб у дварах ставілася не больш чым адна машына на сям'ю альбо ўводзіць падатак на паркоўку ў жылой зоне...

Шмат нараканняў таксама на якасць вады: людзі скардзяцца, што яна не прыгодная не толькі для гатавання (таму многія проста жывуць на бутыляванай вадзе), але і для гігіенічных працэдур (пасля ванны з такой вадой пачынаюцца праблемы са скурай).

Скаргі можна збіраць і далей, прычым сярод іх і тыя што тычацца як забудовы раёна, так і планіроўкі кватэр. Так, многія не разумеюць, чаму сушка ў ванне размяшчаецца над умывальнікам (а куды вешаць люстэркі)? Альбо лічыльнік газу размешчаны на сцяне за паўметра ад падлогі (можа, гэта спецыяльна для таго, каб даць «газавікам» зарабіць, калі яны будуць яго пераносіць у больш зручнае для жыхароў кватэр месца?). І чаму, калі дворыкі пачынаюць жыць сваім жыццём, не ўносяцца ніякія карэкціроўкі ў планы? Наогул было саджаць кусты туды, дзе пачалі паркавацца аўтамабілі; ці ля горак, дзе малыя катаюцца на санках, — калі і «вожыку зразумела», што насаджэнні будуць знішчаны? А сапраўды, ці раіцца хто-небудзь з жыхарамі новабудоўляў, ці цікавіцца, як яны абжыліся на новым месцы, ці правадзяцца апытанні, анкетаванні людзей? Хоць бы для таго, каб улічыць іх прапановы, калі будуць стварацца новыя планы па забудове горада?

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Вам слова!

Што вас здзівіла ў Мінску?

Міхась КАВАЛЁЎ: «Здзівіла, што Мінск даволі «не абжыты» горад, — я ў тым сэнсе, што тут яшчэ дастаткова закінутых будынкаў. Чуў нават, што на вуліцы Кальварыйскай пад зямлёй знаходзіцца недабудаваны вялікі гандлёвы цэнтр. А яшчэ здзіўляе, наколькі людзі нічога не ведаюць пра свой горад. Вы нават у людзей, што пражываюць на пэўнай вуліцы, запытайцеся, чаму яна так называецца, — наўрад ці атрымаеце адказ».

Вольга ГРАЧОВА: «У Мінску жывуць лятучыя мышы! Іх можна пабачыць у дворыку політэхнічнага ўніверсітэта. Некаторы час я са сваім сябрам спецыяльна хадзіла туды пацікаваць за мышамі».

Алесь ЕГОРАЎ: «Уразіла, як утойваюцца цікавыя рэчы. Хто ведае пра тое, што ў Мінску ёсць маятнік Фуко? Ён знаходзіцца ў Беларускім дзяржаўным педуніверсітэце. І ўражанне, быццам яго спецыяльна ўбралі далей з вачэй. А да яго і экскурсіі вадзіць можна. Такіх аб'ектаў у свеце набярэцца каля дваццаці».

Ірына БУДНІК: «У Мінску цяжка не заблукаць. Шмат вельмі падобных вуліц, на якіх нават магазіны з аднолькавымі назвамі. А вы паспрабуйце адшукаць вуліцу, што носіць імя, напрыклад, Маневіча, Папаніна, Сярова, Солтыса, Бірузова і гэтак далей. Тут без карты не разбярэшся. А паспрабуй у каго выведай, дзе гэта. Гараджане ж ў стане запомніць усе гэтыя прозвішчы невядомых ім людзей. Яшчэ ў горадзе шмат рэчаў, якія ўводзяць у зман. Так, калі мне трэба на вуліцу Кунцаўшчына, я натуральна, у метро выйду на прыпынку з такой жа назвай, а не паеду далей, да станцыі «Каменная Горка». Ці чаму станцыя метро «Маскоўская» знаходзіцца ў адным баку, а вуліца Маскоўская ў іншым? Ды з нумерацыяй дамоў колькі блытаніны. Напрыклад, каб знайсці патрэбны вам дом на вуліцы Солтыса, давядзецца паблукаць».

Уладзімір МУРАШКА: «Мне шкада Траецкага прадмесця. Паглядзіце на яго з боку ўзбярэжжа. Зараз побач з Траецкім будуецца высокі жылы дом. На мой погляд, дзіўна, як такую будоўлю можна было распачаць побач з Траецкім прадмесцем — сэрцам, сімвалам Мінска! Наколькі я ведаю, у Англіі ёсць абмежаванні па памерах новых будынкаў, якія ўзнікаюць у мясцінах са старой, гістарычнай забудовай. А тут такая будоўля побач з Траецкім! Яна «забівае» прадмесце. Калі раней у мяне было адчуванне, што гэта кавалак старога горада, дык цяпер няма. Траецкае быццам рэзка абрубілі, заціснулі, «прынізілі». Наогул, гляньце, што такое Няміга. Калі гэта гістарычны цэнтр, чаму тут не ствараюцца помнікі, аб'екты, дзе б абыгрывалася менавіта гэтая тэма? Чаму побач са Свіслаччу стаіць помнік Пушкіну, а не кампазіцыя, звязаная з бітвай на Нямізе? І як з Траецкім прадмесцем спалучаецца Востраў слёз? Якая логіка ў аздабленні гістарычнага цэнтра, у суседстве з рэчамі, якія не спалучаюцца. На мой погляд, нельга такую мешаніну дапускаць там, куды возяць усіх турыстаў, знаёмяць з нашым горадам».

Артур БЕСТЫБАЕЎ (госць з Казахстана): «Што амаль кожная другая дзяўчына ў Мінску вышэй за мяне ростам. Я лічыў сябе высокім чалавекам (метр 78 сантыметраў), сустрэць дзяўчыну з мяне ростам у Казахстане складана. А тут ўсе дзяўчаты высокія. І яшчэ ўразіла, калі даведаўся, што далікатныя, худзенькія дзяўчаты працуюць на заводах, стаяць за станкамі, цягаюць на сабе цяжкія рэчы. Мне падалося, у Мінску слаба развіта сетка з рэстаранамі і кавярнямі. У пятніцу ўвечары патрапіць кудысьці паесці даволі складана, няма свабодных месцаў».

Таццяна МАКАРАВА: «Усё ўражвае. Я 10 гадоў не была ў Мінску. І зараз адчуванне, што хаджу зусім па іншым горадзе, — тут столькі ўсяго пабудавана! І людзей стала значна больш у параўнанні з тым, што было 10 гадоў таму, — у метро не ўлезці. А яшчэ тут амаль не ўсміхаюцца, нават моладзь. Вунь парачка ідзе. Хлопец дзяўчыне букецік з рамонкаў падарыў. Маладыя, спатканне ў іх, надвор'е добрае, а твары ў абодвух, быццам на вайну сабраліся. Гэта і здзіўляе: чаму горад, дзе так шмат моладзі, такі сумны? Мінчане, усміхайцеся часцей!»

ВУЛІЧНЫХ ГАНДЛЯРОЎ КАРАЮЦЬ РУБЛЁМ

З вулічнымі гандлярамі, якія рэалізуюць мінакам проста з «асфальту» прадукты харчавання, змагаюцца і міліцыя, і санстанцыя, і падатковая...

Тыповы прыклад. У Віцебску ля прадуктовай крамы жанчына, не з'яўляючыся індывідуальным прадпрымальнікам, без афармлення ўсіх неабходных дазволаў рэалізоўвала харчовыя тавары: кансервы, макарону і іншае. Тавар прывезла на «Мерседэсе». Падчас рэйду супрацоўнікі падатковай спынілі несанкцыянаваны гандаль. Тавар быў канфіскаваны, а на аўто коштам 100 мільёнаў рублёў быў накладзены арышт. Прадпрымальную гандлярку аштрафавалі на 100 базавых велічынь, а гэта аж 3,5 мільёна рублёў. Добра, што аўто не канфіскавалі, а маглі б. У адрозненне ад тавару — яго канфіскавалі на суму ўсяго толькі 32,5 тысячы рублёў. І трэба было дзеля гэтага рызыкаваць?

Толькі ў Чыгуначным раёне Віцебска — адным з трох у абласным цэнтры — у першым паўгоддзі аналагічным чынам супрацоўнікі падатковай склалі каля дзевяноста пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях. Канфіскавалі тавару агульным коштам больш як на 126 мільёнаў рублёў. Пра тое, што куплянымі з асфальту прадуктамі можна лёгка атруціцца, бадай, нагадаць не будзе лішнім. А вы яшчэ гандлюеце? І купляеце?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Крымінал, здарэнні

НЕ ЗМАГЛА ЎТРЫМАЦЦА

52-гадовая жанчына ўкрала тэлефон у дзяўчынкі

— Я не змагла ўтрымацца, каб не ўкрасці, — растлумачыла аператыўнікам свае дзеянні 52-гадовая мінчанка, прадаўшчыца аднаго з рынкаў сталіцы, калі яе затрымалі за кражу мабільнага тэлефона.

Жанчына прывяла ўнучку ў танцавальны кружок і вырашыла пачакаць яе ў гардэробе. У гэты час у адной з шафаў зазваніў тэлефон. Жанчына дастала яго з заплечніка наведніцы гуртка і паклала ў сваю кішэню.

— Калі ў раздзявальню вярнуліся дзеці, адна з дзяўчынак спытала прысутных, ці не бачыў хто яе тэлефона. Клапатлівая бабуля нават прапанавала дзяўчынцы сваю дапамогу ў пошуках, аднак знайсці мабільнік так і не ўдалося, — паведамілі ў Партызанскім РУУС.

Дома жанчына дастала чужую сім-картку і некалькі месяцаў тэлефонам не карысталася. А калі ўставіла сваю сім-картку, ёй патэлефанавалі з міліцыі...

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ЗЛАДЗЕІ НА «ВОЛЗЕ» ДАЛЁКА НЕ З'ЕХАЛІ

18 жніўня а палове на 5-ую гадзіну ў Магілёве ад супрацоўнікаў ДАІ паступіла паведамленне аб тым, што на вуліцы Крупскай быў выяўлены аўтамабіль «Волга», які ўцякаў ад пагоні.

Супрацоўнікі аховы заўважылі «Волгу», якая павольна рухалася да выезду. Аўтамабіль здаўся падазроным, і яго вырашылі спыніць. У салоне былі чацвёра маладых людзей, якія паводзілі сябе спакойна, але дакументаў на транспарт не прад'явілі, ды і ў багажніку знайшліся запчасткі і розныя рэчы. Як далей высветлілася, зладзеі праламалі дах у адным з гаражоў, каб скрасці аўтамабіль.

Алена КАЗЛОВА.

НАЧНЫ ПАЖАР З ЭВАКУАЦЫЯЙ

У Ваўкавыску падчас начнога пажару былі эвакуіраваны 45 чалавек, з іх сем дзяцей.

Каля дзвюх гадзін ночы пра здарэнне па тэлефоне 101 паведаміў сусед: у кватэры на трэцім паверсе пяціпавярховага шматкватэрнага жылога дома па вуліцы Зенітчыкаў было задымленне. У ёй пражывала дачка гаспадара, якая да прыбыцця падраздзялення МНС самастойна выйшла на вуліцу. А вось астатніх жыхароў давялося эвакуіраваць ужо выратавальнікам. Мяркуецца, што прычынай здарэння стала кароткае замыканне электраправодкі. Падчас пажару знішчана маёмасць у пакоі, пашкоджаная аддзелка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СКРАЛІ 300 ЛІТРАЎ ПАЛІВА

У Аршанскім раёне ля вёскі Хадулы падчас правядзення аператыўна-пошукавых мерапрыемстваў супрацоўнікі міліцыі затрымалі двух мужчын, якія скралі 300 літраў дызельнага паліва. У дачыненні да 29- і 28-гадовага беспрацоўных заведзены крымінальныя справы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДОЎГА НЕ ШУКАЛІ

Невядомы разбіў бакавое шкло ў аўтамабілі «Форд», які стаяў каля дома па вул. Наканечнікава ў Баранавічах, і ўкраў магнітолу ды два люстэркі заднягa віду. Міліцыя прыехала са службовым сабакам, які ўзяў след і прывёў у кватэру, што знаходзілася ў гэтым жа доме. 17-гадовага злодзея пасадзілі ў ізалятар.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПАРАЛЕЛЬНА ЗАКУПАЎ І МЕТАЛ

Супрацоўнікі аддзела па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Аршанскага раённага аддзела ўнутраных спраў склалі адміністрацыйны пратакол у адносінах да 42-гадовага грамадзяніна, які, працуючы нарыхтоўшчыкам прадуктаў і сыравіны аддзела нарыхтовак РайПА, ажыццявіў закупку ў насельніцтва звыш 11 тон лому чорнага металу. Кошт «левага» лому — 22,4 мільёна рублёў. Высветлілася, што метал здавалі жыхары Талачынскага раёна. Адпаведныя ведамасці на закупку не афармляліся. Метал канфіскавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

БЕСПРАЦОЎНЫ «ПАЛЯВАЎ» НА МАЁМАСЦЬ ОФІСНЫХ СЛУЖАЧЫХ

У Мінску затрыманы 35-гадовы мужчына, які здзяйсняў крадзяжы з офісаў.

— Як правіла, мужчына заходзіў у будынкі з офіснымі памяшканнямі і адчыняў дзверы кабінетаў. Калі гаспадароў на месцы не аказвалася, ён карыстаўся момантам і краў сумкі з асабістымі рэчамі, — расказала прэс-афіцэр Савецкага РУУС Мінска Вольга Яскевіч.

Установлена 8 падобных эпізодаў, але аператыўнікі мяркуюць, што гэта не канчатковая лічба.

Алена КРАВЕЦ.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 23 сентября 2011 года в 16.30 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования, условия продажи	Кадастровый номер	Стоимость землеустроительного дела (руб.)	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Крупской в районе кладбища	0,0039	2 года	установка и обслуживание павильона по оказанию ритуальных услуг	740100000002005657	1 175 778	673 000	61 000
№ 2	улица Крупской в районе остановки «Улица Кирова» (от центра)	0,0030	2 года	установка и обслуживание торгового павильона по продаже печатных изданий и розничной торговли	740100000002005656	1 187 964	636 000	57 000
№ 3	улица Челюскинцев в районе остановки «ОАО «Могилевский ремонтный завод» (в центр) (ограничения – р. Днепр)	0,0030	2 года	установка и обслуживание торгового павильона по продаже печатных изданий и розничной торговли	740100000003006065	1 187 964	489 000	44 000
№ 4	в районе Чаусского шоссе	0,6403	50 лет	строительство и обслуживание административно-производственного здания со складскими помещениями	740100000007005056	1 416 971	179 737 000	16 176 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

Заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка (задатков)** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета **№ 3641017440554** в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж).

Юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Иностранные юридические лица: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения, также документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованными в установленном порядке переводами на белорусский (русский) язык.

Представители иностранного юридического лица или гражданина: легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

Граждане и субъекты хозяйствования, желающие участвовать в аукционе в отношении **нескольких предметов** аукциона, вносят **задатки** в размере, установленном **для каждого из этих предметов аукциона**.

1) Условия инженерного развития инфраструктуры: земельные участки расположены на застроенной территории, в непосредственной близости имеются инженерные коммуникации, земельный участок для нового строительства – в соответствии с проектно-сметной документацией.

2) Условие проведения аукциона – наличие не менее двух участников.

3) Условие предоставления земельных участков в аренду: согласование типа киоска, павильона с управлением архитектуры и градостроительства Могилевского горисполкома.

4) Порядок осмотра на местности земельных участков: выезд по желанию, предварительное ознакомление с земельно-кадастровой документацией всем желающим.

5) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона**, в том числе **расходы**, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона (на всех победителей) составляет 9 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 19.09.2011 года до 15.00**.

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

№ лота	Наименование объекта/Краткая характеристика объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб. без НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Здание специализированное складов** Одноэтажное бревенчатое здание с подвалом общ. площадью 494,0 кв.м.	222 362 990	22 236 299

Продавец имущества: Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Железнодорожного района, адрес объекта: **г. Гомель, ул. Шилова, д. 20, к. 3.** Шаг торгов – 5%. Затраты на организацию аукциона оплачивает покупатель.

Срок подачи заявления	**До 17.00 31 августа 2011 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46
Дата, время, место проведения аукциона	**01 сентября 2011 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, Гомельское областное управление Филиала РУП «Жилкоммунтехника» Центр «Белтехинвентаризация»
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012000511012 в ЗАО «ЦептерБанк» ЦБУ 5, БИК 153001820, УНП 807000214
Условие пользования	Объект продается в собственность

Дополнительная информация по тел.: 8 0232 75 06 63 (факс), www.bti.by

Краіна здароўя

Выпуск № 48 (284)

23 ПРОСТЫЯ ПРАВІЛЫ ХАРЧАВАННЯ

Аб здаровым харчаванні мараць многія, але, што менавіта яно з сябе ўяўляе, дакладна сказаць могуць, мабыць, адзінкі. Англійскі журналіст Майкл Полан шмат гадоў спрабаваў вывесці прыблізныя правілы здаровага харчавання, кантактуючы з калегамі, гастраэнтэролагамі, псіхолагамі і дыетолагамі. Вынікам яго пошукаў стала кніга «Правілы харчавання».



Вось некаторыя з асноўных парад...

1 Чым бялейшы хлеб, тым больш шкодна! З пункту гледжання абменных працэсаў нашага арганізма, белая мука мала чым адрозніваецца ад чыстага цукру. Таму не дзіўна, што шматлікія даследаванні пацвердзілі карысць чорнага хлеба: тыя, хто есць у асноўным вырабы з суцэльназерневай сыравіны, жывуць даўжэй і з узростам нажываюць менш хвароб.

2 Не еш сухія сняданкі, якія афарбоўваюць малако або ваду. Мюслі і розныя шматкі хуткага прыгатавання традыцыйна лічацца адным са здаровых варыянтаў сняданку. Але калі пры пападанні ў вадкасць шматкі мяняюць яе колер, ведайце: у іх поўна шкодных дабавак і цукру. Да таго ж, перапрацаваны яны былі так, што страцілі ўсе свае карысныя ўласцівасці.

3 Не еш тое, што не прызнала б ядомым твая бабуля. Харчовая прамысловасць не стаіць на месцы — у выніку паліцы нашых крам забіты тым, у чым нашы продкі нават не пазналі б прадуктаў харчавання. Нам падабаецца, а вось нашаму арганізму — не вельмі.

4 Тое, што выросла ў агародзе, карысней за тое, што зрабілі на заводзе. З гэтым наўрад ці хто-небудзь будзе спрачацца.

5 Ежа праганяе голад, а не нуду. Як ні дзіўна, для многіх з нас прыём ежы часта закліканы зусім не на тое, каб супакоіць адчуванне голаду. Мы ядзім ад нуды, каб правесці час, каб супакоіць нервы і нават каб узнагародзіць сябе за што-небудзь. У выніку стаўленне да ежы як да сродку заахвочвання прывяло да ўзвядзення салодкага і тлустага ледзь ці не ў культ; а «заяданне» стрэсаў і нуды — звычайная справа для сучаснага чалавека.

6 Ежа павінна быць каляровай. Паспрабуйце напоўніць сваю талерку прадуктамі як мінімум 4 розных (лепш — яркіх) колераў — і вы зразумееце, як гэта насамрэч карысна. Па-першае, самымі яркімі НАТУРАЛЬНЫМІ (!) адценнямі валодаюць свежая гародніна і садавіна (у той час як мяса, гарніры і хлеб гэтым пахваліцца не могуць), а па-другое, псіхолагі гавораць, што «рознакаляровасць» у талерцы дапамагае праганяць адчуванне голаду толькі пры адным поглядзе на ежу. Да таго ж спажыванне гародніны рознага колеру гарантуе вам раўнамернае паступленне ўсіх неабходных карысных рэчываў і абароніць ад максімальнай колькасці хвароб.

7 Стаміўся чытаць склад прадукту? Не еш! Чым больш інгрэдыентаў уваходзіць у склад прадукту, тым большую апрацоўку, хутчэй за ўсё, прайшла сыравіна. А значыць, там шмат кансервантаў, падсалоджвальнікаў, араматызатараў і іншых штучных (непатрэбных арганізму) рэчываў.

8 Убачыў «страшныя» словы? Не бяры! Дыгліцэрыды, цэлюлоза, ксантанавая камедзь... Вы што, кладзяце падобнае ў свае хатнія стравы? А калі не, не варта дазваляць хітрым вытворцам падкідваць усе гэтыя незнаёмыя кампаненты ў вашу ежу. Харчавікі ж імкнуцца падоўжыць тэрмін жыцця сваёй прадукцыі і зрабіць яе знешнія якасці больш прывабнымі для спажыўца. А ваша задача — выбраць тое, што не будзе ляжаць у страўніку мёртвым грузам і дасць вам максімум пажыўных рэчываў. Вядома, харчовыя дабаўкі былі ўхвалены ўсялякімі кантрольнымі органамі і быццам бы не наносяць шкоды здароўю, але, з іншага боку, нашы продкі тысячы гадоў у вочы не бачылі ніякай ксантанавай камедзі — і былі цалкам шчаслівыя. Навошта ж ісці насуперак шматвяковым звычкам чалавечай натуры і быць ахвярай рэкламы?

9 Купляй тое, што «схавалі». Большасць супермаркетаў арганізуюць гандлёвую залу такім чынам, што апрацаваныя (замарожаныя, «узбагачаныя», хуткарастваральныя і да т.п.) прадукты выкладзены на цэнтральных прылаўках, а свежае і натуральнае схавана па сценках і кутах.

10 Еш тое, што «паелі» бактэрыі. Уключыце ў свой рацыён прадукты, якія ўжо былі часткова перапрацаваны стрававальнай сістэмай грыбкоў і бактэрый. Напрыклад, кефір, ёгурт, сыр — гэта значыць усё тое, што патрабуе закваскі або браджэння.

11 Не ўсё тлустае шкодна! Перасмажаныя піражкі і чыпсы — гэта адно, а вось тлустая рыба (ласось, фарэль, сёмга) — зусім іншае. Рыбін тлушч багаты на поліненасычаныя тлустыя кіслоты, якія карысныя для сэрца, нервовай сістэмы і крывяносных сасудаў.

12 Не еш таго, што не гніе! Доўгі тэрмін захоўвання, як правіла, сведчыць пра больш высокую ступень апрацоўкі — гэта значыць, па-сапраўднаму пажыўная каштоўнасць прадукту зніжана да мінімуму. Да таго ж у ім, хутчэй за ўсё, шмат кансервантаў і іншых хімікатаў; выключэнне складаюць прадукты браджэння (віны, напрыклад) і мёд, які можа захоўвацца і не псавацца дзесяцігоддзямі.

13 Не давярай пазнацы «абястлушчаны». Адсутнасць тлушчу ў прадукце зусім не гаворыць пра яго карыснасць. Хуткія вугляводы гэтаксама спрыяюць лішняй вазе, але, у адрозненне ад тлушчаў, яшчэ і не праганяюць голад. Між тым, вельмі многія нізкатлушчавыя або абястлушчаныя прадукты дастаткова каларыйныя — тыя ж сухія сняданкі, тваражкі, марожанае і да т.п. Такой штучна абястлушчанай ежай цяжка наесціся, і ў выніку агульная каларыйнасць вашай «дыетычнай» стравы можа быць нават вышэйшай за яе тлусты аналаг.

14 Не спяшайся! Мозгу патрабуецца каля 20 хвілін, каб зразумець, што вы наеліся, і паслаць адпаведны сігнал страўніку. Таму чым марудней вы ясце, тым хутчэй наядаецеся.

15 Правіла булёну. Мясны булён — адна з самых непажаданых страў на вашым стале. Як кажуць спецыялісты, у вадзе вываравоцца ўсе шкодныя рэчывы, якія змяшчаюцца ў мясе, і адно з іх — цяжкі жывёльны тлушч. Менавіта ён спрыяе павышэнню ўзроўню халестэрыну ў крыві, закупорцы сасудаў і наступным інфарктам. Затое суп з агародніны — зусім іншая справа. У ім якраз застаюцца многія пажыўныя кампаненты, якія «выходзяць» з агародніны падчас варэння, таму гэты супчык лепш не зліваць.

16 Купі меншы посуд. Як паказала брытанскае даследаванне пры ўдзеле некалькіх соцень добраахвотнікаў, людзі, проста замяніўшы ўсе хатнія талеркі на меншыя ў дыяметры, пачынаюць есці ў сярэднім на 22% менш.

17 Паважай традыцыі. Японская, французская, грэчаская, італьянская... Спрачацца пра тое, якая з нацыянальных кухняў больш «здаровая», можна доўга. Несумнеўным застаецца адно: любая традыцыйная кулінарыя значна больш карысная, чым сучасная «агульназаходняя» — з сандвічамі, гамбургерамі, смажанымі курынымі крылцамі і газіроўкай. А больш правільна, сцвярджаюць дыетолагі, есці тыя стравы і прадукты, якія лічацца нацыянальнымі ў вашай краіне, у вашым рэгіёне.

18 Ніколі не еш уволю. Жоўжа: наш мозг не адразу разумее, што страўнік на самой справе поўны. Пакладзіце відэлец да таго моманту, як адчуеце, што ў вас ужо «не лезе», і адчуванне сытасці прыйдзе ўжо праз 15—20 хвілін.

19 Не перакусвай на хаду. Амаль усе прадукты, якія прадаюцца ў вулічных палатках, поўныя канцэнтратаў, шкодных тлушчаў і бедныя на пажыўныя рэчывы. Яны падыходзяць для таго, каб проста «пажаваць і заняць рот», але не змогуць здаволіць голад.

20 Шукай кампанію. Даследаванні паказалі, што ў адзіноце чалавек з'ядае больш, чым у кампаніі. Калі вы абедаеце з сям'ёй або, напрыклад, з калегамі, паглынанне ежы перастае быць бяздумным працэсам напаўнення страўніка і ператвараецца ў нейкі рытуал са сваімі правіламі і абмежаваннямі.

21 Тое, што завецца аднолькава на ўсіх мовах, — не ежа! Гаворка ідзе пра бігмакі і чыпсы. Піца і паста, напрыклад, — зусім іншая справа, бо для іх у нас ёсць свае, моўныя аналагі (макарона, адкрытыя пірагі).

22 Няхай ласунак застаецца ласункам. Няма нічога дрэннага ў тым, каб папесціць сябе нейкімі прысмакамі або падсмажаным мясам. Урэшце, жыццё было б сумным і бязрадасным, калі б складалася з адных абмежаванняў. Але пястота павінна заставацца пястотай, і шакаладныя пірожныя лепш есці менавіта па асаблівых выпадках — на свята, у выхадны або на вечарынцы.

Дарэчы, некаторым людзям рэдкія паслабленні ў плане ежы нават дапамагаюць весці здаровы лад жыцця. Шакаладка або піражок раз у два дні матывуюць на заняткі фітнесам (каб скінуць набраныя калорыі) і ў той жа час забяспечваюць пачуццё задаволенасці ежай.

23 Часам правілы можна парушаць! У любым выпадку перагінаць палку не варта. Апанаванасць здаровым харчаваннем адмоўна адаб'ецца на вашым псіхалагічным стане, дадасць стрэсаў, а разам з імі — і праблем са здароўем. Увогуле, ва ўсім патрэбна мера, але, як кажуць, і ў захаванні меры — таксама.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

ВАМ ЦЯЖКА ГЛЫТАЦЬ?

Карысна ведаць

Паспрабуйце разабрацца ў прычынах пры дапамозе такой простай схемы

У вас, акрамя цяжкага глытання, боль у горле або асіпласць голасу...

Хутчэй за ўсё, вашы сімптомы выкліканы віруснай або бактэрыяльнай інфекцыяй. Цяжкасцю глытання можа суправаджацца ангіна, фарынгіт або ларынгіт. Звярніцеся да доктара. Ён абследуе ваша горла, каб вызначыць далейшую тактыку лячэння. Пажадана не курыць, не піць спіртное. Карысныя: цёплае пітво (малако з баржомі), паласканне горла адварам рамонку або шалфею, цёплыя шчолачныя інгаляцыі, сагравальны кампрэс на шыю, гарачыя нажныя ванны.

Вас непакоіць адчуванне спазму або камяка ў горле, якое спалучаецца з пякоткай...

Верагодная прычына гэтага стану — страўнікава-стрававадны рэфлюкс, гэта дысфункцыя стрававальнай сістэмы. Кіслае змесціва страўніка трапляе назад у стрававод, паколькі не адбываецца нармальнага скарачэння мышцы-сфінктара. Звярніцеся да доктара. Ён, хутчэй за ўсё, параіць спецыяльныя лекі. Звычайна прызначаюцца супрацькіслотныя прэпараты і сродкі, якія рэгулююць прасоўванне ежы па страўнікава-кішачным тракце, напрыклад, маціліум. Старайцеся есці часта, але невялікімі порцыямі.

Адчуванне камяка ў горле і цяжкае праглынанне сліны ўзнікаюць незалежна ад прыёму ежы...

Падобныя сімптомы часта звязаны са стрэсам і трывогай. Паспрабуйце выкарыстаць фізічныя практыкаванні, масаж, глыбокае дыханне. Прыміце 30 кропляў настойкі сардэчніку, 1 ч. лыжку «Нова-Пасіту» або 30 кропляў валакардзіну. Калі цяжкае глытанне працягвае вас турбаваць, звярніцеся да доктара.

Вы часам адчуваеце боль у грудзях, асабліва калі нагінаецеся...

Магчыма, у вас дыяфрагмальная грыжа, верагоднасць гэтага стану павялічваецца, калі ў вас лішняя вага. Калі ў вас атлусценне, неабходна пахудзець. Гэта абавязкова аблегчыць стан. Трэба есці часта, але невялікімі порцыямі. Старайцеся не нагінацца пасля яды, не насіце цесныя паясы або гарсэты. У цяжкіх выпадках дыяфрагмальную грыжу ўстараняюць хірургічна.

У вас павялічана ў аб'ёме пярэдняя частка шыі...

Магчымая прычына цяжкага глытання — вальяк, павелічэнне шчытападобнай залозы. Калі непакояць моцная слабасць, пахудзенне, сэрцабіцце — хутчэй за ўсё, шчытападобная залоза выпрацоўвае лішак гармонаў. Пры недахопе гармонаў, наадварот, часцей бывае павышаная адчувальнасць да холаду, сухасць скуры, павелічэнне вагі, стамляльнасць. Звярніцеся да доктара. Пацвердзіць або выключыць захворванні шчытападобнай залозы можна пры дапамозе аналізаў.

Цяжкасць пры глытанні паступова ўзмацняецца, вы пахудзелі больш, чым на 5 кг за апошнія 10 тыдняў...

Прычынай гэтых сімптомаў, хоць з невялікай верагоднасцю, можа быць пухліна стрававода. Тэрмінова звярніцеся да доктара. Ён накіруе вас на патрэбныя даследаванні. Своечасова пачатае лячэнне пухліны павышае шанцы на выздараўленне.

Вы нядаўна перанеслі парушэнне мазгавога кровазвароту — інсульт...

Інсульт у раннія тэрміны нярэдка суправаджаецца парушэннямі глытання. Звычайна гэтыя праявы паступова знікаюць пры правільна падабраным медыцынскім лячэнні.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Да ведама

Далей ад дызельных выхлапаў!

ХІМІЧНЫЯ часцінкі, якія змяшчаюцца ў выхлапных газах ад дызельных рухавікоў, могуць павысіць рызыку сардэчнага прыступу. Пры ўдыханні пароў узрастае таксама верагоднасць утварэння згусткаў крыві ў артэрыях, а, як вядома, такія тромбы часта прыводзяць да інсульту.

Група вучоных з універсітэта Эдзінбурга вымярала ўздзеянне выхлапных газаў дызельных рухавікоў на камандзе абсалютна здаровых добраахвотнікаў. Падчас даследавання валанцёраў падвяргалі такому ж узроўню канцэнтрацыі выхлапных газаў, які рэгіструецца ў цэнтральных раёнах моцна забруджаных гарадоў.

Змены ў арганізме, што адбываюцца пры ўдыханні шкодных рэчываў, такіх як вокіс вугляроду і двухвокіс азоту, якія змяшчаюцца ў газах дызельных аўтамабіляў, былі супастаўлены з рэакцыяй на малюсенькія хімічныя часцінкі, таксама знойдзеныя ў дызельным выхлапе. Як высветлілася, менавіта мікраскапічныя часцінкі, а не самі газы, выклікаюць парушэнні функцыі крывяносных сасудаў. Такія часцінкі ствараюць малекулы з высокай рэакцыйнай здольнасцю (так званыя свабодныя радыкалы), якія могуць траўмаваць крывяносныя сасуды і прывесці да сасудзістых захворванняў.

Цяпер супрацоўнікі ўніверсітэта занятыя пошукам тых хімічных рэчываў, якія «перавозяць» на сабе гэтыя часцінкі. Ядавітыя рэчывы, якія падарожнічаюць на мікрачасцінках, аказваюць найбольш шкоднае ўздзеянне на чалавечы арганізм. У будучыні такія хімічныя рэчывы, магчыма, удасца выдаліць з дызельнага паліва і такім чынам прадухіліць небяспечныя наступствы для здароўя. Як правіла, падобныя часцінкі, таўшчыня якіх не перавышае аднаго мікрона, могуць быць выдалены з выхлапных газаў шляхам установкі спецыяльных фільтраў на выпускных сістэмах ТС.

Пакуль жа можна толькі параіць людзям з захворваннямі сэрца пазбягаць працяглага знаходжання ў месцах, дзе ўзровень забруджвання атмасферы аўтавыхлапамі высокі, напрыклад, паблізу дарог з інтэнсіўным рухам.

Клізма прыводзіць да смерці?

АМЕРЫКАНСКІЯ навукоўцы прыйшлі да высновы, што ніводзін з метадаў ачышчэння кішэчніка не прыносіць вялікай карысці, затое ў іх шмат пабочных эфектаў.

Даследчыкі з Джорджтаўнскага ўніверсітэта ў акрузе Калумбія вывучылі 20 работ аб клізмах за апошнія 10 гадоў. Яны прыйшлі да высновы, што клізмы прыносяць зусім невялікую карысць у параўнанні з той шкодай, якую тоіць у сабе прамыванне кішэчніка. Вада вымывае карысную мікрафлору з кішкі, што можа прывесці да ванітаў, сутаргаў, сіндрома лянівага кішэчніка. У медыцынскай перыёдыцы нават апісаны выпадкі з лятальным зыходам, калі ачышчэнне кішэчніка прыводзіла да такіх цяжкіх наступстваў, як паветраная эмбалія (закупорка крывяносных сасудаў пухірамі паветра), вострая недастатковасць кровазвароту і інш.

Навукоўцы лічаць, што гідракалонатэрапію ў ЗША праводзяць медыкі без неабходнай кваліфікацыі. Гэтую працэдуру можна зрабіць літаральна ў кожным медыцынскім цэнтры і SPA-салоне. Пры гэтым спіс немачаў, ад якіх «ратуе» клізма, вялізны: тут і ачышчэнне ад шлакаў, пахудзенне, цэлюліт, дрэнны імунітэт.

Хочаце адчуваць сябе добра? Захоўвайце правільны рацыён, займайцеся фізічнымі практыкаваннямі, спіце 6—8 гадзін і наведвайце доктара рэгулярна, раяць аўтары даследавання. А вось ачышчэнне кішэчніка ўхвалена імі толькі па прызначэнні ўрача для падрыхтоўкі гэтага органа да дыягнастычных і хірургічных умяшанняў.

Да бескарысных «ачышчальных» працэдур з кароткачасовым эфектам даследчыкі таксама аднеслі ўжыванне лаксатываў (слабіцельныя прэпараты) і слабіцельнай гарбаты. Некаторыя травяныя зборы для ачышчэння кішэчніка выклікалі анемію і парушэнне працы печані.

Сябруйце з калегамі і... жывіце даўжэй

ДОБРЫЯ адносіны з калегамі павялічваюць працягласць жыцця, лічаць вучоныя Тэль-Авіўскага ўніверсітэта.

Мы праводзім большую частку нашага жыцця на працы, таму ў нас няма часу на сустрэчы з сябрамі. Праца павінна стаць месцам, дзе людзі могуць атрымаць эмацыйную падтрымку, лічаць аўтары даследавання.

Навукоўцы вывучылі звесткі медыцынскіх картак 820 супрацоўнікаў розных арганізацый ва ўзросце ад 25 да 65 гадоў, якія праводзілі на працы ў сярэднім 8,8 гадзіны на працягу 20 гадоў. Людзі з меншай сацыяльнай падтрымкай на працоўным месцы паміралі ў 2,4 раза часцей. Сацыялізацыя ацэньвалася па водгуках калег і начальства. З 820 чалавек загінулі 53, у апошніх былі самыя дрэнныя адносіны з калегамі.

Добры мікраклімат прыводзіць да павелічэння прадукцыйнасці працы. Аднак многія працадаўцы абмяжоўваюць доступ да сацыяльных сетак і прымушаюць работнікаў выкарыстоўваць для зносін электронную пошту, у той час як сустрэчы ўжывую былі б больш эфектыўнымі, лічаць даследчыкі. Яны прапануюць выкарыстоўваць для сустрэч сталікі на кухні офіса, дзе можна выпіць кавы і пагутарыць, сацыяльныя сеткі накшталт Facebook. Інакш кажучы, можна выкарыстоўваць усё, што палепшыць эмацыйны стан работніка.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

ЗАЙМАЙЦЕСЯ СЭКСАМ І ПА КАХАННІ, І НА ЗДАРОЎЕ

НАВУКОЎЦЫ не стамляюцца паўтараць, што людзям варта рэгулярна займацца сэксам. Брытанскі часопіс палавой медыцыны расказаў пра апытанне мужчын і жанчын, якое выявіла галоўныя плюсы сэксу. Іх аказалася шэсць.

1. Сэкс папярэджвае імпатэнцыі і трэніруе сардэчную мышцу. Пажылыя мужчыны, якія мелі на працягу жыцця рэгулярныя сэксуальныя кантакты, у 3 разы радзей пакутуюць ад праблем з сэрцам і патэнцыяй у старэйшым узросце. Навукоўцы падлічылі: калі займацца сэксам тры разы на тыдзень і часцей, то верагоднасць інфаркту і інсульту зніжаецца ўдвая.

2. Сэкс пазбаўляе ад стрэсу і дэпрэсіі. Асабліва гэта актуальна для жанчын. Гармон прастагландзін, які змяшчаецца ў семені, пранікаючы ў жаночыя палавыя шляхі, ураўнаважвае вытворчасць жаночых гармонаў, засцерагае ад гарманальных выбухаў.

3. Добры сэкс — выдатная фізічная трэніроўка.

4. Рэгулярны сэкс умацоўвае імунітэт, дзякуючы выпрацоўцы імуноглабуліну А. У людзей, якія займаюцца сэксам мінімум адзін раз на тыдзень, узровень антыцелаў імуноглабуліну павышаецца на 30% — а менавіта ж антыцелы робяць імунную сістэму мацнейшай.

5. Актыўнае палавое жыццё амалоджвае арганізм вонкава і знутры. Ад заняткаў сэксам павялічваецца хуткасць цыркуляцыі крыві і, адпаведна, узмацняецца кіслародны абмен у тканках. Менавіта гэта тлумачыць, што пасля сэксу мы нібыта свецімся знутры.

6. Як вызначылі навукоўцы, пры рэгулярных палавых кантактах працягласць жыцця павялічваецца. Гэта і не дзіўна, калі памятаць пра папярэднія пяць плюсоў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Пырскі Святога возера

Дзеці бавяцца на Святым возеры ў вёсцы Слабодка Бешанковіцкага раёна.

Інфарм-укол

Моц валасоў — у медзі

КАБ валасы былі здаровымі, неабходна не толькі правільна падабраць шампунь і бальзам-апалосквальнік, але і звярнуць увагу на харчаванне. Паводле слоў валеолага 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алены ГАРНІЦКАЙ, рэкамендуецца ўключаць у рацыён наступныя прадукты.



Тварог. На сняданак карысны тым, у каго сякуцца валасы. Аддаваць перавагу варта менавіта тварагу, а не глазураваным сыркам, якія хоць і смачныя, але не карысныя.

Рыба. Акрамя бялкоў і вітамінаў змяшчае цынк, які папярэджвае выпадзенне валасоў і з'яўленне ранняй сівізны.

Ялавічына. Змяшчае не толькі бялок і цынк, але і жалеза. Пажадана ўжываць тушанае або варанае мяса.

Аліўкавы алей. Багаты на тлустыя кіслоты амега-3 і амега-6, ад якіх залежыць здаровы выгляд, увільгатненне валасоў і пазногцяў.

Яйкі. Крыніца бялку, які ў першую чаргу неабходны для здаровых і прыгожых валасоў. Ужывайце 2 яйкі на тыдні — у вараным выглядзе або як амлет.

✓Майце на ўвазе, што валасяны фалікул змяшчае вялікую колькасць медзі. І нават часовы недахоп гэтага элемента (з-за недастатковага паступлення з ежай) можа прывесці да сур'ёзных праблем. Менавіта медзь стымулюе работу клетак, якія адказваюць за выпрацоўку пратэіну і калагену, ад якіх залежыць моц і пругкасць. Медзь ёсць у разынках, вішнях, семках.

✓Майце на ўвазе, што рэзкая страта вагі можа прывесці да выпадзення валасоў. Таксама валасам «не падабаецца», калі вы шмат нервуецеся.

Раз на тыдзень можаце рабіць наступную маску:

Змяшайце 2 яйкі з 2 ст. л. аліўкавага алею, дадайце 1 ст. л. мёду. Нанясіце на валасы, надзеньце на галаву поліэтыленавую шапачку, пакіньце на 1 гадзіну. Змыйце цёплай вадой або шампунем.

Па зубах — і паста

КАЛІ вы набываеце зубную пасту, на якой напісана «супрацькарыесная» (яна змяшчае фтарыды натрыю, волава, кальцыю), то вы павінны прыслухацца да меркавання стаматолагаў. Урачы лічаць, што эфект ад выкарыстання такой пасты будзе толькі ў тым выпадку, калі працэдура чысткі зубоў будзе доўжыцца не менш як 5 хвілін.

Нельга захапляцца зубнымі пастамі, асноўным інгрыдыентам якіх з'яўляецца трыклазан, які дапамагае папярэдзіць і вылечыць захворванні парадонту. Не варта злоўжываць і пастамі з хлоргексідзінам, паколькі можа парушыцца смакавая адчувальнасць і пацямнець зубная эмаль. Нельга пастаянна карыстацца і пастамі для адбельвання, бо яны спрыяюць гіперадчувальнасці і не падыходзяць тым, хто пакутуе на хваробы парадонту. Для адчувальных зубоў існуюць пасты з спецыяльнымі кампанентамі (sensitive). Пры наяўнасці тых ці іншых праблем зубныя пасты неабходна падбіраць з удзелам урача-стаматолага. У астатніх выпадках трэба памятаць, што пасты лепей чаргаваць. Досыць эфектыўныя супрацьзапаленчыя пасты з экстрактамі эўкаліпту, мяты, календулы, шалфею і інш. Для штодзённага выкарыстання лепей выбіраць такія, што не з'яўляюцца высокаабразіўнымі, без агрэсіўных кампанентаў. Пры схільнасці да карыесу і парадантыту варта прымяняць раніцай супрацькарыесную пасту, а ўвечары — супрацьзапаленчую.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ДОЎГАЧАКАНЫЯ ДЗЕЦІ ЗАСТРАХАВАНЫЯ АД МНОГІХ ПРАБЛЕМ

БРЫТАНСКІЯ даследчыкі сцвярджаюць, што дзеці, народжаныя ў выніку незапланаванай цяжарнасці, часцей церпяць ад парушэнняў прасторавых і невербальных здольнасцяў, чым іх равеснікі, зачатыя па жаданні бацькоў.

Навукоўцы правялі даследаванне, у ходзе якога ацэньвалі дзяцей, народжаных, на думку іх бацькоў, у нявыгадных умовах ці абставінах, а таксама дзяцей, зачатых у выніку лячэння бясплоднасці. Высветлілася, што ў дзяцей з другой групы адсутнічаюць негатыўныя ўздзеянні, звязаныя з парушэннямі прасторавых і невербальных здольнасцяў. Эксперты патлумачылі, што ў немаўлят, народжаных у выніку штучнага апладнення, больш высокая рызыка ўзнікнення неспрыяльных медыцынскіх наступстваў, такіх як нізкая вага пры нараджэнні, заўчасныя роды, прыроджаныя анамаліі. У некаторых выпадках можа адзначацца і слабая пазнавальная функцыя. Аднак у дзяцей, народжаных у выніку незапланаванай цяжарнасці, многія паказчыкі аказваюцца яшчэ горшыя.

ЛЯМПА САЛЯРЫЯ ЯК ЛЁГКІ НАРКОТЫК

АМЕРЫКАНСКІЯ даследчыкі прыйшлі да высновы, што залежнасць ад салярыя можна лічыць нервовым расстройствам і прыраўнялі яе да лёгкіх наркотыкаў.

Высветлілася, што многія людзі ў розных краінах свету адчуваюць вострую патрэбу ў сістэматычным наведванні салярыя. І калі па нейкай прычыне даводзіцца прапускаць сеанс, то залежныя ад штучнага сонца знаходзяцца ў дэпрэсіўным і прыгнечаным стане. Эксперты раяць усім, хто заўважыў у сябе падобныя сімптомы, неадкладна звярнуцца за псіхалагічнай дапамогай да спецыяліста.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Управляющий в производстве по делу о банкротстве ОАО «Молодечнообщепит» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ:

Лот 1 – **здание цеха** об. пл. – 220,7 кв.м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, пл. Старое Место, 17А. Начальная цена с НДС – 203 427 600 рублей.

Лот 2 – **здание склада** об. пл. – 106,8 кв.м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, пл. Старое Место, 17А/1. Начальная цена с НДС – 101 426 400 рублей. Площадь земельного участка – 0,1454 га.

Лот 3 – **здание овощехранилища (повторно)** об. пл. 156,5 кв.м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Молодечно, ул. Шаранговича, 53. Площадь земельного участка – 0,0387 га.

Начальная цена с НДС – 56 754 000 рублей.

Аукцион состоится **26.09.2011 г. в 12.00** по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Чарота, 16. Задаток в размере 5% от начальной цены перечисляется на р/с 3012034550013 в ЦБУ № 1 ЗАО «МТБанк», г. Молодечно, МФО 153001117, УНП 600066618, ОАО «Молодечнообщепит».

Договор купли-продажи подписывается сторонами в течение 10 дней с даты проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 дней с даты проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 23.09.2011 г. до 17.00** по адресу: 222310, Минская область, г. Молодечно, ул. Чарота, 16.

Тел. для справок: (8029) 165 06 51, (80176) 77 19 03.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

30.09.2011 г. в 11.00 в здании Гродненского районного исполнительного комитета (г. Гродно, ул. Горького, 51) состоится аукцион по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного, блокированного жилого дома.

Наименование объекта	Площадь (га)	Кадастровый номер	Начальная цена продажи, руб.	Сумма задатка	Расходы по подготовке
Гродненская область, Гродненский район, д. Поречье, ул. Заречная, У-32	0,2500	422087507101000703	11 158 375	1 115 000	2 000 000

Окончательное решение о передаче земельных участков принимается Поречским сельским исполнительным комитетом.

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, предоставляет:

- копии платежных поручений — о внесении задатка на расчетный счет Главное управление МФ по Гродненской области (Поречский сельисполком) **р/с 3600514100154 в филиале 400 АСБ «Беларусбанк», код 752, УНН 500027399, ОКПО 04429242 с отметкой банка о его исполнении;**

- паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица — паспорт и нотариально заверенную доверенность.

1. Документы, необходимые для участия в аукционе, принимаются организатором аукциона по адресу: 231742, Гродненский район, д. Поречье, ул. Л. Толстого, 8, Поречский сельисполком каждый рабочий день недели — с 8.00 до 17.00, 13.00—14.00 — обеденный перерыв.

2. **Последний день подачи заявлений — 26 сентября 2011 года до 17.00.**

3. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с выставляемым на аукцион земельным участком.

4. Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия исполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка вносит плату за предмет аукциона, а также возмещает расходы, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения (сумма подлежит корректировке исходя из фактических затрат). Победитель аукциона в двухмесячный срок после принятия исполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка обязан осуществить государственную регистрацию прав на земельный участок.

Аукцион состоится 30 сентября 2011 года в 11.00 по адресу: 230029, г. Гродно, ул. Горького, 51, Гродненский райисполком, актовый зал.

Телефоны для справок: (8 0152) 99 32 82, (8 029) 362 75 99.

УРОК МІНУЎШЧЫНЫ

КРУГЛАЯ дата чамусьці заўжды наводзіць на роздум. Такая ўжо чалавечая натура. У свой юбілей усе мы задумваемся, ці не дарэмна пражылі гадзі, па сутнасці, выклікаюць тыя ж развагі, хіба толькі маштабы большыя. А што калі б гісторыя пайшла ў іншае рэчышча? Ці жылі б мы зараз лепш? А галоўнае — як перакласці ўрокі мінуўшчыны на будучыню?

Паразважаць пра лёс СССР і яго наступствы цікава было б з чалавекам, які быў сведкам усёй драмы распаду, што разварочвалася ў Маскве, а пасля назіраў усю драму перабудовы тут. І такі сведка ёсць.

Прафесійная «ігра» голасам выдае ў ім вопытнага выступоўцу. Логіка і тэрміналагічнасць выказванняў — навукоўцу са стажам. Цытаты на бездакорнай англійскай, нямецкай і французскай — выпускніка інстытута замежных моў і практыка міжнароднай дыпламатыі. А вясёлы нораў і лёгкасць у гутарцы нагадваюць пра вясковае дзяцінства.

У паслужным спісе Івана АНТАНОВІЧА — пасады загадчыка аддзела культуры ЦК КПБ і сакратара ЦК Кампартыі Расіі, пастаяннага прадстаўніка БССР пры ЮНЕСКА і супрацоўніка аддзела сацыяльнага развіцця ААН, дырэктара НДІ і міністра замежных спраў Беларусі, званне прафесара філасофіі і ранг надзвычайнага і паўнамоцнага пасла.

Карацей, яму ёсць аб чым распавесці. І напярэдадні ўласнага 75-годдзя ён выкладае ўрок мінуўшчыны.

Фота з архіва БЕЛТА.

— Іван Іванавіч, чыя роля, на вашу думку, была вырашальнай у развале вялікай дзяржавы? Што стала каталізатарам? Калі ўсё затрашчала па швах — увесну 1991-га? З новаагароўскім працэсам?

— Каталізатарам стаў путч 19 жніўня 1991 года. З аднаго боку, справа была абсалютна відавочная: збіраліся пачаць яго 18-га, а 19-га планавалася падпісанне гэтага дагавора ў Новаагарове, калі ўжо Савецкага саюза не было б. Таму верхняя частка ўлады мела абсалютную рацыю ў сваім імкненні гэтаму перашкодзіць. Але зроблена гэта было відавочна бяздарна, бо ніхто не хацеў браць на сябе адказнасць. 19 жніўня, вечар. Я пакідаю свой службовы кабінет на Старой плошчы і еду дадому. Па дарозе я бачу такую карціну: танкі з адчыненымі люкамі, з якіх выязджаюць салдаты, а ўнізе дзяўчаткі стаяць, і разам яны п'юць фінскае піва з бляшанак. З-за дэфіцыту купіць фінскае піва тады было немагчыма. Значыць, яго нехта паставіў. Я разварочваю машыну, еду да свайго першага сакратара ЦК КП РСФСР Купцова і кажу яму: «Гэта, браце мой, аперэта, гэта не путч, нічога не будзе». Ён прапанаваў пайсці да члена ГКЧП... Прыходзім, а той у дыміну п'яны... 20-га ўжо было зразумела, што путч праваліўся. 21-га Лубянка і Старая плошча былі ўсыпаны людзьмі. Пад'язджалі пікапы, з якіх вымалі скрыні гарэлкі, бутэрброды. Гэта значыць, калі пачалася ўся сацыяльная заваруха, месяцаў шэсць ужо хтось гэтым кіраваў. У каго былі грошы і ўменне кіраваць. Такое ўменне ішло праз дэмакратычную групу ў з'ездзе народных дэпутатаў, а грошы прыходзілі з Амерыкі.

— Што справакавала путч?

— У 1988 годзе стала відавочным тое, што перабудова не працуе. Чаму? Сэнс яе быў у тым, каб хутка падняць эканоміку. Аднак ніякага плана сур'ёзнага пад'ёму эканомікі за гэтыя тры гады каманда, якая была ва ўладзе, на чале з Гарбачовым, не зрабіла. І тады Гарбачоў робіць моцны віраж — пераводзіць усю перабудову ў ідэалогію і кідае лозунг галоснасці. Гэта было актуальна, бо мы тады гаварылі з аглядкай, на кухні, ціха, эзопаўскай мовай. Крамы былі пустыя, у тэатр ці на чыгунку квіткі дастаць было нельга. Ды што там, трусы, прабачце, нават па блаце было не купіць! Вось усе ты слоган (у рэвалюцыйныя часы яны спрацоўваюць лепш, чым складаныя): «Давайце вернемся ў сусветную цывілізацыю і будзем жыць, як усе». Ніхто не растлумачыў, што значыць гэтае «як усе». Але зразумелі гэта для сябе так: будзем жыць, як у Амерыцы, Германіі і Вялікабрытаніі, як на Захадзе. Так эканамічныя абяцанні перакінуліся ў лагер дэмакратычнай апазіцыі, і вось тут паўстае неардынарная фігура Ельцына. Ён выступіў з кан'юнктурнай крытыкай на пленуме ЦК КПСС напярэдадні 70-годдзя СССР. Сказаў, што перабудова ідзе марудна і намякнуў, што жонка Гарбачова ў палітыцы займае трохі больш месца, чым гэта было б патрэбна. Ён пакрытыкаваў вельмі мякка, але адказалі яму ў тэндэнцыйнай «саўковай» манеры — змяшалі з брудам. Пасля таго, як на шумным пленуме МГК КПСС Ельцына знялі з працы, ён, кажуць, у сваім кабінеце нажнічкамі сунуў сабе ў бок. Тады ўзбунтаваўся ўвесь Екацярынбург, а пасля яго вельмі пагрозліва пачала гудзець Сібір... Ельцына я добра ведаў асабіста — у яго была звярыная прага да ўлады. І дэмакратычная апазіцыя, якая сфарміравалася на з'ездзе народных дэпутатаў, узяла яго ў якасці лідара. Гарбачоў пад ціскам апазіцыі праводзіць рашэнне аб тым, каб адмяніць 6 артыкул Канстытуцыі СССР аб дзяржаўнай ролі КПСС. Савецкая сістэма была настолькі бездакорная, што дастаткова дастаць з яе адзін вінцік — і яна разваліцца. А тут дасталі станавы хрыбет. У 1989—1990 годзе сістэма пайшла ўразнос. Цэнтр страціў кіраванне рэгіёнамі. Акрамя таго, моцны ўдар нанеслі прыбалтыйскія рэспублікі. Вельмі разумна і вельмі прыгожа. Спачатку яны прасілі для сябе ўсё больш і больш аўтаноміі, а потым, па меры таго, як слабела цэнтральнае кіраўніцтва, сталі патрабаваць выхаду з СССР.

— Распад СССР для яго ўдзельнікаў і для ўсяго свету — гэта, на ваш погляд, даброта ці трагедыя?

— Гэта вялікая трагедыя. Біпалярны свет быў вельмі моцным утварэннем, гэта было найлепшае рашэнне пасля Другой сусветнай вайны. Галоўныя агрэсары — Германія і Японія — былі аслаблены. ЗША, што б ні казалі, ніколі адкрыта не выступалі супраць СССР, і краіны былі саюзніцамі ў гэтай вайне. Абедзве глабальныя наднацыянальныя дзяржавы ворагамі, і для сусвету гэта было добра. Яны ўздзейнічалі адна на адну — кожны хацеў пазбавіцца сваіх слабасцяў. І тое, што распаўся СССР — гэта не заслуга ЗША. За тысячу гадоў славянскай гісторыі краінам пастаянна даводзілася змагацца з варожым уздзеяннем звонку, і мы ўмеем гэта рабіць. СССР распаўся з-за ўнутраных слабасцяў. У 2003 годзе ЦРУ зрабіла публічны даклад, дзе было вельмі ясна сказана, што амерыканскі бок чакаў дынамікі доўгатэрміновага паслаблення СССР, але не распаду. Таму калі мы прайгралі халодную вайну, то амерыканцы яе не выйгралі.

— А калі так, то ці магчыма было прадухіліць трагедыю і захаваць Савецкі Саюз? Ці рэальна было правесці скаардынаваную эканамічную рэформу?

— Вы задаяце, магчыма, самае складанае пытанне адносна тых падзей. Краіна прыйшла да распаду з-за некампетэнтнасці кіраўніцтва, няўмення наладзіць сувязь з народам і асабліва яго адукаванай часткай, каб знайсці план выхаду ў межах наяўнай сацыяльна-эканамічнай сістэмы. Ельцын і Гарбачоў — дзве найбольш змрочныя фігуры тагачаснай гісторыі, бо абодва падпарадкавалі сваю перабудоўчую дзейнасць барацьбе за ўласную ўладу. Яны абодва канстытуцыйна вінаватыя ў распадзе СССР. 19 жніўня 1991 года, калі сем рэспублік збіраліся падпісаць новы саюзны дагавор, яны ўжо падвялі рысу вялікага этапу нашай гісторыі — перыяду існавання СССР, бо новае ўтварэнне называлася ССД — Саюз свабодных дзяржаў. І гэта была поўная абыякавасць да волевыяўлення савецкага народа, які яшчэ ў сакавіку прагаласаваў на рэферэндуме за захаванне СССР. А калі Ельцын стаў прэзідэнтам Расійскай рэспублікі, ён прымусіў Вярхоўны Савет РСФСР прыняць пастанову, згодна якой расійскія законы мелі перавагу над агульнасаюзнымі. Гэта мела абсалютна трагічны вынік для ўсяго СССР. Найбольшая частка дзяржавы выйшла з-пад дзеяння савецкіх законаў і зрабіла першаснымі свае. Таму выратаваць СССР у 1991 годзе было ўжо немагчыма. Ды і не было каму. Большая частка бюракратыі (прычым не столькі партыйнай, колькі дзяржаўнай), як сабакі, прыціснуўшы вушы, чакалі, што навальніца прагрыміць над імі, а яны застануцца ва ўладзе. Як яно і здарылася потым...

— А калі было яшчэ магчыма захаваць СССР?

— Выратаваць краіну можна было ў 1981 годзе, калі да ўлады прыйшоў Андропаў. Эканамічная мадэль, якую ён рыхтаваў для Савецкага Саюза, бліскуча рэалізаваў у Кітаі вядомы рэфарматар Дэн Сяопін. Ён прадэманстраваў цуд магчымасцяў сацыялізму да самаадналення. У аснове ляжала старая нэпаўская формула. Ні ў Кітаі, ні ў Расіі з моманту сацыялістычных рэвалюцый не было ніякай асновы спелага капіталізму, таму трэба было набраць капіталізмам неабходную матэрыяльную базу і потым толькі пераходзіць да сацыялізму. Гэта рабіў Ленін, і Сталін таму перашкодзіў. Гэта рабіў Андропаў, але паспеў толькі абазначыць, прычым нават не публічна, а ў сваіх лістах у партыйныя арганізацыі СССР. Вельмі многія шапталіся пра тое, што Андропаву «дапамаглі» сысці з жыцця, паскорылі яго хваробу. І калі я стаў членам Палітбюро, сакратаром ЦК РСФСР і атрымаў доступ да звышсакрэтных дакументаў, мой аналіз паказаў, што многае з тых чутак было небеспадстаўным...

— Чаму патрэба ў рэформе ўзнікла менавіта тады? Чым быў выкліканы крызіс 1980-х?

— Амерыканцы вельмі разумна і ўмела падарвалі савецкую эканоміку гонкай узбраенняў. У ЗША на гонку ўзбраенняў ішоў залішні капітал, а Савецкі Саюз адрываў сродкі ад народа. У 1974 годзе быў дасягнуты парытэт ва ўзбраенні, і амерыканцы ведалі: эканоміка СССР падарваная. Пачаўся татальны дэфіцыт. Яшчэ да таго фарміравалася незадавальненне ў эліт, якія пачуваліся няёмка на фоне замежных калег, абвастрэнне ж дэфіцыту распаўсюдзіла гэты настрой на асноўную масу насельніцтва, і ўсе чакалі перамен...

— Чым можна было ўтрымаць прыбалтаў, якія патрабавалі аўтаномнасці?

— Быць хітрэйшымі — выставіць ім умовы. Шаноўная Літва, за час, які вы былі ў складзе СССР, вашу тэрыторыю нарасцілі на адну трэць, у вас пабудавалі 15 першакласных заводаў. Тэрыторыю аддайце назад, а за заводы выплаціце пэўную суму. Так, як сёння вырашаюць такія праблемы ў Канадзе, Бельгіі. Тады паглядзелі б яшчэ латышы, літоўцы і эстонцы, ці варта ім выходзіць — можа, гэта выйдзе сабе даражэй? Нават калі б і адважыліся, то пры такім раскладзе справа цягнулася б гадоў 30 — 40. І калі б выйшлі, то на іншых умовах, і не ворагамі нашымі. Але ўсё пайшло зусім не так...

— Прыбалты абралі адасобленасць. А як паводзілі сябе беларусы ў час агульнага раздраю?

— Беларусь пайшла сваім шляхам. Там узяў верх іншы матыў — адраджэнне. Аднак адраджэння не атрымалася. Па той простай прычыне, што для гэтага трэба было арганізоўваць гурткі вывучэння беларускай мовы ў пасёлках, гарадах, у бюракратычных канцылярыях, ВНУ. Трэба было вучыць беларускай мове насельніцтва, якое на 9/10 гаварыла па-руску. Прычым гэтае насельніцтва нельга было адвучаць ад рускай мовы. Разам з тым, праграм рэфармавання эканомікі не было. Адраджаць не было на што: казна была пустая. Рух правалюся, і ідэя нацыянальнага суверэнітэту не гучала так моцна, як у Прыбалтыцы. Ніхто не ставіў ніякіх пытанняў пра сепаратызм, і гэта было вельмі сімптаматычна. Канстытуцыя, якую прыняў тады Вярхоўны Савет, была вельмі разумным, сучасным дакументам, што заявіў аб нейтральным статусе дзяржавы. Пры гэтым Беларусь не магла разарваць і не разарвала сувязі з Расіяй, бо гэта ўсё ж такі брацкі народ.

— А цяпер, праз 20 гадоў, як выглядае Беларусь на фоне былых таварышак па СССР?

— Што сёння сказаць пра прыбалтаў, якія першымі дамагаліся выхаду, — выйгралі ці прайгралі ад суверэнітэту? Выйгралі ў тым сэнсе, што палітычнае ўяўленне, нібыта ім кепска ад знаходжання ў складзе Савецкага Саюза, ужо няма. Яны рэалісты. Але яны не гаспадары свайго лёсу. Сёння збор правілаў існавання ЕС займае 70 тыс. старонак. Вы будзеце смяяцца, але і ў Канстытуцыі, якую так і не змаглі прыняць, і ў дагаворы аб Еўрасаюзе вельмі шмат элементаў прававых асноў існавання Савецкага Саюза. Незалежнасць прыбалтамі страчана, самастойных палітычных рашэнняў глабальнага маштабу гэтыя краіны прымаць не могуць. Трэба пытацца дазволу ў Брусселя. Эканоміка прывязана да эканомікі ЕС і знаходзіцца ў прыгнечаным, залежным стане. Мне здаецца, што сёння ў Прыбалтыцы не нашмат больш суверэнітэту, чым было ў часы Савецкага Саюза. Да таго ж там у Прыбалтыкі была асаблівая аўра квітнеючага рэгіёну, людзі з іншых куткоў Савецкага Саюза ехалі туды, як у аазіс дабрабыту. Хто сёння з Еўропы падзе ў Прыбалтыку?! Розніца ва ўзроўні жыцця з Беларуссю ўсё ж ёсць, але за ўсю тысячагадовую гісторыю славянскай дзяржаўнасці мы адставалі ў адносінах дабрабыту ад заходняй часткі Еўропы. З моманту, калі пачалі ўтварацца нашы дзяржаўныя элементы, Еўропа ўжо мела тысячагадовы вопыт выхаду з Рымскай імперыі. Еўропа на тысячу гадоў старэйшая за нас, і яна ўмее лепш арганізаваць, і яна багацей жыла. Праз яе не праходзілі віхуры знішчальных ваенных хваляў. Гэтыя знішчэнні і наогул гістарычная адсталасць славянскага свету ў многім тлумачаць розніцу ва ўзроўнях дабрабыту, гжэчнасці, цнатлівасці ў адносінах людзей адно да аднаго. Я не магу сказаць, што наша культура слабейшая за набыткі Латвіі, Літвы, Эстоніі. У нас вельмі моцная, еўрапейскага ўзроўню, літаратура. У нас свая нядрэнная музыка, жывапіс. У нас проста трохі горш з матэрыяльным дабрабытам.

— На ўражанне не можа не паўплываць відавочная няпростая сітуацыя ў беларускай эканоміцы...

— Зусім не ўсё так змрочна. Крызісы для кожнай еўрапейскай краіны не з'яўляюцца зараз ніякай навіной. Колькі існуе ЕС, столькі якаясьці з краін трапляе ў крызіс, а іншая выходзіць. Прычым прамежкі паміж крызісамі скарачаюцца, а перыяды выхаду падаўжаюцца. Проста мы былі ўбаку, і ўспрымалі гэта натуральна, а сёння мы як усе. Хопіць сварыцца і шукаць вінаватых. Ёсць праблема, якую трэба вырашыць — выйсці з крызісу. Трэба проста працаваць разам.

— Якія вы бачыце магчымыя сцэнарыі далейшых узаемаадносін Беларусі з Расіяй?

— Яны могуць быць падобнымі да адносін Канады і ЗША. Абсалютна пераплеценыя эканомікі (хоць у канадцаў свой долар, а ў амерыканцаў свой), мяжа — хутчэй, для самапавагі, і ваяўнічая незалежнасць Канады. Так і жывуць, крыху недалюбліваючы, але разумеючы адно аднаго. Любыя канфлікты можна вырашаць спакойна, цягавіта і настойліва.

— Як вы ацэньваеце цяперашнія інтэграцыйныя ўтварэнні? Многія палітолагі раяць наогул адмовіцца ад тэрміну «постсавецкая прастора», адмаўляючы краінам у нейкай еднасці...

— Я вельмі актыўны прыхільнік Мытнага саюза. Мой зяць праехаў з Астаны ў Мінск на аўтамабілі, і ніхто яго не спыніў на ўсім шляху. Разам са скасаваннем мытных меж знікаюць і бар'еры ў агульначалавечай прасторы. Прычым палітычна гэта краіны, якія вельмі клапоцяцца пра свой суверэнітэт і вельмі чуйна рэагуюць на ўсякую абразу іх годнасці. Я думаю, гэта не горшы варыянт інтэграцыі. Мы ўліваемся ў галоўны сучасны трэнд — глабалізацыю, узаемазалежнасць эканомік. І як толькі мы ў сваім рэгіёне станем узаемазалежнымі, тады гэтым моцным кулаком нам лягчэй будзе ўвайсці ў агульнаеўрапейскі падзел працы. Але ж адна справа — канцэпцыя еўразійскага супрацоўніцтва, і зусім іншая — адзінства. Канцэпцыя еўразійскага адзінства для мяне заўжды была малапрымальная.

— Ці з'яўляецца верагодным, на вашу думку, фарміраванне сучаснай геапалітычнай структуры па вобразе і падабенстве СССР?

— Я ведаю многіх палітыкаў у Расіі, якія хацелі б аднавіць нешта накшталт СССР. Такіх палітыкаў нямала і ў Казахстане, і ва Украіне, і ў іншых былых удзельніцах Саюза. Аднак 20-годдзе суверэнітэту кожнай з іх паставіла нябачныя, але моцныя бар'еры, на якія адразу натыкаецца ўсякая палітычная воля ў гэтым напрамку і не мае магчымасці пайсці далей.

Адсюль я не бачу шляху да стварэння нейкіх агульных палітычных структур, якія маглі б нагадваць Савецкі Саюз. І сёння я вымушаны з жалем сказаць: гэта ўнікальнае ўтварэнне, у якім было нашмат больш пазітыву, чым негатыву, — ужо гістарычны факт. Старонка перагорнутая, назад дарогі няма. Гісторыя не паўтараецца ніколі.

— А камунікацыя з Еўропай вам якой уяўляецца?

— Мы можам вучыцца ў Еўропы, але нам нельга яе капіраваць. Я б не хацеў, каб Беларусь была ў ЕС. Не таму што я маю такую антыеўрапейскую пазіцыю — наадварот, я еўрапеец і па адукацыі, і па мысленні, ды і Беларусь — еўрапейская краіна. Мы, еўрапейцы, як хрысціяне. Мы — частка еўрапейскай гісторыі, тэрыторыі. Але страта суверэнітэту, палітычнага і эканамічнага, у ЕС такая, што нас, якія панюхалі ўжо суверэнітэту з усімі яго плюсамі і мінусамі, яна не задаволіць. Як, дарэчы, не задавальняе і літоўцаў, і латышоў. Ды і не чакаюць Беларусь у Еўропе. Там не ведаюць, што рабіць з 2/3 сваіх краін, дзе зараз тэхнічны дэфолт.

— Выходзіць, нам угатавана роля мосту паміж Захадам і Усходам?

— Адначасова быць крыху Захадам, крыху Усходам у нас не атрымаецца. А вось Беларусь нейтральная, якая развівае эканоміку ведаў, карыстаючыся сусветнымі інфармацыйнымі і фінансавымі патокамі, — гэта магчымая мадэль. Чаму б нам не стаць інфармацыйным, фінансавым цэнтрам усходнееўрапейскага сусвету?! У нас няма ўласнай сыравіны. Будзем такія, як Швейцарыя. Высокатэхнічная сацыяльная структура, часам нагадвае мне «Мерседэс» найноўшай канструкцыі, у бак якога не залілі бензін. Трэба прадаваць інтэлектуальны прадукт. Развіваючы фінансавую справу і інфармацыйную, бо ў глабалізацыі два стрыжні сусветнага працэсу: адзіная фінасавая прастора і адзінае інфармацыйнае павуцінне. Больш няма нічога. Сёння матэрыяльная вытворчасць падпарадкавана меркаванням інфармацыйнай і фінансавай прасторы. Прыйдзе час, калі невялікія краіны ў Еўропе, якія не з'яўляюцца членамі ЕС, будуць карыстацца найвялікшым попытам як афшорныя зоны. Сёння мы патрэбны Еўропе і патрэбны Расіі, мы можам дамаўляцца з прыбалтамі — усім гэтым варта разумна карыстацца.

— 20 гадоў прайшло, а мы ўсё яшчэ змагаемся за суверэнітэт? Ён усё яшчэ крохкі?

— За суверэнітэт неабходна змагацца ўсё сваё жыццё, калі ты меншы або слабейшы. Краіны — вельмі эгаістычныя геапалітычныя стварэнні, яны маюць схільнасць падтаптаць іншых. Але, змагаючыся, нічога не адмаўляць начыста. Змаганне за суверэнітэт не прадугледжвае жалезабетонную пазіцыю: вам — ваша, нам — наша. Гэта складанейшы працэс пошуку кампрамісаў, узаемазалежнасці. Якой бы маленькай ні была краіна, у яе заўсёды ёсць свае рэзервы і свае казырныя карты. Але гульня гэтымі картамі патрабуе вялікай тонкасці, шырокіх дыскусій.

— Якія галоўныя ўрокі і набыткі 20 гадоў незалежнасці?

— Першы і найгалоўнейшы набытак — суверэнітэт. Ва ўсіх 15 канстытуцыйных утварэннях СССР. Ніводнае з іх яго не страціла. Беларусь, поруч з Украінай, у час атрымання суверэнітэту пасля распаду СССР была ў больш выгадным становішчы, чым іншыя. Як удзельніца ААН, яна мела дыпламатыю міжнароднага ўзроўню. Таму я заўжды спрачаюся з тымі, хто кажа, што беларускі суверэнітэт упаў з неба. Мы яго рыхтавалі. І гэта зусім невыпадкова, што ў 1945 годзе, калі ЗША ўжо былі настроены па-антысавецку, яны не змаглі адмовіць Беларусі і Украіне ў суверэнітэце. Гэта вялікая заслуга Беларусі і яе народа, што суверэнітэт з цягам часу быў не страчаны, а замацаваны. І сёння, напэўна, большасць беларусаў пацвердзіла б жаданне жыць у суверэнітэце.

У савецкай дзяржаве кожны чалавек быў членам калектыву, а цяпер гэта самастойная дзейная асоба. Мы ўжо 20 гадоў умеем клапаціцца пра сябе самі. Кожны з нас, грамадзян Беларусі, праверыў сябе ў справе і ўдакладніў, што ён робіць лепш, а што горш. Ён больш самастойны, больш аўтаномны. І гэта другі важны ўрок, які мы для сябе вынеслі.

Раней скажаш за мяжой, што ты з Беларусі, усе толькі плячыма паціскалі. А з цягам часу ўсё больш людзей ведаюць, што такая краіна ёсць. Можа, хтосьці не вельмі задаволены, як яна сябе паводзіць, але гэта краіна, якая ідзе сваім шляхам. І гэта наш шлях, мы яго ствараем самі.

Зоя ВАРАНЦОВА.

НАДЫШОЎ ЧАС НЕАДКЛАДНАЙ І ЖОРСТКАЙ ЭКАНОМІКІ

АБ сённяшняй сітуацыі ў грашовых справах у краіне, праблемах, выкліканых дэвальвацыяй, наш карэспандэнт гутарыць з незалежным беларускім эканамістам, членам Грамадска-кансультацыйнага савета пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Л.Ф. ЗАІКАМ.

— Яшчэ ў пачатку вясны высокапастаўленыя прадстаўнікі Нацыянальнага банка і Савета Міністраў, многія аналітыкі і эканамісты, у тым ліку і вы, неаднойчы заяўлялі, што бліжэй да восені становішча на валютным рынку краіны стабілізуецца, у абменных пунктах знікне ажыятажны попыт на долары і еўра. Ужо хутка восень, а каля абменнікаў па-ранейшаму дзяжураць. Там у чэргах пачасціліся сваркі і сутыкненні, ажывіўся «чорны» валютны рынак. Відаць, вы ўсе памыліліся ў разліках выхаду са складанай сітуацыі?

— Я бы так не сказаў. Яшчэ перад афіцыйнай дэвальвацыяй рубля, эканамісты, сярод якіх быў і я, заклікалі да пераходу да радыкальнай эканоміі грашовых сродкаў у нацыянальным маштабе. Бо было відавочным, што шчодрыя сацыяльныя прэферэнцыі для насельніцтва не могуць бясконца працягвацца, а тым больш павялічвацца. Я і сёння ўпэўнены, што ў самым пачатку развіцця негатыўных тэндэнцый на валютным рынку курс рубля можна было б замацаваць на ўзроўні 3600 — 3800 рублёў за адзін долар ЗША. Тады, на мой погляд, быў шанц збалансаваць сітуацыю з валютай.

— Леанід Фёдаравіч, гучыць як песня. Але ўсе мы, як вядома, моцныя заднім розумам. Як канкрэтна можна было б дасягнуць гэтага балансу і якая, на вашу думку, павінна быць рэальная эканомія?

— Наша краіна сёння перажывае стратэгічна важны момант у сваім развіцці. Таму і захады павінны быць адэкватнымі. Як гэта не непрыемна казаць, але не павінна быць аніякіх індэксацый, павышэнняў пенсій і зарплат, стыпендый. Разумею, што пераход да больш нізкага ўзроўню спажывання — працэс вельмі балючы. Але што рабіць, бо мы даволі працяглы перыяд жылі не па сродках. Так бясконца не магло працягвацца. Гэта трэба прызнаць і ўсвядоміць.

Збалансаваць сітуацыю з валютай можна толькі пры ўмове неадкладнай і жорсткай эканоміі грашовых сродкаў па ўсіх накірунках і ва ўсіх сферах. Інакш кажучы, тады, вясной, трэба было поўнасцю перагледзець у краіне ўсе выдаткі, у тым ліку і на сацыяльныя мэты. Рашуча пайсці на непапулярныя меры. Я ведаю, што зараз сказанае мною многім не вельмі спадабаецца. Але я ўпэўнены ў тым, што варта было б зарплату бюджэтнікам скараціць у сярэднім на 30 працэнтаў. Прычым членам урада — аж напалову. Паступова супыніць усе дарагія маштабныя праекты накшталт будаўніцтва таннага жылля. Бо яго ўзвядзенне на крэдыты пад адзін працэнт я лічу раздачай бясплатнага жылля. Таксама адмовіцца ад выдачы танных крэдытаў прадпрыемствам. Гэтыя меры варта разглядаць, падкрэсліваю, як часовыя. Пакуль не будзе пераадолены складаны момант.

Але вясной Нацбанк і Саўмін працягвалі, вобразна кажучы, песціць насельніцтва, гладзіць яго па шэрстцы, і замест бескампраміснай эканоміі былі праіндэксаваны пенсіі. На працягу першага паўгоддзя крэдытаў прадпрыемствам (гэта называецца крэдытнай эмісіяй) выдалі больш чым на 30 працэнтаў. Да апошняга часу гэтыя грошы выдаваліся ў вялікай колькасці, што не спрыяе стабілізацыі з валютай.

— Ведаеце, шаноўны Леанід Фёдаравіч, лёгка разважаць з пункту погляду чыстай эканамічнай тэорыі. Па ёй можа і правільна рабіць, як вы кажаце. А як жыць пенсіянерам, студэнтам, калі цэны нібы звар'яцелі, так і скачуць угору? Тут, магчыма, дапушчальная ў абмежаваных аб'ёмах грашовая эмісія.

— Вось так заўсёды: трохі надрукавалі больш грашовых знакаў, выдалі больш танных крэдытаў, а разам уся гэтая рублёвая маса цісне на валютны рынак, запавольвае працэс стабілізацыі курсу долара. Калі вы загаварылі аб эканамічнай тэорыі, то я мушу заўважыць, што сёлета была таксама дапушчана тэарэтычная памылка, якая не спрыяе паляпшэнню агульнай эканамічнай сітуацыі.

Рублёвая маса цісне на валютны рынак, запавольвае працэс стабілізацыі курсу долара.

— І цікава, што гэта за памылка?

— А такая, што ёсць правіла: у складаныя моманты для нацыянальнай эканомікі і валюты трэба імкнуцца павялічыць попыт на яе. У нас усё наадварот. Відаць, згодна з парадай не вельмі адукаваных эканамістаў, быў дазволены продаж іншаземцам паліва за замежную валюту, таксама за долары і еўра пачалі гандляваць кватэрамі, аўтамабілямі. А я лічу, што такім чынам мы не аказалі нашаму рублю належнай падтрымкі. Бо пакупнікі вышэйназваных тавараў былі б вымушаны мяняць тыя ж долары на рублі, а не наадварот. Замест садзейнічання росту попыту на беларускія грошы мы падагрэлі інтарэс да замежных грошай. Калі ў краіне адразу працуе некалькі валют, то моцныя валюты выціскаюць больш слабыя. У нашай сітуацыі моцным аказаўся долар.

— Не праходзіць і дня, каб СМІ не паведамлялі аб чарговых узрушэннях на сусветных біржах, падзенні індэксаў, рэзкіх зменах нейкіх там каціровак, рэзкіх ваганнях валютных курсаў. Ці моцна ўплывае ўсё гэта на нашу эканоміку?

— Не. Толькі псіхалагічна, бо ўносіцца элемент трывогі ў свядомасць людзей. А ў эканамічным плане падзеі на вядучых замежных біржах не адбіваюцца на Беларусі. Яе доля ў сусветнай эканоміцы менш за адзін працэнт, а па другое, усе гэтыя скокі індэксаў і каціровак у першую чаргу ўплываюць на міжнародныя фінансавыя рынкі, а не на рэальную эканоміку. Змены курсаў долара да еўра ўплываюць на перазмеркаванне даходаў у міжнародных маштабах. Тыя, хто ў глабальных маштабах гуляе на біржах на паніжэнне ці павышэнне той ці іншай валюты, самі ж нічога не вырабляюць. Затое гэтыя міжнародныя валютныя трэйдары ўдзельнічаюць у перараздмеркаванні сусветнага валавога прадукту на сваю карысць.

— Сёння шмат эканамістаў-аматараў кажуць, што дэвальвацыі можна было пазбегнуць. А вы што думаеце на гэты конт?

— Дэвальвацыя ў тых абставінах была непазбежнай. І самы галоўны аргумент на яе карысць — велізарны дысбаланс у знешнім гандлі, які няўхільна павялічваўся з кожным годам. Нагадаю, летась адмоўнае сальда склала больш за дзесяць мільярдаў долараў. Для нашай эканомікі — вельмі адчувальны негатыўны фактар. Сёння назіраецца паступовае зніжэнне яго ўплыву на эканоміку. Калі рэзка выраслі цэны на харчовыя і нехарчовыя імпартныя тавары, то вельмі многія перасталі купляць іх. На гэта хутка адрэагавалі гандлёвыя прадпрыемствы: яны істотна знізілі закуп па імпарце. Бо на яго значна знізіўся ўнутраны попыт.

— А як вы ставіцеся да ідэі паскоранага развіцця імпартазамяшчэння як эфектыўнага метаду выхаду на станоўчы баланс знешнегандлёвага абароту, эканоміі валюты?

— Мне гэта не здаецца менавіта тым, што зараз неабходна нашай эканоміцы ў першую чаргу. Дарэчы, у свой час кітайцы паспрабавалі ісці па шляху імпартазамяшчэння, ад чаго хутка былі вымушаны адмовіцца і засяродзіцца на выпуску экспартнаарыентаванай прадукцыі. Чым не прыклад для нас? Сёння КНР літаральна патанае ў доларах, мае самыя вялікія ў свеце золатавалютныя рэзервы. Думаю, што і нам дзеля вырашэння валютных праблем таксама варта выкарыстаць досвед кітайскіх таварышаў. Ёсць і адмоўны досвед таварышаў з Паўночнай Карэі, дзе паспрабавалі зрабіць свой варыянт нямецкага аўтамабіля «Мерседэс». Але не атрымалася.

Для кожнай краіны ёсць два шляхі мець неабходныя запасы замежнай валюты — упарта займацца імпартазамяшчэннем ці актыўна нарошчваць экспартны патэнцыял. Як эканаміст, я аддаю перавагу развіццю экспарту. Тым больш што ў нас для гэтага ёсць і матэрыяльна-тэхнічная база, і кваліфікаваныя кадры канструктараў, інжынераў, рабочых. Я ўпэўнены ў тым, што наш экспарт будзе паспяховым. Напрыклад, можна значна пашырыць продаж за мяжу нашай мэблі, адзення і г. д. Паўтарусь: больш перспектыўна ўкладваць грошы ў засваенне экспартнага патэнцыялу краіны, чым марнаваць сродкі на стварэнне аналагаў сусветных брэндаў. З пашырэннем экспарту мы будзем больш зарабляць валюты, а значыць, і мець больш сродкаў для выпуску запатрабаванай у свеце прадукцыі.

Між іншым, гэта будзе і аўтаматычна вырашаць праблему імпартазамяшчэння. Скажам, навошта нам польскія яблыкі, якія каштуюць цяпер аж 15 тысяч за кілаграм! Няўжо нашы аграрыі няздольныя наладзіць вытворчасць айчыннай агародніны і садавіны? Няўжо выраб з яе танных алкагольных напояў — так званых «чарніл» — з'яўляецца прыкладам імпартазамяшчэння якасных вінаградных він? Ці айчынны малы і сярэдні бізнэс не ў сілах засвоіць выпуск усялякай гаспадарчай драбязы, якую да нас завозяць звонку? На нашым баку, як гэта ні дзіўна, цяперашняя глыбокая дэвальвацыя рубля. Пры яго сённяшнім курсе да долара займацца імпартам спажывецкіх тавараў становіцца рызыкоўнай справай. Бо зараз многія бізнэсмены ўжо разлічваюць цану па курсе 12 тысяч за адзін долар!

Не думаю, што іх дарагія тавары будуць карыстацца шалёным попытам у насельніцтва.

— 12 тысяч за адзін долар — гэта ўжо празмерна. Як такіх дзялкоў паставіць на месца, каб яны не дралі сем скур з людзей?

— Адміністрацыйныя меры не дадуць карысці і не прынясуць патрэбнага эфекту. Задачу «паставіць на месца», як вы кажаце, лепш за ўсё даверыць рынку. Стабілізуецца валютная сітуацыя — стабілізуюцца і цэны. А дзяржава можа і павінна сёння падтрымаць малы і сярэдні бізнэс, які здольны рэальна выпускаць многае з тога, што завозіцца да нас па імпарце: розны інструмент, шрубы, балты, усялякія прылады і іншае. Менавіта такім айчынным вытворцам варта выдаваць танныя крэдыты, бо яны займаюцца канкрэтным замяшчэннем імпартнай прадукцыі.

— Памятаю, у вас і іншых эканамістаў былі сур'ёзныя прэтэнзіі да былога старшыні Нацбанка і яго каманды. Цяпер там новы кіраўнік. Як вы ацэньваеце яго першыя крокі на гэтай пасадзе?

— Пакуль цяжка рабіць аб'ектыўныя і канкрэтныя высновы. Надзея Ермакова працуе зусім нядаўна ў якасці старшыні праўлення Нацбанка. Будзем спадзявацца, што яна здолее «разруліць» цяжкую сітуацыю з парушэннямі валютных і рублёвых плыняў, эмісіяй грошай. Летась Нацбанк моцна трымаў пад кантролем стан грашовай базы ў краіне, але сёлета ў пачатку года манетарная палітыка дала збой. Я пакуль устрымаюся ад каментарыяў і ацэнак. Новаму кіраўніку Нацбанка патрэбны час для глыбокага вывучэння сітуацыя і прыняцця адэкватных рашэнняў. Хоць часу для гэтага зусім не засталося.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

Мытны саюз і АЭП — вялізны шанц для нас стаць багатымі і паспяховымі?

**БЕЛАРУСЬ сёння актыўна вядзе працу

МАЦІ І «НІДЗЕДЗЕНЕЦЦА»

З Сочы да маці прыехала сястра, мая цётка Рэня. Сядзелі мы за сталом і згадвалі даўняе... Маці часта пакідала мяне малога пажыць у Койданаве, у бабы Ядзі, а сама тады працавала ў Мінску. Я сумаваў, шматкроць перапытваў бабу: «Калі прыедзе мама?» — «Прыедзе, нідзе не дзенецца!» — суцяшалі мяне. Я хадзіў кругамі па хаце і паўтараў: «Прыедзе нідзедзенецца...» Маме і цётцы ўспамін падаваўся вельмі вясёлым, а мне згадаўся і той даўні шчымлівы сум бясконцага чакання.

УСПАМІНЫ І ЎЗАЕМНАСЦЬ

Ніколі не разумеў і ніколі не зразумею людзей, якія не помняць свайго дзяцінства. Яны спасылаюцца на малацікавасць падзей, на кепскую памяць, на змрочнасць тагачаснага бытавання. Калі ж ты пачынаеш настойваць на ўспамінах, такія вычварэнцы робяцца агрэсіўнымі. Не маё! Не буду згадваць! Не помню, бо не хачу помніць! Чалавек з падобнымі выказваннямі выклікае падазрэнні. Яго не далюбілі ў дзяцінстве, такога не любяць і дарослага. Правільна робяць, што не любяць. Калі ты не любіш свет свайго дзяцінства, калі ты не любіш свет — тады і свет не любіць цябе. Такая ўзаемнасць.

КУРБЭ І РЭАЛІЗМ

Курбэ — старанны мастак. Ён рабіў усё, каб дакладна паставіць блік на носе ўласнага аўтапартрэта. Ён ставіў блікі і на іншых насах, можа таму аматары знайсці рэалізм у мастацтве выбралі за адзін з узораў творы Курбэ. Яны назбіралі палотнаў Курбэ з тоўстымі цёткамі, з сакавітымі грудзямі, з важкімі дупамі і развесілі іх побач з творамі Веласкеса ды Рэмбранта, Тапіеса ды Рыберы. Выстава мусіла пераканаць гледача ў тым, што рэалізм ёсць. І можна было б паверыць, што Курбэ не рамантык і не прадстаўнік рамантызму, а заўзяты рэаліст, каб не партрэт апантанага празорцы. Ён і выдаў Курбэ. Ну дзе ты бачыў у рэальнасці празорцаў? Казкі гэта ўсё! Рамантычныя гісторыі.

АНЦІПЕНКА І ТАГОР

Алесь Анціпенка займеў артадаксальную іканаграфічную знешнасць. Ён стаў падобны да праваслаўнага старца. У нашых паўночных мястэчках на Віцебшчыне да падобных старцаў даверлівыя цёткі заўжды хадзілі па парады. Глядзіш на чалавека і бачыш абраз. Пра гэта я сказаў Алесю. Тут сябра Анціпенкі — Валянцін Акудовіч — выдаў сакрэт пераўвасаблення: «Ён не есць мяса. Ён нават рыбу перастаў есці. Яйкі ён таксама не есць. Чытае толькі індыйскія тэксты...» — «Усё, што сказана ў іхняй Рыгведзе, я магу прачытаць у Майн Рыда!» — паспрабаваў я метаметафарычна пажартаваць, але сутыкнуўся з халоднай сур'ёзнасцю. «Ты, Валодзя, не жартуй. Чалавек падыходзіць да справы грунтоўна!» — «Валянцін, ды і я іду па шляху ачышчэння, не п'ю і не куру. Рабіндраната Тагора я паважаю. У дзяцінстве мяне ўразілі рэпрадукцыі з ягоных рукапісаў. Тагор не проста пісаў тэксты, ён іх вымалёўваў на аркушах. Кожнае выпраўленне ў тэксце ператваралася ў парастак, які адыходзіць з камля. Узорныя рукапісы. Узорныя літары і лініі...» — «Лінія — адзін з найкарацейшых шляхоў да Бога!» — сказаў нам на развітанне іканаграфічнатвары Алесь.

СВЯТЛАНА І «КАРАВАЙ»

Апошні раз я пабачыў Святлану ў хлебнай краме «Каравай», што на плошчы Перамогі. Яна была не ў гуморы. Уся нейкая нашатораная, адрошаная, як не ў сабе. Яна стаяла ў чарзе папярадзе мяне, узяла дзве белыя булачкі, разлічылася, сышла. Я не стаў заводзіць размову. Яна не павіталася, ды і я не пачаў распытваць пра кепскія настроі. Хто ж ведаў, што мы бачымся апошні раз? Пасля смерці сваёй маці Святлана жыла адна. Таму пра яе скон даведаліся не адразу. Як большасць з нас, я прачытаў пра заўчасную смерць Святланы Явар у інтэрнэце... Мне згадаўся даўні нумар часопіса «Крыніца», дзе Света напісала такія словы: «...калі б Бог даў мне сына, я выхавала б яго, напэўна, падобным да А. Глобуса. Шчаслівая маці, якой ніколі не будзе сорамна за сваё дзіця, бо яно не здолее нарабіць глупстваў, заўсёды будзе мець і на хлеб, і да хлеба...» Тады мне было сорамна за такую адзнаку, бо і глупствы я раблю, і праблем людзям магу настварыць. Дый цяпер мне крыху нікавата ад таго, што нехта залічвае мяне ў свае героі і можа паўтарыць за Святланаю: «Чаму жанчыны любяць такіх, як Адам Глобус? Таму, што «такія» ўпэўнены ў сабе, за імі як за каменнай сцяной. З імі заўсёды цікава. І дзяцей яны любяць. Карацей, атрымаўся гэтакі Джэймс Бонд, агент 007, ідэал мужчыны...» Але любоў і павага заўсёды маюць зваротныя сувязі. Калі цябе паважаюць і любяць, дык і ты спрабуеш адказваць цёплымі словамі і добразычлівымі жэстамі. Я ўдзячны Святлане за павагу да сябе — і раней, і цяпер.

МАЦІ І ЧАСНОК

Дачка мая — Ядзя, як і большасць беларускіх жанчын у цяперашні час, назапасіла круп, макароны і мукі. Хай будзе. Хто супраць? Учора, маці мая сказала, што ў тыя часы, калі муку прадавалі толькі па картках і ўсе яе выкуплялі, у той муцэ заводзілася розная трасца. Каб матылькі ды чарвякі не завяліся ў муцэ, макароне і крупах, трэба пакласці ў пакеты ці побач з пакетамі часнок. Перад тым, як класці, зубок варта крыху расціснуць, каб сок з яго пацёк, каб дух з яго пайшоў. Мама сказала, што самі крупы часночнага духу не набіраюцца, але на нейкі час ён абароніць запасы ад харчовай молі.

ХАДЫКА І ПРАПАГАНДЫСТЫ

У васьмідзясятых мінулага стагоддзя Мінск меў двух яркіх ідэолагаў-прапагандыстаў — ліберала Хадзеева з ягоным гействам і вечна незачыненымі дзвярыма ды кансерватара Бегуна з п'янствам у акадэмічным асяродку і дэкларатыўным антысіянізмам. Знайсці і паслухаць у тагачаснай Беларусі нешта больш экспрэсіўнае і маштабнае было складана. Пра колішняе супрацьстаянне маргінальных ідэолагаў мне днямі нагадаў інжынер, будаўнік Юра Козак. Дзякуючы адначасовай згадцы Бегуна і Хадзеева я раптам убачыў выразнае падабенства іх прозвішчаў. Адзін бяжыць, другі ідзе ды дзейнічае. Гэткае падабенства і прывяло мяне да прозвішча выкладчыка архітэктурнай кампазіцыі Хадыкі, чый светапогляд стаў для мяне, як і для шматлікіх іншых, асновай у творчасці.

ШЧАСНАЯ І НЯСПЕШНАСЦЬ

Раней я спяшаўся жыць. Цяпер не баюся спазніцца і не спяшаюся. Я не баюся, што застанецца нязробленым нешта важнае. Спяшацца перастаў пасля пяцідзесяці. Думаў, што ў большасці людзей так і бывае, але згадалася мастачка Нінэль Шчасная, з якой у пяцьдзясят адбылося супрацьлеглае. Яна пачала сустракацца з сябрамі толькі па серадах. Астатнія дні тыдня Нінэль працавала, бо лічыла, што мала паспела зрабіць, што трэба спяшацца жыць, спяшацца пісаць, спяшацца ствараць.

Адам ГЛОБУС.

Сузор'е беларусаў свету

Савінава (Міцук) Ніна Рыгораўна

[25.6.1955, в. Лукава Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл.]

Рэжысёр масавых свят, дзеяч беларускай дыяспары ў Эстоніі.

У 1972 г. Н. Савінава скончыла Лукаўскую сярэднюю школу і паступіла ў Гродзенскае культурна-асветнае вучылішча на аддзяленне народнага тэатра. Працягвала вучобу ў Мінску ў Інстытуце культуры па спецыяльнасці «Рэжысура масавых свят». З 1981 г. пастаянна пражывае ў Таліне. У 1989 г. стварыла беларускую суполку. У 1993 г. стала прэзідэнтам Беларускага культурнага цэнтра «Бацькаўшчына» ў Таліне, дзе працуе нядзельная школа, у якой вывучаюць беларускую мову, знаёмяцца з гісторыяй краіны, яе фальклорам, з творчымі здабыткамі беларускіх пісьменнікаў.

З 1997 г. Н. Савінава рыхтуе і вядзе гадзінную беларускамоўную праграму на Эстонскім радыё-4. Яна з'яўляецца рэжысёрам-пастаноўшчыкам традыцыйных свят «Спатканне» і «Беларускае надвор'е», якія карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Н. Савінава — член Асацыяцыі народаў Эстоніі, пад эгідай якой адбываюцца традыцыйныя фестывалі нацыянальных культур «Славянскі вянок», выступае рэжысёрам гэтых фестываляў. Ёю створаны фальклорны гурт «Алеся» і дзіцячы танцавальны калектыў «Крыжачок», якія паспяхова выступаюць. Грамадскую работу Н. Савінава спалучае з працай у АТ «Дарына»-Н, прэзідэнтам якога з'яўляецца. Яна таксама генеральны дырэктар Міжнароднага гандлёвага дома «Белрэсурсы—Эстонія», створанага ў 1998 г. пры яе непасрэдным удзеле.

Вядучыя рубрыкі Святлана КАРПУЧОК і Яраслаў МАЛЬДЗІС.

МОВАЙ ФАТАГРАФІІ І АЎТАРСКАЙ ПЕСНІ

Студэнтка юрыдычнага факультэта ГрДУ імя Янкі Купалы Дар'я Чаркес стала лаўрэатам міжнароднага фотапленэра ў Літве, а яшчэ адзін «купалавец», магістр фізіка-матэматычных навук, намеснік старшыні прафкама студэнтаў Пётр Гжымайла — песеннага фестывалю ў Крыме.

Захапленне фатаграфіяй у Дашы сямейнае: яе прадзед, доктар Канстанцін Бялецкі быў адным з першых фотааматараў у горадзе над Нёманам. І цяпер Дар'ю запрасілі ў Літву, а яе работы ўключылі ў міжнародны каталог фотаздымкаў «Малады чалавек у XXI стагоддзі».

А вось Пётр Гжымайла годна прадставіў нашу краіну ў крымскім пасёлку Берагавое на фестывалі творчай моладзі і студэнтаў з Украіны, Расіі і Беларусі — атрымаў дыплом першай ступені ў намінацыі «Аўтарская песня».

Барыс ПРАКОПЧЫК.

г. ВИТЕБСК 26.09.2011

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи объекта аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Административное помещение (административно-бытовой корпус), расположенное по адресу: Витебская область, Полоцкий район, Экимановский с/с, в 0,3 км к востоку от д. Ксты, пом. 1	Характеристика объекта недвижимости: изолированного помещения с инвентарным номером 250/D-33542 общей площадью 1915,4 кв.м, 1992 г. постройки, стены кирпичные, железобетонные панели, перекрытия – ж/б плиты, крыша рулонная совмещенная.	1 010 516 668	101 051 660

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ: Строительное республиканское унитарное предприятие «Строительно-монтажный трест № 22», контактные телефоны: (0214) 419778, 418030.

Аукцион состоится 26.09.2011 в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

1. Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка; кроме того, представляют: индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов;

юридическое лицо – доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов;

иностранное юридическое лицо, иностранная организация, не являющаяся юридическим лицом, созданная в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представитель иностранного инвестора – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представитель гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 23.09.2011 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 26.09.2011 с 14.00 до 15.00.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет **№ 3642903027026** в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

4. Аукцион проводится в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения торгов по продаже некоторых объектов республиканской собственности, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь от 30.03.2009 № 36. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

6. Участник, ставший победителем аукциона (претендент на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона, в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, не позднее семи рабочих дней со дня проведения аукциона подписать договор купли-продажи объекта.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

Віктар СУПРУНЧУК **Апавяданне**

СЯРЭБРАНЫ ЗВОН І ТОНКІ ПІСК КАМАРА

ВЫЕ вечер, скуголіць, як не кормленая даўно свіння. Колькі можна жраць? Марфа аддала ёй астатні камбікорм, насыпала зелля, наліла вады. Усё роўна раве, як вецер. Раве, стогне, топча нагамі землю. Якая скаціна ненажэрная, гадкая, і супынку ёй няма! Але як без яе?..

За хлявом паростае зялёнай травой поле, гнілое, паскуднае і зусім малое, не такое, як яна хацела. Каб конь вольна хадзіў з плугам, не чапляўся за кусты, каб усе зайздросцілі, што ў яе бульба лепшая за ўсіх, куры нясуць шмат яек, а агуркі вырастаюць у далонь даруслага мужчыны. Хай яны зайздросцяць, не спяць начамі, і каб усе куры і гусі паздыхалі ў іх. Вось калі яна адчуе радасць і спакой, сіла падыме на ногі і дасць моц рукам. Толькі каб суседзі ўзняліся на дыбачкі, вывярнулі шыі, агледзелі ўсё наваколле і зразумелі, што яны — ніхто, пустэча, нікчэмнасць!

Яна адчувае, як жывы агонь з грудзей рвецца на прастору, душыць, не знаходзячы выхаду, каб знішчыць таго, каго яна сёння, учора і заўтра ненавідзела і будзе ненавідзець.

Перад вачыма ці то дзень, ці то ноч... А магчыма, расплылася падлога, як кіслае малако. І цячэ, цячэ... На даўжыню выцягнутай рукі гарыць сваімі плячамі, адзежай, цягне яе не да неба, а некуды далёка па чорнай дарозе, якая зарасла ядлоўцам, вярбой і маладым, вельмі зялёным аерам.

Вакол трава, трава, усюды трава...

Марфа спынілася ля хлява, абаперлася грудзьмі на плот, доўга глядзела перад сабой, нічога не бачачы. Потым туман, які засцілаў вочы, паціху паплыў, сышоў. Бульба ў полі падрасла ўжо, выпасталася, і цыбакі былі таўставатыя, сакавітыя. Паміж лісця там-сям зажажуцелі кветкі. Яны былі яшчэ слабыя, рахітычныя, але нават па іх было відаць, што ўрод можна чакаць неблагі.

Загудзела пчала, пераляцела з аднаго бульбоўніка на другі, потым села на канюшыну, што кусцілася ля хлява. Плот нібыта калыхнуўся, і Марфа адхінулася ад яго, ухапілася за слуп. У галаве быў шум, і ціўкалі птушкі ў вушах. Яна яшчэ пэцкаць спадніцу ва сырую зямлю. Ніводзін чалавек ва ўсёй вёсцы не бачыў, каб яна хадзіла ў брудным. Такога не было і не будзе.

— Марфа, Марфа...

ЯКІ гэта чорт яе кліча? Каму спатрэбілася старая недалэнга Марфа? Марфа, Марфа... Нямашака ў яе ні з кім ніякіх спраў. Ад злосці, якая імгненна апанавала яе, Марфа адчула, як памацнелі ногі і знікла слабасць, што душыла хвіліну назад. Выпрастаўшыся, яна зірнула праз шырокі прагал, які ляжаў перад ёй у садзе, на вуліцу. І хацела гэтага albo не, але вока зачапілася за макаўку царквы, што залацілася на сонцы. Яна яркa зіхацела сярод дрэў. Нешта было ў ёй зараз незвычайнае, вельмі прыгожае, але і страшнае. Прыцягальнае, прымушала глядзець і глядзець. Такога незразумелага пачуцця ў Марфы ніколі не было, хоць пражыла побач з царквой усё жыццё і кожны дзень бачыла яе гэтак жа, як і вароты ў двары ці студню, з якой брала ваду.

Яна прысела на салому пад яблыняй. Вецер калыхаў голле, якое то засцілала святло, то адкрывала акно ў гушчары. І размытыя цені беглі перад вачыма, потым спыняліся.

Сонечны прамень праскочыў па лісці, якое заззяла, нібы люстэрка, і трапіў на Марфу. Яна, баронячыся ад гэтага гуллівага зайчыка, зажмурылася, прытуліла руку да твару. Скрозь растапыраныя пальцы ёй падалося, што нехта ідзе да яе ад царквы. Рухаецца проста ад блішчастай макаўкі. Нібыта нясе яго гэты сонечны прамень, які асляпіў навісць, незвычайную злосць, якая часам абуджалася ў душы, гарэла агнём, не змаглі патушыць ні час, ні хваробы, ні разуменне таго, што яна набліжаецца да свайго апошняга прытулку. Тое, такое далёкае для іншых, было для яе нібы ўчарашнім. Не мінулым, не замшэлым, а сённяшнім. Бы рука ці нага, якія пакуль яшчэ варушыліся. І аб тым, што зрабіла, ніколі не пашкадавала. З часам яе ўпэўненасць у сваёй праваце рабілася быццам жалезнай і, здавалася, магла зніхнуць толькі разам з гаспадыняй.

Марфа бачыла, што суседзі, аднавяскоўцы спачатку быццам грэбавалі ёю, стараліся як менш размаўляць, а потым толькі зрэдзь нехта ў сварцы albo за плячыма ўспамінаў яе грэх. Так, гэта быў вялікі грэх, але яна пакаялася. Дый наогул лічыць сябе невінаватай... Раней не лічыла, а цяпер тым больш. Праўда на яе баку...

І хоць яна сабе ні разу не прызналася, але ўсё-ткі ёй было непрыемна ўспамінаць, варушыць. А не магла стрымацца. Яна нібы атрымлівала задавальненне, калі, прымружыўшы вочы, выклікала ў памяці тое, што ўжо мала хто ў вёсцы помніў.

Яны перад вайной ажаніліся з Алесем. Ён быў з беднай сям'і: здыхляк-каняка, адна карова, зямлі зусім мала. Ледзь дацягвалі ад бульбы да бульбы. Едакоў поўная хата. І маці сухотніца.

Алесь прыгожы быў, высокі, чарнявы. Аднойчы пачула, як спявае, — і ўсё... Бацька казаў: «Дурніца, у яго нагавіцы ззяду, бы сетка ў кломлі. Трэба табе гэны лахудра! Ды з нашым багаццем я табе мужа з хутарою прывяду, у якога лесу дваццаць валок і лесапілка свая...»

Пайшла за Алеся. Хадзіў па двары, спяваў. Зорачкай яе называў. І дзеці пайшлі: адно, другое, трэцяе... Жора, Малання, Геша... Не: Жора, Геша, Малання...

Яна таўчэцца па гаспадарцы, з дзецьмі свету белага не бачыць. А ён па прыцемку ўжо не спявае, цыгарку ў зубы і, маўляў, да хлопцаў у карты. Ім немцы — не немцы: у карты ўсё гуляюць. Вайна ж на двары, карову заўтра весці да быка. Вось-вось свіння апаросіцца. А ён — карты... Апошнім часам і вячэраць перастаў: у хлопцаў, маўляў, перакушу.

Ён думаў: яна дурнейшая за яго. Дурная баба! Бабе дарога — ад печы да парога. Галоўнае, што атрымаў добры пасаг. А колькі бацька даў яму злотых? Не аднаго каня можна было набыць. Дзе тыя злотыя? Маўчыць. Разумнік. Ды ў яе мазгоў было больш, чым у яго валасоў на галаве!

...Хутка ісці жаць жыта пад Падверб'е. Алесь кажа: «Мне трэба касу паглядзець у Кашаля». Паглядзі касу. Ён за парог, а яна — за ім. Ішла ціхенька, бы мыш, сагнуўшыся, хавалася за карчамі, падала грудзямі ў траву, толькі б не заўважыў. Цярпення ўжо не было. Толькі і чуваць: твой да Янкі бегае. І ўдзень, і ўначы. Усе бачаць, адна ты бы з бялымом на воку.

Лета было такое светлае і цёплае. Здаецца, няма ніякай вайны. Па вуліцы не хадзілі немцы. Усё ў агародзе буяла, квітнела. Стаяў пах набрынялай сокам вішні, якая вось-вось пацячэ. Паветра было густое і мяккае. «Такі, напэўна, бывае рай», — думала Марфа, бы шпіён, ідучы ўслед за мужам. А ён шпарыў так, быццам яго пчолы грызлі за лыткі.

Яна забылася пра ўсё на свеце. Калі б зараз спыніў немец з аўтаматам, не заўважыла б. Ішла за Алесем, быццам прыкутая да мужа, нават адчувала ягоны пах поту, табакі, якую ўчора сама рэзала і складвала ў капшук.

Ён увайшоў у двор, і адразу да яго кінуліся гэныя бахуры, малеча, нібыта іхні бацька. А потым выйшла Яна... Яна Пікульчына. І ён яе цалаваў, абдымаў так, як ніколі не цалаваў і не абдымаў Марфу. Яны пайшлі ў хату, а бахуры, белагаловыя дзяўчынкі, бегалі па двары і шчасліва крычалі: «Дзядзька Алесь, да мамкі не лезь!..» І бусел клекатаў над хатай, і певень, нібы здурнелы, ірваў горла, кукарэкуючы. А яна сядзела ля плота, расхінуўшы спадніцу, у крапіве, не адчуваючы, як смаліць ад сцёгнаў да пят, і плакала. Ад злосці і гневу ажно сціснула сэрца. Слёзы крыўды душылі яе, абмывалі твар і паціху супакойвалі. На месцы разгубленасці і адчаю раслі жаданне помсты і нянавісць.

Яшчэ некалькі хвілін яна слухала вясёлы, радасны смех з адчыненага акна, назірала за дзецьмі, якія гойсалі па двары, і, ужо не хаваючыся, у поўны рост пашыбавала прэч ад той хаты. Чым далей адыходзіла, тым мацнейшая рабілася яе роспач і хацелася вычварыць нешта такое, ад чаго б стала вельмі кепска і мужу, і яго красуні.

ЯНА мінула пастаўнік, перабралася па кладцы праз рэчку. Насустрач гналі статак кароў, і пастух нешта ёй сказаў. Марфа не заўважыла нават, хто гэта быў. Нібыта спераду гарэў ліхтар, і яна рухалася да яго, каб выбрацца з цемры. У галаве грымелі званы. Яна ішла, апантаная помстай і нянавісцю, і ўжо ведала, што ёй трэба. Крок за крокам набліжалася да сваёй мэты, і спыніць яе зараз не мог ніхто.

Насупраць царквы ў хаце Івана Казла быў пастарунак. Там, акрамя паліцаяў, былі і немцы. Гэта Марфа ведала. Пазаўчора бачыла, як на вазах яны выязджалі з двара. Паехалі з песнямі ў бок Гута-Міхаліна. На яе глядзелі немцы і чакалі. Спынілі размову.

Марфа няўпэўнена зрабіла крок да варот. Рашучасць выцякала з яе, як вада з дзіравага вядра. Яшчэ імгненне, і яна паверне назад. Ногі існавалі асобна ад яе, дрыжалі. Пот соллю ўжо грыз вочы. Страх ахапіў усю яе істоту. Але дастаткова было перакладчыку махнуць пальцам, як Марфа ўвайшла ў двор.

Яна стаяла перад гэтымі чужынцамі і няўцямна апавядала, як яе з дзецьмі пакрыўдзіў муж, здзекуецца з іх. Нешта казала і пра партызан. Але што, потым ніколі не магла ўспомніць.

Марфу слухалі і, здавалася, у вачах немцаў яна бачыла разуменне яе болю, няшчасця, пакут. І ад гэтага паступова знікаў страх, і вярнулася ўпэўненасць у сваёй праўдзе. Яна рабіла правільна. Хто абароніць дзяцей і яе ад гэтых зайздросных кабет, калі не яна сама? Нікому не дазволена лезці сваімі бруднымі нагамі ў яе жыццё! Нікому!.. Хай ведаюць і Алесь, і Яна!.. Вось калі б бізуноў ім усыпалі, яна была б найшчаслівейшы чалавек на свеце. Пасля Алесь прыпаўзе да яе на каленях і будзе прасіць прабачэння... Немцы парадак любяць, у іх усё павінна быць па законе.

Падышоў немец, паляпаў яе па шчацэ, потым лёгенька штурхнуў у плячо. Маўляў, ідзі. Перакладчык наўздагон гукнуў, што яна малайчына. Яны дапамогуць ёй.

Назаўтра было свята Пятра і Паўла. Нягледзячы на вайну, людзі ішлі ў госці адзін да аднаго, каб сумесна аддаць пашану Богу, пабыць побач з роднымі і блізкімі.

Дзень быў прыцішлы, ясны. Сонца літасціва глядзела на гэты куточак зямлі ў буйной зеляніне дрэў, травы. Было лета — для некага першае, для некага апошняе. І ніхто не ведаў, нягледзячы на ўзрост, што яго чакае ў наступную хвіліну. Ніхто не быў гаспадаром свайго жыцця.

...Недзе далёка за лесам грукатаў гром. Здаецца, мільганула ў небе бліскавіца. Рабілася душна. У паветры пахла балотам, свежаскошанай травой. Быццам за хатай пачынаўся сенакос. Замяўкала кошка. Выцягнулася дугой, пашкрабала кіпцюрамі дошку на ганку. Потым падышла да Марфы, якая мыла буракі ў начоўках, пачухрыла галаву аб яе нагу. Чмыхнула, неяк вельмі ўважліва паглядзела сваімі зялёнымі ў крапінках вачыма на гаспадыню і пачухала да хлява.

Алесь паснедаў і, гукнуўшы ёй з двара, што пойдзе на гадзінку да брата, які жыў на Алендрах, ужо знік. Бы на вяселле, надзеў новую святочную кашулю, сінія дыяганалевыя штаны, абуў хромавыя боты. За чые грошы купляліся ўсе гэтыя рэчы?! Каб ён швэндаў у іх да сваёй каханкі? У трыццаць дзявятым, перад прыходам бальшавікоў, за бацькавыя грошы яны з Алесем куплялі іх у старога Янкеля. Каб зцёк выглядаў, як найлепшы шляхцюк! Сабака...

Да брата ён пабег... І след прастыў... Толькі пах ад тытунёвага дыму яшчэ вісеў у хаце.

Яна перад гэтым не спала амаль усю ноч. Слухала, як побач, з усмешкай на твары, спакойна храпіць Алесь. Мабыць, бачыць у сне сваю красуню. Не яе, Марфу, не сваіх родных дзяцей, а паскудніцу Яну Пікульчыну. Ад гэтых думак пачынала калаціць, бы ў ліхаманцы. Здаецца, задушыла б зараз сваімі рукамі.

Пад раніцу выйшла ў двор, паслухала, як прачынаюцца па вёсцы пеўні. Ля пастарунка загудзела машына. Потым нібы заляскатаў матацыклет. Лісце на дрэвах было абмытае дажджом, што шумеў амаль усю ноч. Дыхалася лёгка, Марфа адчувала сябе зусім дзяўчынкай, якая чакае сустрэчы з каханым. Хацелася басанож прабегчыся па траве, скокнуць у Ясельду і папляць па рацэ між высокага трыснягу, някошанай сенажаці, якая абапал хвалямі калыхалася, нешта шаптала, шаптала. У дзявоцтве яна так і рабіла, пасля адчуваючы сябе незвычайна прыгожай і дужай. Так было, калі яна бегла, прыўзняўшы ад зямлі спадніцу, да Алеся. Ног не чула пад сабой, сэрца ляцела птушкай туды, дзе ён чакаў. Вочы нікога і нічога не бачылі, акрамя яго. «Дзе ўсё падзелася?!»— хацелася закрычаць на ўсю вёску Марфе, каб нават птушкі ўзняліся з усіх дрэў. І каб, нарэшце, пачуў стогн яе сэрца сам Алесь. Але ён стаў глухі і сляпы. Нічога, вернецца і слых, і зрок...

На вуліцы пачуўся тупат, нехта бег, малоцячы палкаю па плоце. Праскочыў міма хаты нейчы малы падшываненц, на хаду крыкнуў:

— Цётку, Яну Пікульчыну з дзецьмі немцы забіраюць!..

І пабег, толькі ляскат услед. І зноў сціхла. У двор зайшла суседка. Мусіць, гатавала абед: у руках нож і недалупленая бульбіна. Твар перапалоханы, на вачах слёзы. Яна Пікульчына была нейкая іх далёкая сваячка.

— Марфа, ты чула?.. — гаворыць, і галава ажно трасецца. — Божа ж, мой, Божа! У яе ж дзеці зусім яшчэ малыя... Калі ўжо гэта скончыцца?.. Бяда...

— Бяда... — сказала Марфа і, уздыхнуўшы, падхапіла вядро з ежай для парсюка, панесла ў хлеў. Выліла ў карыта і парадавалася апетыту, з якім парсюк прагна глытаў свой абед. Да Каляд ладнае будзе свінчо, каб толькі не захварэў. І між іншым падумала: «Бач, як спраўна ўзяліся за яе... Не бяры тое, што не тваё...»

Марфа падышла да варот, выглянула на вуліцу. Ніводнай душы. Толькі на паваротцы ад царквы шмыгнула з двара ў двор нейкая кабета. Ля пастарунка было ціха. Не раўлі машыны, не чуваць і матацыклетаў.

Дзеці гулялі пад яблыняй. Не праспіліся на вуліцу. Старэйшы Жора нешта майстраваў, а Малання з Гешам яму дапамагалі. У печы выпалена, буракі для каровы на вечар памыла. Парсюка пакарміла. Усё зрабіла...

Не асэнсаваўшы яшчэ, што робіць, Марфа скінула брудную рабочую спадніцу, апранула чысцейшую, даматканую, пафарбаваную ў чорны колер. Нацягнула цёмную сацінавую кофту. І, як была басанож, гукнуўшы дзецям, каб не пакідалі двара, агародамі шыбанула ў бок Алендраў.

Чаму яна сарвалася з хаты і пабегла да Пікульчыхі паглядзець, як немцы забіраюць яе з дзецьмі, Марфа ні тады, ні пасля не магла самой сабе растлумачыць. Ці то была проста жаночая цікаўнасць, ці то жаданне парадавацца з няшчасця саперніцы?

Калі яна дабралася да Алендраў, ад Пікульчынай хаты ад'язджала тры вазы. У яе быў добры зрок, дый падышла ўжо блізка. На першым возе сядзелі Яна з дзецьмі, яе старэйшы брат з хутароў, Алесь і два паліцаі. На другім — немцы, сярод якіх перакладчык, яшчэ адзін брат з жонкай і дваімі дзецьмі. На трэцім — паліцаі, жонка старэйшага брата з траімі дзецьмі. Марфа адразу ўспомніла: у гэты дзень гадавіна па Пікулу, бацьку Яны. Пэўна, і сабраліся з гэтай нагоды...

Вазы ехалі, а Марфа, трымаючыся на адлегласці, разам з дзясяткам вяскоўцаў, якіх прымусілі, цягнулася ззаду. Калі мінулі могілкі, зразумела, куды вядзе гэтая дарога і дзе спыніцца яна. Ёй стала страшна, пацямнела ў вачах. Узнікла жаданне падбегчы да перакладчыка, да немцаў, каб адпусцілі мужа, папрасіць, стаць перад імі на калені. І яна ўжо была гатова гэта зрабіць, але побач з ім на возе сядзела Яна, ехала, схіліўшы галаву яму на грудзі. І, прыткнуўшыся да яго, сядзелі Пікулінчыхі дзеці. Нібы да роднага бацькі. І зноў паплыла па ўсім целе тая нянавісць, якая жыла ў ёй, ажно булькала, быццам вада ў балоце.

Ля невысокага сасонніка, што пасадзіў перад трыццаць дзявятым годам бацька Яны, стары Пікула, на лысым пясчаным бугры была выкапана яма. У баку ад яе пад наглядам паліцаяў з панылым выглядам, апусціўшы галовы, стаяла некалькі мужыкоў з рыдлёўкамі.

Навокал буяла лета. Там-сям пераклаліся рамонак, васілёк. На траве скакалі конікі, збіралі свой ураджай пчолы. Між дрэў шмыгануў дзікі голуб. Кружылі буслы, рыхтуючы дзетак да свайго далёкага падарожжа. Рукой падаць — хаты, хлявы. Відаць макаўка царквы, яка блішчыць у зеляні дрэў. «Дзынь-дзынь...» — як бы пачуўся звон і адразу сціх. Потым зноў: «Дзынь-дзынь...» Хто пачуў, не пачуў. Толькі гэты звон, востры гук, насычаны нечым страшным, самотным, які плыў у паветры, расскакуючыся яго, рухаючыся ўсё далей і далей, зачапіў сваім вастрыём Марфу і нібы абпаліў. Назаўсёды застаўся ўнутры яе, зрэдзь абуджаючыся і вяртаючы да гэтага бугра ля Пікулінага сасонніка.

Яна не пайшла з усімі, адышла ўбок, схаваўшыся за старым ядлоўцавым кустом. Ёй усё было відаць як на далоні. Яна сачыла за кожным рухам Алеся і Яны. Так амаль у абдымках яны і даехалі да ямы.

У Марфы калацілася сэрца. Не за

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

З праблемных падлеткаў — у «алімпійцы»

Наваполацкі гарадскі камітэт Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі арганізаваў лагер працы і адпачынку «Алімпіец», у якім перавыхоўваюцца так званыя праблемныя падлеткі.

Дваццаць школьнікаў ва ўзросце ад 14 да 17 гадоў прыбіраюць і добраўпарадкоўваюць лесапаркавую тэрыторыю горада, у тым ліку і берагі Заходняй Дзвіны. Выхаваўчую работу з імі праводзяць супрацоўнікі інспекцыі па справах непаўналетніх. Дарэчы, міліцыянеры не абмяжоўваюцца проста «лекцыямі», але і вывучаюць падчас гутарак прычыны праблемных паводзін, цікавяцца, чым могуць дапамагчы ў арганізацыі занятасці і вольнага часу. А яшчэ падлеткі і міліцыянеры «мераюцца сілай» у спартыўных спаборніцтвах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Студэнты Акадэміі мастацтваў распісалі сцены пад'ездаў у дамах па вуліцах Каліноўскага і Цікоцкага

Студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, якія працуюць у будатрадзе, у рамках праекта «Утульны дом» распісалі сцены пад'ездаў сталічных дамоў.

Як перадае карэспандэнт агенцтва «Мінск—Навіны», цяпер на першых паверхах дамоў №№ 73/1, 77, 83 па вуліцы Каліноўскага і № 2 па вуліцы Цікоцкага прапісаліся жыхары марскога дна і расцвілі райскія сады. Прычым карціны на лесвічных пралётах, выкананыя ў розных стылях і кірунках, не пацьмянеюць мінімум гадоў дзесяць — пад'ёзды распісаны акрылавымі фарбамі. Работы студэнтаў змаглі ацаніць і маленькія пацыенты 19-й гарадской дзіцячай паліклінікі. Цяпер каля кабінета прышчэпак увагу дзятвы прыцягваюць яркія персанажы з любімых мультфільмаў.

Лена КАСЬЯН, *«Мінск—Навіны».*

У апошнія гады намецілася тэндэнцыя росту колькасці жанчын з алкагольнай залежнасцю

Трывожны факт: у апошнія гады павялічылася колькасць мінчанак, якія пакутуюць ад алкагольнай залежнасці. Пра гэта паведаміў галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансэра Сяргей Малочка.

Суадносіны залежных мужчын і жанчын 4:1, хоць яшчэ на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя гэтыя суадносіны былі 20:1.

Усяго на ўліку ў сталічных дыспансэрах знаходзіцца каля 40 тыс. мінчан, якія пакутуюць ад розных відаў залежнасці. Больш за 6 тыс. з іх — нарказалежныя. Аднак гэта толькі афіцыйна зарэгістраваныя пацыенты. Рэальная колькасць залежных ад наркатычных рэчываў мінчан можа даходзіць да 45 тыс.

Марына КАСЦЮКЕВІЧ, *«Мінск—Навіны».*

Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 33 (695)
адрэса рэкламы
287 17 79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Катэдж (незавершаны, гатоўнасць 76%), маскоўскі напрамак, пас. Калодзішчы, 14 сотак, вада, газ, ёсць ТУ.

Тэл.: 8 017 208 26 13, 8 029 642 53 22.

❒ А/м «Форд-Эскорт», 1994 г.в., хэтчбэк, новая гума, аб'ём 1,4, бензін 5,5/100, добры стан, 2200 у.а.

Тэл. МТС 764 42 91.

❒ А/м «Фальксваген-Джэта», 1985 г.в., добры стан, 1100 у.а.

Тэл. 8 029 322 90 06.

❒ Пчолы з вуллямі. Магілёўская вобл., Глускі р-н, в. Балашэвічы. Дзядзюля Уладзімір.

Тэл. 8 02230 4 85 91.

❒ Рухавік ад «Пежо-406», 2002 г.в., бензін 2,2. У Гродне.

Тэл. 8 029 585 37 00.

❒ В'етнамскія траваедныя парасяты, паросныя свінкі.

Тэл. 8 029 589 54 18.

❒ Антэна спадарожнікавая (б/к), камплект, дошка неабразная (сухая) 40 мм у г. Стоўбцы.

Тэл. 8 029 271 88 04.

КУПЛЮ

❒ Прычэп да мотаблока. Мінская вобл., Клецкі р-н.

Тэл. 8 033 635 44 88.

ЗВЯЗДА — КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

«ПУЗ-ПАРАД»:

цяжарнасць у радасць!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Для цяжарных удзельніц свята былі арганізаваны цікавыя конкурсы і гульні — напрыклад, «Пуз-арт» (уся сям'я павінна была за пяць хвілін намаляваць на жывоціку ў будучай мамы што-небудзь цікавае). Афіцыйны колер свята быў аб'яўлены жоўтым — як знак сонейка і цяпла. Менавіта таму будучыя мамы былі апрануты ў жоўтыя рэчы, а напрыканцы свята запусцілі ў неба жоўтыя паветраныя шары з пасланнямі сваім дзецям. Таксама ўсе сем'і заклалі кляновую «Алею будучыні», дзе на кожным дрэўцы будзе вісець стужка блакітнага ці ружовага колеру.

Арганізатары свята — а гэта святочны інфармацыйны цэнтр Prazdnik.by і аддзел па справах моладзі Мінгарвыканкама — завяраюць, што «Пуз-парад» — гэта толькі пачатак! Ужо праз год маладыя мамы са сваімі дзеткамі змогуць прыняць удзел у святе «Пупс-парад 2012».

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

ДАТЧАНЕ — САМЫЯ ШЧАСЛІВЫЯ Ў ЕЎРОПЕ

Маштабнае і доўгатэрміновае даследаванне нямецкага Фонду пытанняў будучыні назвала самыя шчаслівыя краіны Еўропы. Як паказала апытанне, самы пазітыўны жыццёвы настрой прадэманстравалі датчане — 96% з іх шчаслівыя, піша выданне Der Standard.

Услед за датчанамі ідуць грэкі — там шчаслівымі назвалі сябе 80%. За імі ідуць італьянцы (79%), французы (77%), галандцы і брытанцы (72%). Аўстрыя (63%) трохі адхіляецца ад сярэдняга еўрапейскага паказчыка ў 68%. У Турцыі і Германіі трохі больш за палову насельніцтва (61%) адносіць сябе да шчасліўчыкаў. На самым апошнім месцы знаходзіцца Расія, дзе толькі 37% задаволеныя жыццёвай сітуацыяй. «Супадзенні былі заўважаны амаль ва ўсіх краінах. Так, жанчыны, сельскія жыхары, пары і людзі з добрым дастаткам у цэлым шчаслівейшыя за мужчын, жыхароў гарадоў, халасцякоў і малазабяспечаных. Усяго ў апытанні, якое праводзілася больш за 14 гадоў, прынялі ўдзел 15 тысяч чалавек з 13 краін», — гаворыцца ў артыкуле. Даследаванне таксама паказала, што грошы відавочна робяць людзей шчаслівейшымі: 76% людзей з дастаткам больш за 3600 еўра ў месяц задаволены сваім жыццём, супраць 45,1% людзей, якія атрымліваюць не больш за 900 еўра. Маладыя — самыя жыццярадасныя (73%), шчаслівых пенсіянераў — 63%, сем'і з дзецьмі набралі 60,9%, бяздзетныя пары і халасцякі замыкаюць спіс з 58,6%.

І НА АТОЛЕ РАБУЮЦЬ!

На атоле Айтутакі, які ўваходзіць у склад астравоў Кука, упершыню абрабавалі банк. Інцыдэнт адбыўся каля тыдня таму, аднак СМІ распаўсюдзілі паведамленні пра падзею толькі цяпер. Пры гэтым, як адзначае New Zealand Herald, паліцыі пакуль не ўдалося натрапіць на след злачынцаў.

Як распавялі ў астраўных праваахоўных органах, з сейфа банка Bank of the Cook Islands знікла каля 200 тысяч новазеландскіх долараў (астравы Кука з'яўляюцца дзяржаўным злучэннем у вольнай асацыяцыі з Новай Зеландыі, таму ў якасці валюты выкарыстоўваюць новазеландскі долар) — гэта значыць прыкладна 166 тысяч долараў ЗША. Да расследавання справы пра рабаванне падключылі ўсе магчымыя сілы — над пошукам злачынцаў працуе нават дэтэктыў, якога выклікалі з пенсіі. Але, па словах прадстаўнікоў паліцыі, у распараджэнні праваахоўных органаў няма ніякіх доказаў, і пакуль расследаванне рухаецца вельмі павольна.

Жыхароў атола Айтутакі папрасілі паведамляць пра ўсіх падазроных асоб — напрыклад, пра людзей, якія робяць некалькі дарагіх пакупак запар. Прадстаўніца банка выказала ўпэўненасць у тым, што паліцыя зможа затрымаць зламыснікаў. Пры гэтым яна таксама падкрэсліла, што чуткі пра тое, што грошы захоўваліся ўсяго толькі пад звычайным замком, якія з'явіліся ў мясцовай прэсе, не адпавядаюць рэчаіснасці. Аснову эканомікі атола складае турыстычная галіна, на ім працуюць тры банкаўскія аддзяленні. Плошча Айтутакі складае прыкладна 18 квадратных кіламетраў, на тэрыторыі каралавага востраваа жывуць прыкладна 2200 чалавек.

РЭДКАЯ СВІННЯ ДАПЛЫВЕ ДА ШАТЛАНДЫІ

Гэты забаўны інцыдэнт адбыўся ў Шатландыі: свінні, перавезеныя гаспадаром на маленькі востраў Лонга, вярнуліся на мацярык сваім ходам, дзеля чаго ім давялося пераадолець паўтара кіламетра па моры!

Фермер Джэймс Кэмеран, якому належаць свінні па мянушках Мэры і Трафл, адвёз жывёлін на востраў — папасвіцца некалькі дзён без нагляду, затое з мноствам свежай травы і чыстай вады. Але ўжо праз дзень Кэмерану патэлефанаваў знаёмы, які ўбачыў у моры дзвюх свінак — яны плылі ў кірунку шатландскага ўзбярэжжа. Выхад двух адважных жывёлін на бераг выклікаў сярод мясцовага насельніцтва сапраўдны ажыятаж; а Мэры і Трафл, хоць і дрыжалі і выглядалі спалоханымі, аднак здавалася, цвёрда ведалі, куды ім трэба ісці, і ніводнага разу не збіліся з кірунку.



Спачатку фермер не паверыў, вырашыўшы, што яго разыгрываюць. Паводле яго слоў, на мацерыку ён меў вялікую гаспадарку і шмат свойскай жывёлы, у тым ліку шэсць свіней. «Раней я адвозіў на востраў Лонга авечак, і яны ўспрымалі гэта абсалютна спакойна, — паведаміў фермер. Аднак Мэры і Трафл, відаць, умовы жыцця на востраве прыйшліся не даспадобы, і гаспадар вырашыў не паўтараць эксперымент. — Я не буду зноў адпраўляць свіней на востраў — яны недвухсэнсоўна далі мне зразумець, што не ў захапленні ад такога жыцця, таму я вырашыў пакінуць іх на мацерыку».

101 ДАЛМАЦІНЕЦ? НЕ, 700 КОТАК!

Пені і Стывен Ляфковіч з горада Фларыда (ЗША) абвінавацілі ў 47-мі выпадках жорсткага абыходжання з жывёламі.

Мужы Ляфковіч называлі свой дом «Каціным храмам-прытулкам», і па колькасці жывёл, якія там пражывалі, ён быў самым вялікім на ўсёй тэрыторыі ЗША. Старыя трымалі ў сваёй хаце амаль 700 катоў, хоць рэальныя ўмовы не дазвалялі ім гэтага. Як высветлілася, больш за сто котак з ліку гадаванцаў былі невылечна хворыя, і іх прыйшлося ўсыпіць. Пакінутых жывёл у пенсіянераў адабралі, вылечылі і стэрылізавалі. Зараз іх лёсам займаюцца студэнты ветэрынарнага факультэта Універсітэта Фларыды. Яны паклапоцяцца пра жывёл і падбяруць кожнай котцы новага гаспадара, які здолее глядзець за гадаванцам і створыць яму ўсе неабходныя ўмовы для камфортнага і здаровага жыцця. Ляфковічаў чакае суд. На баку сужэнцаў выступіць галоўны пракурор штата. На меркаванні пракурора, трымаць у сваім доме амаль 700 жывёл і клапаціцца аб усіх іх маглі толькі добрыя і гуманныя людзі.

ТРУНА ПА ПЯТНІЦАХ

61-гадовы Зеліа Ферэйра Росі кожную пятніцу начуе ў труне ў памяць пра сябра.



Шмат гадоў таму мужчыны паабяцалі адзін аднаму, што купяць труну таму, хто памрэ першым. Сябар Росі купіў яму труну яшчэ ў 1983 годзе, калі падумаў, што той загінуў у аўтакатастрофе. Пасля таго як яго сябар памёр, Росі таксама стрымаў сваё абяцанне і купіў яму труну. Але потым пайшоў яшчэ далей у сваім клопаце пра нябожчыка і вырашыў ушанаваць яго памяць такім незвычайным спосабам.

Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

ШКОЛЬНІЦА ЗАМЕСТ ПАЛІЦЫІ

Дванаццацігадовая жыхарка амерыканскага горада Фітцджэральд раскрыла рабаванне, з якім не справілася мясцовая паліцыя.

Джэсіка Мэйпл, амаль знакамітая Марпл, самастойна высачыла злачынца, які сёлета ў ліпені абрабаваў дом яе прабабулі. Школьніца падчас інцыдэнту знаходзілася на адпачынку ў Атланце, а злачынствам занялася пасля таго, як вярнулася. Пасля агляду месца злачынства паліцэйскія заявілі, што рабаўнік пракраўся ў дом, адчыніўшы ключом уваходныя дзверы, паколькі слядоў узлому пры аглядзе выяўлена не было. Тым часам Джэсіка, якая ведала, што ключы ад дома ёсць толькі ў яе бацькоў, звярнула ўвагу на сляды ўзлому ў гаражы. У бліжэйшым ламбардзе дзяўчынка знайшла ўсе выкрадзеныя рэчы, а ўладальнік ламбарда назваў аднаго са злачынцаў сваім пастаянным кліентам і нават даў копію яго пасведчання асобы. Пра гэта Джэсіка таксама паведаміла ў паліцыю. Нягледзячы на сабраныя ёй доказы, пра затрыманні па справе пра рабаванне дагэтуль не паведамлялася.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.01	20.22	14.21
Віцебск —	5.47	20.15	14.28
Магілёў —	5.51	20.12	14.21
Гомель —	5.52	20.05	14.13
Гродна —	6.16	20.37	14.21
Брэст —	6.21	20.33	14.12

Месяц

Апошняя квадра 22 жніўня. Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Імяніны

Пр. *Вячаслава, Лаўрэнція, Рамана.*

К. *Валерыі, Ружы, Апалінара, Валяр'яна, Віктара, Філіпа.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

23 жніўня

1939 год — Вячаслаў Молатаў і Іахім фон Рыбентроп падпісалі Дагавор аб ненападзе паміж Германіяй і Савецкім Саюзам. Дакумент, падпісаны кіраўнікамі германскага і савецкага ведамстваў па замежных справах, стаў вялікай нечаканасцю для іншых краін, паколькі заключэнню дамовы папярэднічаў перыяд астуджэння савецка-германскіх адносін. Яшчэ большы неспакой у свеце выклікалі чуткі аб тым, што «Пактам Молатава-Рыбентропа» справа не абмежавалася і што маюцца яшчэ нейкія сакрэтныя дамоўленасці, якія датычацца шэрагу еўрапейскіх краін. Рыбентроп, які прылятаў для заключэння дагавора ў Маскву, пазней сцвярджаў, што на падпісанні сакрэтных пагадненняў, паводле якіх да сферы інтарэсаў СССР былі аднесены Латвія, Эстонія, Фінляндыя і частка Польшчы, настойваў Іосіф Сталін.

1880 год — нарадзіўся Аляксандр Грын (Грыневіцкі), вядомы рускі пісьменнік. Сын выхадца з Беларусі, сасланага ў Сібір за ўдзел у паўстанні 1863-64 гадоў. А. Грын шмат падарожнічаў па Расіі, быў у высылцы. Першае апавяданне «Заслуга радавога Панцялеева» было канфіскавана і знішчана. Напісаў больш за 350 апавяданняў, аповесцяў, вершаў, паэм, сатырычных мініяцюр. У творах пісьменнік стварыў свой непаўторны свет, абвеяны рамантыкай прыгод. Да найбольш папулярных належаць раманы «Дарога ў нікуды», «Зіхоткі свет», аповесць «Тая, што бяжыць па хвалях» і інш. У 1919 г. служыў у Чырвонай Арміі пад Віцебскам, дзе пачаў працу над аповесцю «Пунсовыя ветразі». Яго творчасць доўгі час замоўчвалася і была прызнана толькі ў 1960-я гадах. Памёр у 1932 годзе.

Цытата дня:

«Не наракайце на надвор'е: дзевяць з дзесяці чалавек не змаглі б пачаць ніводнай размовы, калі б надвор'е не мянялася».

Хабард Кін (1868-1930), амерыканскі пісьменнік-сатырык.

КОЛАС

Колас у культуры славян заўсёды быў сімвалам пладаноснасці, дабрабыту, багацця, шчасця. Згодна з паданнем, каласы раслі адным кустом ад самай зямлі, але жнейкі пачалі прасіць Бога, каб яны сталі даўжэйшымі, таму што іх нязручна жаць. Бог выканаў просьбу жанчын-жней. У іншым паданні распавядаецца, што Бог пакараў людзей за непавагу да хлеба: выцягнуў колас, зрабіў яго доўгім, але пустым — зерне пакінуў толькі напрыканцы сцябліны, і зусім няшмат, каб толькі людзі не памерлі з голаду. На Беларусі дзецям расказвалі, што першы колас Бог кінуў сабаку, які вельмі хацеў есці, але той прынёс яго свайму гаспадару — чалавеку, які пасадзіў гэтае зерне. Так у людзей з'явіўся хлеб.

- Пачатак каласавання збожжавых у календары ўсходніх славян заўсёды быў адзначаны святам — гэта адбывалася на Тройцу, на Русальным тыдні.
- Таптаць каласы лічылася недаравальным, смертным грахом.
- Каласы былі цэнтральным сімвалам жніва на зажынках і дажынках, менавіта таму асабліва ўшаноўваліся першыя і апошнія каласы на полі.
- Першыя каласы даручалі жаць самым шаноўным ці спецыяльна абраным для гэтага людзям: гаспадару, гаспадыні, жнейцы з лёгкай рукой, святару, старэйшаму ў сям'і. Часцей за ўсё з гэтых каласоў рабілі сноп, радзей — букет, які павінен быў выкупіць гаспадар поля і прынесці дадому. На працягу ўсяго года ён захоўваўся ў хаце.
- Першыя зжатыя каласы надзяляліся магічнай сілай: імі перавязвалі спіну ад болю ў паясніцы; спавівалі першанца; неслі да вясковага крыжа, каб дождж не перашкаджаў у час жніва і г.д.
- Салому ад першага снапа давалі хворай жывёле, таму што верылі ў яе магічную лекавую сілу.
- Першыя зжатыя снапы асвячалі на Ушэсце. З першых каласоў плялі вянкі, рабілі букеты, у якім было па тры каласы розных збожжавых раслін. Пасля асвячэння гэтыя букеты ці вянкі вешалі каля дзвярэй ад вуліцы ці ў сярэдзіне хаты.
- З апошніх каласоў на дажынках плялі «жніўны» вянок, завівалі «бараду», збіралі сноп па назвай «дзед», рабілі крыж і іншыя рытуальныя рэчы. Апошнімі каласамі ўпрыгожвалі косы і сярпы.
- Апошнія каласы (сем, дзевяць, дванаццаць, трыццаць, сорак) пакідалі на полі, бо лічылі, што менавіта ў іх знаходзіцца асабліва пладаносная сіла, якая адродзіць ніву на наступны год.
- Сноп з апошніх каласоў перавязвалі чырвонай стужкай (поясам-абярэгам) і неслі ў хату, ставілі ў чырвоным куце.
- У дзень Раства Багародзіцы (21 верасня) абраз Дзевы Марыі ў хаце ўпрыгожвалі каласамі, якія збіралі на полі апошнімі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся

Падыходзіць да рабочага загадчык склада і кажа:

— Ты ўжо тры месяцы ў нас пра-

цуеш і не можаш адрозніць першы гатунак вугалю ад другога!

— Але затое я цяпер ведаю, што тона важыць 700 кілаграмаў!

☺

Дзяўчаты, вучыцеся гатаваць! Усё роўна за каго вы выйдзеце замуж — ён будзе хацець есці!

☺

Інструктар-гарналыжнік кажа сваім падапечным:

— І запомніце, дрэва лепш за ўсё аб'язджаць з аднаго боку...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 4049. Нумар падпісаны ў 19.30 22 жніўня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12